МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
“БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА”

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ СЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ

А.А. Савіч

Вучэбна-метадычны комплекс

# па дысцыпліне **“Гісторыя ўсходніх славян (Расія і Украіна): VI – XIV стст.”**

для студэнтаў І курса гістарычнага факультэта

БРЭСТ – 2014

УДК ’94 (470 + 571) + (477)
ББК 63.3 (2) 2 – 91

Рэцэнзенты:

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**С.А. Траццяк**

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**І.Э. Яленская**

Кафедра грамадскіх і гістарычных навук Брэсцкага політэхнічнага ўніветсітэта

**Савіч, А.А.**
Гісторыя ўсходніх славян (Расія і Украіна): VI–XIV стст. / А.А. Савіч / Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў I курса гістарычнага факультэта. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2014. – 140 с.

Выданне змяшче тэарэтычную частку ў выглядзе лекцыйнага курса; дапаможную частку з паказальнікам асноўных гістарычных падзей, гістарычных дзеячаў, гістарычных паняццяў; практычную частку, якая прадстаўлена планамі семінарскіх заняткаў і спісам першакрыніц і літаратуры да іх падрыхтоўкі; кантроль ведаў, які змяшчае матэрыялы для самаправеркі ў выглядзе тэстаў і пытанняў да самакантролю (да экзамену, заліку). Матэрыял падаецца па трох модулях: 1. Усходнія славяне ў старажытнасці. 2. Кіеўская Русь. 3. Русь у перыяд феадальнай раздробленасці.

Вучэбна-метадычны комплекс прызначаны для студэнтаў I курса гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, якія вывучаюць курс «Гісторыя ўсходніх славян (Расія і Украіна)».

УДК ’94 (470 + 571) + (477)
ББК 63.3 (2) 2 – 91
С 12

# ЗМЕСТ

**Уводзіны** ............................................................................ **4**

**Змест вучэбнага матэрыялу** ........................................................ **6**

**Модуль 1. Усходнія славяне ў старажытнасці** ............................... **9**
Лекцыйны курс ........................................................................... **9**
Паказальнік асноўных гістарычных падзей..................................... **22**
Гістарычныя дзеячы...................................................................... **22**
Гістарычныя паняцці..................................................................... **24**
Тэсты............................................................................................ **34**

**Модуль 2. Кіеўская Русь** .............................................................. **38**
Лекцыйны курс ............................................................................ **38**
Паказальнік асноўных гістарычных падзей ..................................... **62**
Гістарычныя дзеячы ...................................................................... **63**
Гістарычныя паняцці ..................................................................... **69**
Тэсты ............................................................................................ **77**

**Модуль 3. Русь у перыяд феадальнай раздробленасці** ..................... **83**
Лекцыйны курс ............................................................................ **83**
Паказальнік асноўных гістарычных падзей ..................................... **102**
Гістарычныя дзеячы ...................................................................... **105**
Гістарычныя паняцці ..................................................................... **108**
Тэсты ............................................................................................ **111**

**Планы семінарскіх заняткаў**.......................................................... **120**

**Пытанні для самакантролю** (да экзамену, заліку)........................... **141**

**Спіс выданняў пісьмовых крыніц** ................................................. **118**

## Уводзіны

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам, дысцыпліна «Гісторыя ўсходніх славян (Расія і Украіна)» сінхронна вывучаецца з гісторыяй Беларусі, дапаможнымі гістарычнымі дысцыплінамі, краязнаўствам, этналогіяй і крыніцазнаўствам гісторыі Беларусі, а таксама з дысцыплінамі па ўсеагульнай гісторыі. Гэта дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, выявіць ролю і месца гісторыі ўсходнеславянскіх народаў у шырокім прасторавым і часавым дыяпазоне.

Прадмет вывучэння курса – гісторыя ўсходніх славян ад першапачатковага рассялення па тэрыторыі Усходняй Еўропы па XIV ст.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў фундаментальных ведаў па гісторыі Расіі і Украіны з VI ст. па XIV ст.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

– садзейнічаць разуменню студэнтамі прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей гістарычнага развіцця ўсходнеславянскіх народаў у кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

– стварыць вучэбна-метадычныя ўмовы для засваення студэнтамі асноўных этапаў гістарычнага развіцця ўсходніх славян;

– садзейнічаць выпрацоўцы ў студэнтаў навыкаў пошукавай працы з інфармацыяй першакрыніц, вучэбнай і манаграфічнай літаратурай, уменне аналізаваць падзеі і факты гісторыі і рабіць на гэтай падставе адпаведныя высновы і абагульненні.

Студэнт павінен:

*ведаць:*

– прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці гістарычнага развіцця;
– агульнае і адметнае ў развіцці ўсходнеславянскіх народаў;
– асноўныя этапы гістарычнага развіцця ўсходніх славян;
– гісторыю ўсходнеславянскіх народаў у кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

*умець:*

– высвятляць сутнаснае і асаблівае праз параўнанне і тыпалогію ў
– гісторыі ўсходніх славян;
– свабодна аперыраваць фактамі гістарычнай рэчаіснасці;
– паспяхова выкарыстоўваць атрыманыя веды ў працэсе выкладання гісторыі ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе.

Грунтоўнае вывучэнне Расіі і Украіны VI–XIV стст. дазволіць студэнтам сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб асноўных этапах і падзеях гэтага перыяду ўсходнеславянскай гісторыі, найважнейшых тэндэнцыях і праблемах грамадска-палітычнага, палітыка-прававога і сацыяльна-

эканамічнага жыцця ўсходніх славян. Вызначальным пры выкладанні дадзенага курса з'яўляецца паглыбленае знаёмства і асэнсаванне гісторыка-метадалагічных і крыніцазнаўчых праблем курса, вывучэнне асноўных пісьмовых крыніц па гісторыі ўсходніх славян і іх кампетэнтная інтэрпрэтацыя.

Вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) прызначаны для студэнтаў 1-га курса гістарычнага факультэта, якія вывучаюць курс «Гісторыя ўсходніх славян (Расія і Украіна)». Выданне накіравана на рэалізацыю патрабаванняў адукацыйнага стандарта і вучэбнай праграмы. *Мэта* вучэбна-метадычнага комплекса – садзейнічанне арганізацыі і ўпарадкаванню самастойнай працы студэнтаў па авалодванні ведаў у адпаведнасці з вучэбнай праграмай.

Змест вучэбна-метадычнага комплекса сфарміраваны ў адпаведнасці з "Палажэннем аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі" (зацверджана пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.07.2011 № 167), у якім вызначаны структура і парадак стварэння ВМК ва ўстановах вышэйшай адукацыі. У адпаведнасці з Палажэннем, ВМК накіраваны на рэалізацыю патрабаванняў адукацыйных праграм і адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі і ствараецца па вучэбнай дысцыпліне.

Структура дадзенага ВМК у якасці асноўных кампанентаў мае: *уводзіны*, якія ўтрыліваюць тлумачальную запіску да вучэбнай праграмы і адлюстроўваюць мэты ВМК, асаблівасці структуравання і падачы вучэбнага матэрыялу, рэкамендацыі па арганізацыі працы з ВМК; *тэарэтычную частку* ў выглядзе лекцыйнага курса; *дапаможную частку* з паказальнікам асноўных гістарычных падзей, гістарычных дзеячаў, гістарычных паняццяў; *практычную частку*, якая прадстаўлена планамі семінарскіх заняткаў і спісам літаратуры для падрыхтоўкі да іх; *кантроль ведаў*, які змяшчае матэрыялы для самаправеркі ў выглядзе тэстаў і пытанняў для самакантролю (да экзамену, заліку). Матэрыял падаецца па трох модулях: 1. Усходнія славяне ў старажытнасці. 2. Кіеўская Русь. 3. Русь у перыяд феадальнай раздробленасці.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Модуль 1. Усходнія славяне ў старажытнасці**

**Паходжанне ўсходніх славян.** Славяне як этнічная супольнасць. Продкі ўсходніх славян. Распад праславянскай супольнасці. Фарміраванне ўсходняга славянства. Рассяленне ўсходнеславянскіх плямёнаў.

**Вераванні. Паганскія культы ўсходніх славян.** Сутнасць паганства. Пантэізм. Найстаражытныя вераванні ўсходніх славян. Іерархія ўсходнеславянскіх паганскіх багоў – пантэон. Ідалы. Капішчы. Валхвы.

**Сацыяльна-эканамічны лад усходнеславянскіх плямёнаў.** Земляробства як аснова гаспадаркі. Падсечная (лядна-агнявая) сістэма. Пераложная сістэма. Гаспадарка і сацыяльная арганізацыя славян. Сельская (суседская) тэрытарыяльная абшчына. Узнікненне гарадоў, іх роля ў грамадскім і гаспадарчым жыцці.

**Сацыяльна-палітычная гісторыя ўсходніх славян.** Племянныя саюзы ўсходніх славян. Усходнеславянскія князі. “Рускі каганат”. Веча. Асноўныя перадумовы дзяржаўнай арганізацыі. Запрашэнне варагаў. Рурык. Тэорыі і версіі пра пачатак Русі і рускай дзяржаўнасці. Паходжанне назвы “Русь”.

**Модуль 2. Кіеўская Русь**

**Кіеўская Русь – найбуйнейшае тэрытарыяльна-дзяржаўнае ўтварэнне Усходняй Еўропы.** Сутнасць Кіеўскай Русі як дзяржавы. Поліэтнічнасць старажытнарускай дзяржавы. Утварэнне Кіеўскай Русі. Князь Алег.

**Сацыяльна-эканамічная сутнасць Кіеўскай Русі.** Развіццё феадальных адносін. Даніна. Падаткавая рэформа княгіні Вольгі. Сацыяльная структура. Катэгорыі насельніцтва. Шматукладнасць грамадства і эканомікі.

**Палітычны лад.** Кіеўскі князь. Адміністратыўна-палітычная сістэма. Феадальная іерархія. Арганізацыя вайсковай справы. Дружына. Савет (рада) пры князю. Роля веча.

**Старажытная Русь і Візантыя.** Паходы Русі на Візантыю. Дагаворы Русі з Візантыяй і іх роля ў дзяржаўным жыцці ўсходніх славян. Князі Алег і Ігар. Разгром Хазарскага каганата і ваенныя паходы Святаслава. Барацьба за гегемонію на Балканах.

**Прынящце хрысціянства.** Рэлігійная палітыка рускіх князёў. Рэформа паганства Уладзіміра Святаславіча. Прычына і перадумовы прыняцця хрысціянства. Выбар веры. Хрышчэнне Русі як геапалітычны выбар. Наступствы прыняцця хрысціянства, яго роля ў грамадска-палітычным і сацыякультурным жыцці.

**Дзяржаўна-палітычная гісторыя ўсходніх славян у канцы X – першай трэці XII ст.** Узрастанне цэнтрабежных тэндэнцый. Барацьба за ўладу паміж Святаславічамі. Умацаванне адміністратыўна-палітычнай незалежнасці Ноўгарада і Полацка ў часы Уладзіміра Святаславіча. Дынастычная барацьба ў пачатку XI ст. Рэфармаванне адміністратыўна-палітычнага ладу Яраславам Мудрым. "Лесвічны лад". Дзяржаўна-палітычнае жыццё ў часы трыумвірата Яраславічаў. Пачатак удзельнага драблення.

**Барацьба з печанегамі і полаўцамі.** Адносіны паміж рускімі князямі і печанегамі. Руска-печанежскія сутычкі і дагаворы. Печанегі як фактар палітычнага жыцця Русі. "Чорныя клабукі". Палавецкая небяспека: цяжкасці і поспехі барацьбы.

**Сацыяльныя канфлікты і развіццё старажытнарускага заканадаўства.** Народныя паўстанні і хваляванні 1024 г., 1071 г., 1068 г., 1113 г.: прычыны, ход, наступствы. Роля валхвоў як выяўнікаў паганскай традыцыі. Дзейнасць князёў і княскіх адміністратараў па пераадоленні крызісных з'яваў.

**Модуль 3. Русь у перыяд феадальнай раздробленасці**

**Прычыны пераходу да феадальнай раздробленасці.** Развіццё і ўмацаванне феадальных адносін. Умацаванне вотчыннага землеўладання. Уздым прадукцыйных сіл і рост гарадоў як адміністратыўна-палітычных цэнтраў. Узмацненне эканамічнай і палітычнай самастойнасці асобных княстваў і зямель. Пачатак феадальнай раздробленасці.

**Найбуйнейшыя дзяржаўныя аб'яднанні перыяду феадальнай раздробленасці.** Уладзіміра-Суздальскае княства. Дзейнасць Юрыя Далгарукага, Андрэя Багалюбскага, Усевалада Вялікае Гняздо. Галіцка-Валынскае княства. Раман Мсціславіч і Данііл Раманавіч. Наўгародская зямля і асаблівасці яе дзяржаўна-палітычнага ладу.

**Барацьба супраць агрэсіі нямецкіх, дацкіх і шведскіх феадалаў.** Галоўныя напрамкі знешнепалітычнай экспансіі нямецкіх феадалаў. Заснаванне ордэна мечаносцаў. Тэўтонскі ордэн. Аб'яднанне Лівонскага і Тэўтонскага ордэнаў. Роля каталіцкай царквы ў арганізацыі крыжацкіх паходаў на ўсходнеславянскія землі. Экспансія дацкіх і шведскіх феадалаў у наўгародскія землі. Неўская бітва. Лядовае пабоішча.

**Татара-мангольскае нашэсце на рускія землі.** Утварэнне раннефеадальнай мангольскай дзяржавы. Вялікая Яса. Чынгісхан. Арганізацыя вайсковай справы. Мангольскія заваёвы. Бітва на Калцы. Мангола-татарскае нашэсце хана Батыя на Русь. Прычыны паражэння рускіх княстваў.

**Русь і Залатая Арда ў XIII ст.** Утварэнне Залатой Арды. Сістэма палітычнага падпарадкавання Русі Залатой Ардзе. Асноўныя падаткі і павіннасці. Сістэма баскацтва. Рускія князі і Залатая Арда. Палітыка Аляксандра Неўскага ў дачыненні да Залатой Арды.

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча рускіх зямель у XIII – першай палове XIV стст.** Земляробства і жывёлагадоўля. Формы і віды феадальнага і сялянскага землеўладання і карыстання. Умацаванне залежнасці і эксплуатацыі сельскага насельніцтва. Катэгорыі сялян. Функцыі гарадоў у перыяд феадальнай раздробленасці. Сістэма рускай феадальнай іерархіі.

**Узвышэнне Маскоўскага княства.** Прычыны ўзвышэння Маскоўскага княства. Перадумовы аб’яднання рускіх зямель. Барацьба за вялікае княжанне Уладзімірскае. Саперніцтва паміж Маскоўскім і Цвярскім княствамі. Паўстанне ў Цвяры 1327 г. Узмацненне Маскоўскага княства пры Іване Каліце і яго пераемніках. Барацьба за велікакняжацкі ярлык паміж Масквой і Цвер’ю ў 60–70-я гг. XIV ст. Дзмітрый Данскі.

# Модуль 1. Усходнія славяне ў старажытнасці

## Лекцыйны курс

**Паходжанне ўсходніх славян.** Паходжанне і ранняя гісторыя славянства вызначаецца пры выкарыстанні дадзеных розных навуковых дысцыплін – лінгвістыкі, археалогіі, антрапалогіі, этнаграфіі і інш. Большасць вучоных бачаць у славянах нашчадкаў старажытных індаеўрапейцаў, у выніку распаду якіх славяне пасля наступнага рассялення сталі асноўным насельніцтвам Сярэдняй і Усходняй Еўропы.

У I тыс. да н.э. разам з іншымі варварскімі плямёнамі на гістарычнай арэне з’явіліся і славяне са сваёй мовай і этнічнымі асаблівасцямі. Аддзяліўшыся ад балта-славянскай супольнасці, яны склалі адзіны этнас з аднолькавай мовай, якая ўмоўна названа “праславянскай” і лічыцца асновай сучасных славянскіх моў. Сам тэрмін “славяне” да гэтага часу не мае навуковага тлумачэння. Многія гісторыкі і лінгвісты лічаць, што ён мае агульны корань паняцця “слова”. Этнонім “славяне” ўпершыню сустракаецца ў пісьмовых крыніцах, датаваных толькі VI ст. н.э.

Вызначэнне “славянскай прарадзімы”, г.зн. рэгіёна, дзе адбылося фарміраванне славянскага народа з яго этнавызначальнымі рысамі, характарызуецца наяўнасцю некалькіх тэорый. Найбольш несупярэчлівай з’яўляецца версія, паводле якой вобласць пражывання праславян лакалізавана паміж Эльбай (Лабай) і Віслай, Дняпром і Днястром, на поўнач ад Карпацкіх гор. Дадзеныя мовазнаўства сведчаць, што месцам першапачатковага пражывання славян быў лясісты і балоцісты край. У агульнаславянскай (праславянскай) мове мала слоў, якія абазначаюць горны ландшафт. “Гарой” называлі пагорак, пакрыты лесам, высокі бераг, любую ўзвышанасць. Таксама мала тэрмінаў, звязаных з морам і стэпавым ландшафтам. Разам з тым у агульнаславянскай мове ўзнікла шмат слоў, якія абазначаюць лясы і вадаёмы: возера, плёс, балота, рака, гай, дуброва, бор і г.д. Гэтыя словы падобна гучаць і ў сучасных славянскіх мовах. У шыротах, дзе пражывалі славяне, самым халодным месяцам у годзе быў люты, з-за чаго і называўся “люты”, час цвіцення і травастою прыходзіўся на сакавік і красавік – “квецень” і “травень” і г.д. Гэта быў своеасаблівы каляндар народа-земляроба. Аднолькава ў славянскіх мовах гучаць словы “плуг”, “лемех”, “конь” і інш. Менавіта земляробства кансалідавала славянскія плямёны, забяспечыла гаспадарчы ўздым і бурны дэмаграфічны рост.

***Распад праславянскай супольнасці.*** Працэс этнічнай дыферэнцыяцыі славянства пачынаецца ў эпоху вялікага перасялення народаў. У міграцыйны працэс славяне ўключыліся ў IV ст., калі ў выніку нашэсця гунаў паўднёвыя межы пражывання славянскіх культур былі ўзламаныя. Да пачатку VI ст., прасоўваючыся ў паўднёвым, заходнім і

ўсходнім напрамках, славяне сутыкаліся з мясцовым насельніцтвам: на поўдні з ілірыйскімі і фракійскімі плямёнамі, на захадзе – з кельтамі і германцамі, з фіна-уграмі і балтамі – на ўсходзе. У выніку гэтых кантактаў і этнічных узаемадзеянняў праславянская супольнасць распалася, і на яе аснове пачалося фарміраванне трох вялікіх этнічных груп – *заходніх, паўднёвых і ўсходніх славян*. Міграцыя славян дасягнула апагею ў VII ст., калі імі былі заселены шырокія прасторы Усходняй, Паўднёва-Усходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Яшчэ ў пачатку новай эры, асвойваючы новыя тэрыторыі, славяне падышлі да межаў Рымскай імперыі, якая пазней распалася на заходнюю і ўсходнюю часткі, пастаянна парушаючы яе памежныя рубяжы. Менавіта таму аб славянах сталі пісаць рымскія і візантыйскія гісторыкі – Тацыт, Пліній Старэйшы, Іардан, Пракоп Кесарыйскі, Маўрыкій Стратэг і інш. Славяне ў іх працах названыя як венеды, склавіны, анты. Найстаражытнае найменне славян – венеды – сустракаецца ў Плінія Старэйшага і Тацыта. У I–II стст. і пазней, у раннім сярэднявеччы, этнонім *венеды* распаўсюджваўся на значную частку заходніх славян.

Па дадзеных пісьмовых крыніц, у сярэдзіне I тыс. супольнасць венедаў распалася на дзве групы – *склавінаў* і *антаў*. Візантыйскія пісьменнікі VI ст. лакалізуюць склавінаў на заходнім участку ад ніжняга Дуная да Днястра, а антаў – на ўсходнім, прыкладна ад Днястра да Азоўскага мора. Сучаснікі склавінаў і антаў – гоцкі гісторык Іардан і візантыйскі пісьменнік Пракоп Кесарыйскі – адзначалі, што абодва племені паходзяць ад аднаго кораня – венедаў – і блізкія паміж сабой. Параўноўваючы антаў і склавінаў, Іардан падкрэсліваў, што анты – самыя адважныя з плямёнаў. Збіраць звесткі аб склавінах і антах Візантыю прымусілі пастаянныя войны з імі.

Па дадзеных Іардана, склавіны размяшчаліся на поўнач ад Дуная, паміж Дунаем, Днястром і Віслай; анты засялялі тэрыторыю паміж Дняпром і Днястром. Пад імем венедаў выступаюць тыя славянскія плямёны, якія не ўдзельнічалі ў перасяленні на поўдзень і жылі паміж Віслай і Эльбай. Многія навукоўцы мяркуюць, што ў падзеле славян на венедаў, склавінаў і антаў можна бачыць тры сучасныя галіны славянства: заходнюю, паўднёвую і ўсходнюю адпаведна.

Візантыйскія пісьменнікі данеслі да нас важныя звесткі пра побыт, грамадскую і ваенную арганізацыю славян. Так, Пракоп Кесарыйскі паведаміў, што “славяне і анты не падпарадкоўваюцца аднаму правадыру, але спрадвеку жывуць у народапраўстве”. Згаданыя візантыйскімі аўтарамі славянскія правадыры – гэта не князі або цары, а, хутчэй за ўсё, правадыры ваенных дружын перыяду ваеннай дэмакратыі. Гэта пацвярджаецца паведамленнямі аб тым, што ўвесь народ антаў узброены, усе мужчыны –

воіны. Такім чынам, асновай грамадскай арганізацыі антаў быў родаплемянны лад з яго фінальнай стадыяй – *ваеннай дэмакратыяй*, формай палітычнай арганізацыі грамадства ва ўмовах разлажэння першабытнаабшчыннага ладу і ўтварэння дзяржавы. Сутнасць ваеннай дэмакратыі праяўлялася ва ўмацаванні ўлады ваенных правадыроў, абраных дэмакратычным чынам.

***Фарміраванне ўсходняга славянства.*** Прасоўваючыся ва ўсходнім накірунку па неаглядных прасторах Усходнееўрапейскай раўніны, славяне кантактавалі з балцкімі, фіна-ўгорскімі, іранскімі і цюркскімі плямёнамі, часткова асімілюючы, а часткова выцясняючы іх. У выніку гэтых этнічных узаемадзеянняў паўстала ўсходняе славянства як самастойная этнічная супольнасць, якая адрозніваецца ад іншых славянскіх народаў. Усходнеславянскія плямёны рассяліліся ў шырокім рэгіёне Усходняй Еўропы ад возера Ільмень да Прычарнаморскіх стэпаў і ад Усходніх Карпат да Волгі. Ядром фарміравання гэтай галіны славянства было Ніжняе і Сярэдняе Падняпроўе, дзе ўжо некалькі тысяч гадоў жылі земляробчыя плямёны, у прыватнасці герадотавы “скіфы-аратыя”.

Міграцыя ўсходнеславянскіх плямёнаў была накіравана па буйных рэках і рачных сістэмах. Невыпадкова, што назвы некаторых плямён пайшлі ад назваў рэк (бужане, палачане). Калі славяне авалодалі вытокамі Дняпра, Волгі і Заходняй Дзвіны, падышлі да ракі Волхаў і возера Ільмень, у іх руках апынуліся выключна важныя шляхі зносін, якія злучалі Балтыйскае мора з Чорным і Каспійскім. *“Шлях з варагаў у грэкі”* пачынаўся ад Фінскага заліва і ішоў праз раку Няву, Ладажскае возера, раку Волхаў, возера Ільмень, раку Ловаць. З Ловаці праз дробныя рэчкі і сістэму волакаў ён вёў у Заходнюю Дзвіну, а адтуль волакам у вярхоўі Дняпра. Праз Днепр славяне выходзілі ў Чорнае мора, да “грэкаў”, г.зн. у Візантыю. Гэтай найважнейшай гандлёвай дарогай карысталіся не толькі славяне, але і варагі, якія яе кантралявалі. *“Шлях з варагаў у арабы”* – яшчэ адзін важны гандлёвы шлях, па ім славянскія купцы выходзілі па Волзе ў землі хазар і волжскіх булгар, з Дняпра праз невялікія рэчкі на Дон, дасягалі Азоўскага і Каспійскага мораў. Гэтымі ж шляхамі ў славянскія землі ездзілі іншаземныя купцы. Актыўны гандаль славян з Візантыяй і з грэчаскімі калоніямі ў Крыме пацвярджаецца багаццем скарбаў рымскіх срэбных дэнарыяў па цячэнні Дняпра. Скарбы арабскіх манет, знойдзеныя археолагамі ўздоўж Волжскага гандлёвага шляху, сведчаць аб ажыўленых гандлёвых сувязях славян з краінамі Усходу. Гэты паток рымскага і арабскага срэбра (як у манетах, так і ў ювелірных вырабах) ішоў, відавочна, у абмен на тыя прадукты, якія маглі прапанаваць славяне – хлеб, футра, мёд, воск.

***Рассяленне ўсходнеславянскіх плямёнаў.*** Гандлёвыя сувязі з Візантыйскай імперыяй, краінамі Усходу, несумненна, спрыялі эканамічнаму прагрэсу ўсходніх славян і іх этнічнай кансалідацыі. Невыпадкова менавіта па рачных дарогах узніклі славянскія племянныя цэнтры – Кіеў у палян, Ноўгарад у ільменскіх славен, Полацк у палачан, Смаленск у крывічоў.

Тэрыторыя рассялення ўсходнеславянскіх плямёнаў акрэслена летапісцам. Абодва берагі Дняпра, недалёка ад вусця ракі Дзясны, займала племя *палян* з цэнтрам у Кіеве. Паходжанне этноніма “поляне” летапісец тлумачыць так: “зане в поли седоху”, супрацьпастаўляючы гэта племя насельнікам лясной зоны. Іх паўночна-ўсходнімі суседзямі былі *северане,* што жылі ў басейне рэк Дзясны, Сулы і Сейма, з цэнтрам Чарнігавам. Усходнія і паўднёвыя межы северан, якія ляжалі на ўскраіне стэпаў, занятых качэўнікамі, не былі сталымі і часам дасягалі Паўночнага Донца. Далей на поўнач, у басейне ракі Сож, знаходзіліся *радзімічы*. У летапісе сказана, што “радимичи же и вятичи от ляхов”, што некаторымі гісторыкамі трактуецца як сведчанне іх генетычных сувязяў з заходнімі суседзямі – палякамі, аднак гэта не пацвярджаецца археалагічнымі дадзенымі. У верхнім цячэнні Акі і яе прытокаў – Масквы і Угры – знаходзілася тэрыторыя *вяцічаў*. Радзімічы і вяцічы з’яўляліся родзічамі, паводле летапісца, яны паходзілі ад легендарных родапачынальнікаў – Радзіма і Вятка. Вярхоўі Дняпра і Заходняй Дзвіны, а таксама збольшага і Волгі засялялі *крывічы*, адно з самых буйных племянных аб’яднанняў усходняга славянства. З цягам часу супольнасць крывічоў падзялілася на тры групоўкі: *палачане,* якія жылі па рацэ Палаце, па Заходняй Дзвіне, смаленскія, цэнтрам якіх з’яўляўся Смаленск, і пскоўскія – з цэнтрам Пскоў. Вобласць Ільменскага возера і басейн рэк Волхаў і Ловаць была занята *славенамі*, найбольш паўночнай групай усходніх славян. Іх найстаражытным племянным цэнтрам было гарадзішча Старая Ладага на Волхаве, а пазней Ноўгарад. На Палессі, на правым беразе Дняпра, на поўнач ад палян, рассяліліся *драўляне*, тэрыторыя якіх даходзіла да ракі Прыпяці. Галоўным горадам драўлян быў Іскарасцень на рацэ Уж. Паміж Прыпяццю і Заходняй Дзвіной распрасціраліся ўладанні *дрыгавічоў*. Як і іншыя племянныя аб’яднанні, дрыгавічы мелі сваё “княжанне” з цэнтрам у Тураве. Па верхнім цячэнні Прыпяці і Заходняга Буга пражывалі *дулебы, валыняне* і *бужане*. Па сярэднім і ніжнім цячэнні Днястра да чарнаморскага ўзбярэжжа жылі *улічы* і *ціверцы*, а паўночна-ўсходнія ўзгор’і Карпат засялялі *белыя харваты*.

Такім чынам, арэал рассялення ўсходнеславянскіх плямёнаў, паводле “Аповесці мінулых гадоў”, уключаў у сябе вялікую частку сучаснай Украіны, пераважную частку цяперашняй Беларусі і шэраг абласцей Расіі.

У пералічаных летапісцам усходнеславянскіх плямёнах можна бачыць этнічных продкаў беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. Пры гэтым севяране з'явіліся продкамі як рускіх, так і ўкраінцаў, а крывічы і радзімічы – рускіх і беларусаў.

**Вераванні. Паганскія культы ўсходніх славян.** Грамадскаму развіццю ўсходніх славян адпавядалі іх вераванні. Пануючай рэлігіяй з'яўлялася *паганства – шматбожжа,* у аснове якога быў *пантэізм* – абагаўленне сілаў і з'яваў прыроды (вады, агню, зямлі і інш.), а таксама жывёл і раслін. Славяне пакланяліся агню, дрэвам, камяням, крыніцам, маліліся ў святых гаях, прыносілі крывавыя ахвяры сваім багам. Паганскія багі былі раствораныя ў прыродзе і жылі побач з людзьмі. Разам з верай у паганскіх багоў усходнім славянам былі ўласцівы найстаражытныя міфалагічныя ўяўленні, згодна з якімі ў глыбокай яме жыў вадзянік, у вадзе жылі тапельніцы, якія пераўтварыліся ў русалак, у лесе гаспадарыў лесавік, у хаце нябачна прысутнічаў дамавік – яе заступнік.

Паганскія ўяўленні былі звязаны з рознымі ступенямі ў развіцці свядомасці першабытнага грамадства: *анімізмам, татэмізмам, фетышызмам, магіяй і культам продкаў.* Найстаражытным з іх у славян быў культ *Рода, Чура або Шчура* (адсюль слова "прашчур"), продкаў па жаночай лініі называлі *Рожаніцамі.*

Культ сямейна-родавага продка-ўладара, патрыярха, дзеда стаў асновай для ўзнікнення культу племяннога бога. *Вялес (Волас)* – Бог гандлю і звяроў, таксама вядомы як захавальнік статку жывёл. Сімвал – сноп збожжа або збожжа, звязанае ў вузел. Святыя жывёлы і расліны: вол, збожжа, пшаніца. Вялес – добразычлівы бог, які рэгулюе тавараабмен і пераконваецца, што абяцанні трымаюцца. Клятвы і дамовы прыводзіліся да прысягі яго імем. У "Аповесці мінулых гадоў" летапісец Нестар называе Вялеса "скотьим богом", заступнікам хатніх жывёл. Магчыма, гэты манах дрэнна ведаў дахрысціянскую міфалогію Русі ці пастараўся прыменшыць значэнне сына Рода, брата Сварога. Вялес – адзін з найвялікшых багоў старажытнага свету. Яго галоўнай падзеяй стала тое, што Вялес прывёў створаны Родам і Сварогам свет у рух. Дзень стаў змяняць ноч; за зімой непазбежна вынікалі вясна, лета і восень; за выдыхам – удых, пасля смутку – радасць. Гэта быў не аднастайны паўтор адных і тых жа цыклаў, а навучанне асновам жыцця. Людзі вучыліся пераадольваць цяжкасці і шанаваць шчасце. Рух калаварота адбываецца па вышэйшым законе Праві ўслед за рухам Сонца па небе – Пасалонь. Накіроўваючай сілай з'яўляецца Вялікая Любоў, якая дапамагае ў выпрабаваннях.

Нярэдка ў розных плямёнаў адны і тыя ж багі мелі розныя імёны. Напрыклад, бог сонца называўся *Дажбог, Сварог, Хорс, Ярыла.* Багі асобных плямёнаў паступова зводзіліся ў агульны пантэон. Нягледзячы на

ўмоўнасць і няўстойлівасць, у ім ўсталёўвалася своеасаблівая іерархія, вылучаліся галоўныя бажаствы, ушанаваныя ўсімі ці многімі плямёнамі: *Вялес*, а таксама *Пярун* – бог грому і маланкі, бог дажджу, *Стрыбог* – бог ветру, *Семаргл* – бог урадлівасці, сувязны паміж нябесным і зямным светам, і інш.

Сілы і з'явы прыроды абагаўляліся і персаніфікаваліся, выяўляліся ў выглядзе людзей – *ідалаў*. Археалагічныя даследаванні адкрылі паганскія культавыя збудаванні – *капішчы* і *трэбішчы*, дзе славяне пакланяліся сваім ідалам, спрабуючы актыўна ўздзейнічаць на багоў. З гэтай жа мэтай ўладкоўваліся паганскія святы (гульбішчы, братчыны). У гонар багоў заколвалі быкоў і бараноў, усім племенем варылі мёд, піва, пяклі пірагі. Слугамі паганскіх культаў былі *валхвы, вестуны-ведзьмакі*.

**Сацыяльна-эканамічны лад усходнеславянскіх плямёнаў.** ***Гаспадарка і сацыяльная арганізацыя славян.*** Асновай эканомікі славян з'яўлялася земляробства, якое мела свае асаблівасці ў залежнасці ад рэгіёнаў Усходнееўрапейскай раўніны. У лясных раёнах была распаўсюджаная *падсечная (лядна-агнявая) сістэма*, пры якой расчыстка лесу была неабходнай умовай для пашырэння пасеваў. Высечаныя дрэвы і хмызнякі спальваліся, а попел, які заставаўся на "пале", служыў угнаеннем. Верхні пласт падрыхтаванага такім чынам участка разрыхляўся матыкамі. Падсечнае земляробства не ведала сталых палёў: некалькі гадоў з угноенага попелам участка збіралі добры ўраджай, а калі глеба збяднялася, участак закідвалі да аднаўлення ўрадлівасці глебы, расчышчалі і засявалі новыя землі.

У месцах, дзе лясоў было мала ці не было зусім, "падсека" для пасеваў не ўжывалася, але і тут ручная апрацоўка цаліны патрабавала вялікіх намаганняў. Чарназёмныя глебы стэпавых і лесастэпавых раёнаў стваралі больш спрыяльныя ўмовы для земляробства, але, не атрымліваючы ніякіх угнаенняў, яны таксама збядняліся. Таму ў стэпавых і лесастэпавых мясцовасцях ужывалася *пераложная сістэма* земляробства: знясіленыя землі пакідалі "пад залеж", а для пасеву выбіралі новыя ўчасткі, якія папярэдне апрацоўвалі матыкамі. Абедзве сістэмы прымітыўнага земляробства (падсечная гаспадарка і пералог) мелі агульную асаблівасць: яны патрабавалі наяўнасці вялікіх масіваў зямлі і пастаянных намаганняў значных людскіх калектываў.

Хоць пры ручным земляробстве не было пастаянных палёў, славяне вялі цалкам аселы лад жыцця. Існаванне ў лясной і лесастэпавай паласе ўмацаваных пасёлкаў-гарадзішчаў сведчыць не толькі аб аселасці, але і пра тое, што славяне вялі калектыўную гаспадарку. На апошняй стадыі першабытнаабшчыннага ладу каапераванне працы выяўлялася ў захаванні вялікай родапатрыярхальнай сям'і, у склад якой уваходзілі не менш трох

пакаленняў. Такія вялікія сем'і і жылі ў славянскіх умацаваных гарадзішчах. Некалькі такіх сем'яў складалі *патрыярхальны род*, а некалькі родаў – *племя*.

Развіццё земляробства ўносіла значныя перамены ў гаспадарчае жыццё славян. Частку прадуктаў сельскай гаспадаркі сталі выкарыстоўваць для адкорму жывёлы, у той час як іншыя галіны гаспадаркі – паляванне, рыбалоўства, бортніцтва, збіральніцтва – станавіліся другараднымі. Развіццё падсечнай сістэмы стварала ўмовы для пераходу да больш дасканалай формы апрацоўкі зямлі – *ворыўнага земляробства*, пры якім пасеву стала папярэднічаць узворванне. Пераход да ворыўнага земляробства адбываўся нераўнамерна. У першую чаргу ён пачынаўся ў так званых "опольях" – на адкрытых месцах лясных раёнаў, дзе ўзворванне зямлі драўляным *ралам* было адзіным сродкам павялічыць ураджайнасць, вельмі нізкую пры ручной апрацоўцы. Распаўсюджванне ворыўнага земляробства, зафіксаванае археолагамі ўжо ў пачатку першага тысячагоддзя, мела выключнае значэнне для развіцця эканомікі і грамадскай арганізацыі славян. Ворыўнае земляробства ў спалучэнні з лясным пералогам прыкметна падвышала прадукцыйнасць працы і ўжо не патрабавала абавязковага аб'яднання рабочай сілы для апрацоўкі зямлі.

Ворыўнае земляробства з яго больш устойлівым цыклам сельскагаспадарчых работ, з больш прадукцыйнымі прыладамі працы і прымяненнем цяглай сілы – хатняй жывёлы – адкрывала магчымасць для індывідуалізацыі гаспадаркі. Таму можна бачыць бясспрэчную сувязь паміж узнікненнем і развіццём ворыўнага земляробства ў славян і з'яўленнем *сельскай (суседскай) тэрытарыяльнай абшчыны*, якая прыйшла на змену ранейшым родавым аб'яднанням. Разам з тым распаўсюджванне ворыўнага земляробства суправаджалася ростам насельніцтва, якое выходзіла за межы ўмацаваных пасёлкаў-гарадзішчаў і будавала новыя паселішчы, якія, як правіла, не ўмацоўваліся. Некалькі такіх паселішчаў складалі суседскую абшчыну – *верв, мір*, якія ўзначальвалі выбарныя старэйшыны. Большасць гісторыкаў адносяць гэты працэс да VI–VII стст., хоць любая яго дacіроўка можа быць толькі адноснай.

У другой палове I тысячагоддзя ворыўнае земляробства стала пануючым для ўсёй тэрыторыі рассялення ўсходніх славян. Шырокае распаўсюджванне, як сведчаць археалагічныя дадзеныя, атрымалі ворыўныя прылады з жалезнымі працоўнымі часткамі – *рала* (у паўднёвых абласцях) і *саха* (на поўначы). Сярод збожжавых культур найбольшае пашырэнне мелі *пшаніца* і *жыта*, вядомыя былі таксама *проса, грэчка і ячмень*. Падпарадкаваную, другарадную ролю ў гаспадарцы мела жывёлагадоўля. Гаспадарчай ячэйкай ва ўсходніх славян стала *малая сям'я ("дым")* з індывідуальнай гаспадаркай. Калі ворныя землі знаходзіліся ў

валоданні асобных сем'яў, то іншымі зямельнымі ўгоддзямі абшчына валодала сумесна – выганамі для жывёлы, вадаёмамі, лясамі. Гэта непадзельнае валоданне стварала аснову для захавання абшчыннага землеўладання і самой сельскай абшчыны.

Такім чынам, сельская тэрытарыяльная абшчына была заснавана на калектыўнай форме ўласнасці. Гэта была карпаратыўная сацыяльная сістэма, якая арганізоўвала ўсе віды дзейнасці яе членаў і была заснавана на ўраўняльных прынцыпах. Яе ўнутраная структура будавалася на прынцыпах прамой дэмакратыі (выбарнасць старэйшын, калектыўнасць прыняцця рашэнняў, адсутнасць сацыяльнай дыферэнцыяцыі).

***Узнікненне гарадоў.*** Сельскія абшчыны ў VI–VIII стст. мелі ў сваім складзе не толькі неўмацаваныя вёскі, але і *гарадзішчы* – "грады". Гэта былі абшчынныя сховішчы, дзе за валамі і сценамі магло схавацца ("деться") мясцовае насельніцтва падчас нападаў ворагаў. Некаторыя "грады" мелі пастаяннае насельніцтва, якое ў асноўным займалася рамяством. Засяленне рамеснікамі гарадоў-сховішчаў было пачаткам узнікнення гарадоў як рамесна-гандлёвых цэнтраў. Археалагічныя дадзеныя дазваляюць сцвярджаць, што многія гарады паўсталі ўжо ў VII–VIII стст. Да іх адносяць Кіеў, Ізборск, Ладагу, Ноўгарад, Полацк, Смаленск, Растоў, Чарнігаў.

Да IX ст. гарады ўсходнеславянскага рэгіёна былі настолькі развітыя, што варагі сталі называць гэтую краіну *"Гардарык"*, г.зн. краінай гарадоў. Гарады паступова станавіліся эканамічнымі і адміністратыўнымі цэнтрамі. У гарадах фарміравалася адміністрацыя – *старэйшыны гарадскіх абшчын* або *"старцы градские"*, якіх узгадваюць старажытнарускія пісьмовыя крыніцы. Развіццё гарадоў як цэнтраў рамяства сведчыла аб эканамічным прагрэсе ўсходняга славянства. Раней за ўсё перайначыліся і адасобіліся ад іншых відаў гаспадарчай дзейнасці дзве галіны вытворчасці: апрацоўка металаў і ганчарная справа. Але і іншыя промыслы – скураная справа, ткацтва, апрацоўка косці, бандарства і інш. – таксама сталі набываць рамесны характар – вытворчасць з мэтай абмену.

Вылучэнне і рост рамяства натуральна прыводзілі да развіцця абмену, так у славянскім грамадстве з'яўляюцца купцы. Цэнтрамі мясцовага гандлю былі гарады і пагосты – цэнтры сельскіх абшчын. У гарадах складаліся гандлёвыя караваны і накіроўваліся па гандлёвых шляхах, у тым ліку *"з варагаў у грэкі"*. Гандлявалі футрам і палатном, жывёлай і мёдам, рабамі-палоннымі. Ахова тавараў на гандлёвых шляхах патрабавала ваеннай сілы, таму ў гарадах складваліся ваенныя дружыны, у склад якіх уваходзілі моцныя маладыя людзі. На чале такіх дружын стаялі князі. Так паступова ва ўсходнеславянскім грамадстве ўзнікае *пануючы слой* у асобе князёў, дружыннікаў, а разам з імі племянных старэйшын,

“старцаў градскіх”, валхвоў, якія, назапашваючы багацце, гандлюючы, захопліваючы лепшыя ўгоддзі і рабоў, ператвараліся ў сілу, якая стаіць над грамадствам і падпарадкоўвае абшчыну.

**Сацыяльна-палітычная гісторыя ўсходніх славян.** ***Племянныя саюзы ўсходніх славян.*** Плямёны, пералічаныя аўтарам “Аповесці мінулых гадоў”, па сутнасці з’яўляліся *племяннымі саюзамі*, г.зн. тэрытарыяльна-ваеннымі федэрацыямі, аб’яднанымі агульнымі гаспадарчымі задачамі або неабходнасцю барацьбы з вонкавымі ворагамі.

Знешняя небяспека была магутным каталізатарам грамадскай кансалідацыі славянства. Так, у VI ст. грозным ворагам славян быў *Аварскі каганат*, якога падбухторвала Візантыя да рабаўнічых нападаў на суседнія славянскія землі. Верагодна, у барацьбе з аварамі і склаўся племянны саюз *дулебаў-валынянаў*, найбольш ранні з славянскіх саюзаў плямёнаў і вядомы як *анцкі* (саюз антаў). У яго ўваходзілі і заходнеславянскія, і ўсходнеславянскія плямёны. Летапіс захаваў паданне аб *обрах* (аварах), якія жорстка прыгняталі славян.

Пералічваючы племянныя аб’яднанні, летапісец называе іх *“княжаннямі”*, адзначаючы існаванне ва ўсходніх славян княскіх дынастый, напрыклад, у палян дынастыя *Кія*, які заснаваў горад Кіеў, здзейсніў падарожжа ў Царград, дзе быў прыняты імператарам. Легендарны *Тур* названы заснавальнікам Турава, а *Радзім* і *Вятка* – правадырамі радзімічаў і вяцічаў. Летапісныя плямёны-княжанні ўзнікалі ў выніку кансалідацыі некалькіх суседніх плямёнаў. Першапачаткова ва ўсходніх славян існавала каля 150 невялікіх плямёнаў, якія з цягам часу ўтварылі больш буйныя аб’яднанні. Аднак гэта быў не адзіны шлях узнікнення племянных саюзаў. Супастаўленне летапісных паведамленняў пра крывічоў і палачан дае падставу меркаваць, што княжанне палачан узнікла ў працэсе вылучэння палачан са складу шырокага племяннога аб’яднання крывічоў. Княжанні ў улічаў, ціверцаў, белых харватаў і валынянаў, верагодна, знаходзіліся ў залежнасці ад заходнеславянскіх палітычных аб’яднанняў – Вялікай Маравіі, а пазней Чэхіі і Польшчы.

У VI–VII стст. славяне перажывалі завяршальную стадыю абшчынна-родавага ладу, прадстаўленага як патрыярхальнай, так і тэрытарыяльнай абшчынай. Улада канцэнтравалася ў народнага схода – *веча* – як інстытута першабытнай дэмакратыі. Адбывалася адасабленне родаплемянной знаці, з’яўляліся племянныя правадыры, князі, у руках якіх паступова засяроджвалася багацце і ўлада. Вылучыліся і набывалі самастойнасць племянныя цэнтры.

Да IX ст. ва ўсходніх славян склаліся *асноўныя перадумовы дзяржаўнай арганізацыі*: а) сацыяльная дыферэнцыяцыя, што прыводзіла да ўзнікнення ўладных структур; б) узнікненне мясцовых прававых

нормаў, якія рэгулявалі грамадскія адносіны; в) гаспадарчая кансалідацыя на аснове абслугоўвання Волжскага і Дняпроўскага гандлёвых шляхоў.

Племянныя саюзы былі дастаткова ўстойлівымі аб'яднаннямі, пра што сведчыць трываласць родаплемянных межаў. Драбленне Кіеўскай Русі ўдзельнага перыяду адбывалася ў асноўным менавіта па гэтых межах. У асяроддзі саюзаў плямёнаў, якія праіснавалі некалькі стагоддзяў, складваліся агульныя рысы культуры і побыту, фарміраваўся свой дыялект. Менавіта ў племянных княжаннях і племянных саюзах варта шукаць вытокі дзяржаўнасці ва ўсходніх славян.

Працэс утварэння дзяржавы ва ўсходніх славян першапачаткова быў пазбаўлены прыкмет цэнтралізацыі. Аднак пісьмовыя крыніцы даюць звесткі аб двух суперсаюзах – *Паўднёвым* (на чале з палянамі) і *Паўночным* (на чале з ільменскімі славянамі). Арабскія аўтары паведамляюць пра тры палітычныя цэнтры: *Куявія, Славія* і *Артанія.*

Палітычны поліцэнтрызм шмат у чым тлумачыўся геапалітычным становішчам усходнеславянскіх плямёнаў, неабходнасцю барацьбы на паўднёвым напрамку з хазарамі, на паўночным – з варагамі. Умоўная дата ўтварэння дзяржавы – 882 г. – акрэсліла аб'яднанне Паўднёвага і Паўночнага суперсаюзаў. У гэтым працэсе найважнейшую ролю адыгрывала іх становішча як цэнтраў транс'еўрапейскага транзітнага гандлю ў пачатку і ў канцы шляху "з варагаў у грэкі", які кансалідаваў навакольныя тэрыторыі, уцягваючы іх у сферу свайго функцыянавання.

Усходнія славяне падышлі да мяжы ўтварэння дзяржавы адначасова з іншымі славянскімі народамі і з народамі Заходняй Еўропы. "Прызванне варагаў" стымулявала гэты працэс як ва ўсходніх славян, так і ў заходнееўрапейскіх народаў. Ваенная дэмакратыя з'явілася арганізуючым элементам, каталізатарам устанаўлення дзяржаўных формаў. Таму працэс афармлення дзяржаўнасці ва ўсходніх славян варта разглядаць у агульным кантэксце еўрапейскай гісторыі.

***"Рускі каганат".*** Завяршальны этап стварэння дзяржавы ва ўсходніх славян звязаны з утварэннем "Русі", "Рускай зямлі" і народам, які стварыў гэтую дзяржаву, – "*русамі*" або "*росамі*". Звесткі пра "русаў" з'яўляюцца ў розных крыніцах пачынаючы з VI ст. Сірыйскія і арабскія пісьменнікі ведалі народ "*рос*", які жыў у раёне Прыдняпроўя. "Русы" ў 30–40-х гг. VII ст. здзейснілі некалькі паходаў на Дзербент і закаўказскія ўладанні Персіі. Ад канца VIII – пачатку IX ст. да нас дайшлі звесткі пра наўгародскага князя *Браўліна*, які на чале "раці вялікай рускай" ваяваў у Крыме з хазарамі, прайшоўшы ад Судака да Керчы. Яшчэ больш буйныя маштабы мела "нашэсце Русі" на візантыйскі горад Амастрыду (30-я гг. IX ст.). Нарэшце, у 860 г. паход Русі на Візантыю ледзь не прывёў да

ўзяцця Канстанцінопаля. Прадпрыняты не толькі для захопу здабычы, але і з мэтай дэманстрацыі сілы, ён скончыўся няўдала.

У крыніцах мы знаходзім шматлікія дадзеныя аб гандлі Русі з Візантыяй і іншымі краінамі, аб палітычным ладзе Русі і пра саміх русаў. Так, арабскі пісьменнік IX ст. Ібн-Хордадбех у аповедзе пра купцоў-русаў адзначае, што Русь мела такія шырокія гандлёвыя сувязі з Візантыяй і з арабскімі краінамі, што Чорнае мора называлася “Рускім морам”, а рака Дон – “ракой славян”. З расказу аб рускім пасольстве ў Візантыю ў 839 г. вядома, што кіраўнік “народа Рос” насіў тытул “каган” або “хакан”. Гэты тытул кіраўнік русаў прыняў, дэманструючы тым самым сваю роўнасць з уладаром Хазарыі.

Такім чынам, ужо ў першай палове IX ст. ва ўсходнеславянскіх плямёнаў існавала вярхоўная палітычная ўлада. Яе ўзначальвалі *князі-каганы*, якія атрымалі шырокую вядомасць далёка за межамі сваіх княстваў. Сведчанні крыніц не дазваляюць дакладна вызначыць рэгіён рассялення русаў у VI–IX стст. Па некаторых дадзеных, гэта раён сярэдняга цячэння Дняпра і яго прытокаў, які быў абмежаваны з поўдня стэпамі Паўночнага Прычарнамор’я і цягнуўся да Кіева. Аднак, акрамя падняпроўскай, вядомая і іншая Русь – паўночна-заходняя або варажская.

***Запрашэнне варагаў.*** Адначасова з утварэннем ядра дзяржавы на чале з палянамі вакол Кіева адбываўся працэс аб’яднання паўночнай часткі ўсходнеславянскіх плямёнаў на чале са славенамі вакол Ноўгарада. У гэты працэс уцягваліся і неславянскія этнасы (фіна-ўгорскія, чудзь, мера). Аб’яднальныя працэсы ва ўсходніх славян адбываліся ва ўмовах барацьбы на поўдні з хазарам, на поўначы – з варагамі. “Аповесць мінулых гадоў” паведамляе, што ў 859 г. “варяги из заморья взимали дань с чуди, и со словен, и с мери, и с кривичей. А хазары брали с поля, и с северян, и с вятичей по серебряной монете и по белке от дыма”. Аднак ні хазарам, ні варагам не ўдалося надоўга падпарадкаваць славян. Верагодна, што залежнасць палян ад хазараў была ліквідаваная падчас кіравання кіеўскіх князёў варажскага паходжання Аскольда і Дзіра, якія дзейнічалі ўжо цалкам як самастойныя і моцныя правадыры.

Некалькі інакш развіваліся падзеі на поўначы. Паходы варагаў “из заморья”, г.зн. са Скандынавіі, на землі ўсходніх славян насілі характар разбойных набегаў. Славены, крывічы і іншыя плямёны, як паведамляе летапіс, паўсталі на варагаў, “изгнали варяг за море, и не дали им дани, и начали сами собой владеть”. Ноўгарад, падобна Кіеву, з’яўляўся яшчэ адным палітычным цэнтрам славянскай дзяржаўнасці, якая складвалася ў IX ст. Аднак у Ноўгарадзе былі вельмі моцныя традыцыі родавага ладу, што прывяло да вострай барацьбы за ўладу паміж родавымі старэйшынамі:

"…и не было среди них правды, и встал род на род, и была у них усобица, и стали воевать друг с другом".

У гэтых умовах у Ноўгарадзе ў ***862 г.*** і з'явіўся Рурык – легендарны родапачынальнік кіруючай дынастыі на Русі. Летапісная легенда – яркі аповед пра "прызванне варагаў" – паведамляе, як славяне вырашылі пашукаць "себе князя, который бы владел нами и судил по праву", як яны пайшлі да варагаў і заявілі ім: "Земля наша велика и обильна, а порядка в ней нет. Приходите княжить и владеть нами". У адказ "избрались трое братьев со своими родами, и взяли с собой всю русь, и пришли, и сел старший, Рюрик, в Новгороде, а другой, Синеус, – на Белоозере, а третий, Трувор, – в Изборске. И от тех варягов прозвалась Русская земля".

***Тэорыі і версіі пра пачатак Русі і рускай дзяржаўнасці.*** Пачынаючы з XVIII ст., пытанне аб узнікненні дзяржавы ва ўсходніх славян і ролі варагаў у гэтым працэсе з'яўляецца дыскусійным. Летапісная легенда лягла ў аснову так званай "*нарманскай тэорыі*". Яе прыхільнікі сцвярджаюць, што варагі (скандынавы) сталі стваральнікамі дзяржавы ва ўсходніх славян, да чаго тыя самі аказаліся не здольныя. *"Антынарманская тэорыя",* наадварот, акцэнтуе ўвагу на ўнутранай абумоўленасці і заканамернасці ўтварэння дзяржавы ўсходніх славян, якая была ўтворана ў выніку трансфармацыі грамадска-палітычных адносін усходнеславянскай супольнасці. Палеміка паміж "нарманістамі" і "антынарманістамі" працягваецца на працягу стагоддзяў, аднак аргументацыя абедзвюх пазіцый мае адносны характар.

Аповед летапісца пра "запрашэнне варагаў" адлюстраваў падзеі, якія маглі мець месца. Па самай распаўсюджанай версіі паходжання Русі, да якой схіляецца большасць гісторыкаў, варажскае (скандынаўскае) паходжанне першых рускіх князёў (Рурык, Алег, Вольга, Ігар) не ставіцца пад сумнеў. Значная колькасць скандынаўскіх пахаванняў на тэрыторыі Усходняй Еўропы сведчыць аб удзеле варажскіх дружын і іх правадыроў у палітычных падзеях сярэдзіны IX ст. Многія навукоўцы звязваюць з праўленнем варажскай дынастыі і *"лествичный"* (па старшынстве) парадак атрымання княскіх сталоў, які адлюстроўвае погляд на старажытнарускую дзяржаву як на агульную ўласнасць кіруючага варажскага роду. Разам з тым варагі даволі хутка растварыліся ў славянскім грамадстве, уцягнутыя ў славянскую культуру (невыпадкова летапісец дае ім ёмістае імя – "находнікі").

Аднак этнічная прыналежнасць, як і радзіма варагаў, да гэтага часу канчаткова не вызначана. Сціплыя звесткі пра гэта дае і "Аповесць мінулых гадоў". Частка даследчыкаў, адмаўляючы скандынаўскае паходжанне варагаў, схіляецца да таго, што варагамі называлі не шведаў, датчан або нарвежцаў, а славянскае насельніцтва паўднёвага ўзбярэжжа

Балтыкі. Згодна з гэтай версіяй, тэрмін "варагі" ўтварыўся ад назвы часткі заходнеславянскага племяннога саюза абадрытаў – "*ваграў-варынаў*", якія засялялі паўвостраў Вагрыю (паміж Балтыйскім морам і ракой Травэ). На карысць дадзенай канцэпцыі сведчыць поўная адсутнасць у назвах старажытнарускіх гарадоў, нават заснаваных варагамі (Ноўгарад, Растоў, Мурам, Ізборск), скандынаўскіх назваў. Археалагічныя, антрапалагічныя і лінгвістычныя дадзеныя даказваюць актыўную каланізацыю паўночна-заходніх ўсходнеславянскіх тэрыторый балтыйскімі славянамі. Верагодна, таму наўгародскі летапісец адзначыў, што наўгародцы – "те люди от варяжского рода, а прежде были словене".

Такім жа дыскусійным з'яўляецца пытанне пра паходжанне тэрміна "*Русь*". У летапісе сказана, што наўгародцы "пошли за море к варягам, к руси. Те варяги назывались русью, как другие называются шведы, а иные норманны и англы, а еще иные готландцы, – вот так и эти". Па традыцыі яго звязваюць з фінскім словам "ruotsi" – весляры, удзельнікі ваенна-рабаўнічых атрадаў, якія ажыццяўлялі паходы на вяслярных суднах. Гэтая гіпотэза пацвярджаецца заўвагай летапісца аб тым, што закліканыя наўгародцамі варагі прыйшлі "з руссю". Дадзены этнонім быў з часам успрыняты ўсходнімі славянамі і паступова трансфармаваўся ў "русы", "росы", "Русь". Магчыма, першапачаткова ён распаўсюджваўся на невараждскую частку княжацкай дружыны, а пазней набыў шырокае геапалітычнае значэнне.

Прыхільнікі паўднёвабалтыйскіх каранёў паходжання варагаў звязваюць "Русь" з назвай старажытнага заходнеславянскага народа – "*ругі", "руяне*", якія засялялі востраў Руян (сучасны Руген) і ўваходзілі ў ваенна-племянны саюз абадрытаў.

Прыхільнікі трэцяй версіі прытрымліваюцца мясцовага, ўсходнеславянскага паходжання назвы "Русь". У якасці аргументаў прыводзяцца дадзеныя гідранімікі, тапанімікі і лінгвістыкі (назва правага прытока Дняпра – Рось, геаграфічныя назвы "Рось", колер валасоў "русы", раса на траве), а таксама звесткі арабскіх пісьменнікаў. Аднак якімі б ні былі адрывачнымі і спрэчнымі ў інтэрпрэтацыях дадзеныя летапісаў, аналаў і запісак сучаснікаў, усе яны пераконваюць у актыўнай дзейнасці прышэльцаў-варагаў у ранняй гісторыі Усходняй Еўропы.

Роля варажскіх князёў асабліва прыкметная ўжо пасля смерці Рурыка. Яго набліжаны або сваяк *Алег* пачаў падпарадкаванне славянскіх плямёнаў за межамі паўночнага цэнтра. З 879 г. ён кіраваў у Ноўгарадзе як апякун-рэгент малалетняга сына Рурыка Ігара. Разам з Ігарам на чале дружыны ён рушыў на поўдзень па вялікім шляху "з варагаў у грэкі". Падпарадкаваўшы Смаленск і Любеч на Дняпры, ён падышоў да Кіева, дзе княжылі Аскольд і Дзір – былыя мужы-дружыннікі Рурыка. Хітрасцю

выбавіўшы іх з горада, Алег забіў абодвух на той падставе, што яны “не князі і не княскага роду”. Затым ён заняў Кіеў, зрабіў яго сваёй сталіцай, абвясціўшы: “Да будет это мать городам русским”. Гэта падзея, аднесеная летапісцам да 882 г., традыцыйна лічыцца датай утварэння Кіеўскай Русі, магутнай усходнееўрапейскай раннефеадальнай дзяржавы. Нягледзячы на скандынаўскае паходжанне Рурыка і Алега, дзяржава гэта была славянскай. Поспех варажскіх князёў тлумачыўся тым, што ім удалося ўмацаваць раней сфарміраваныя ўсходнімі славянамі асноўныя інстытуты дзяржаўнага ладу, такія як княская ўлада, падаткавая сістэма, абарона ад знешніх ворагаў. Іх палітыка аб’ектыўна адлюстроўвала працэс аб’яднання ўсходнеславянскіх плямён, які пачаўся задоўга да з’яўлення варагаў і незалежна ад іх.

**Паказальнік асноўных гістарычных падзей**

**VI–IX стст.** – рассяленне славян па тэрыторыі Усходняй Еўропы, узнікненне ўсходнеславянскіх племянных саюзаў (княжэнняў).

**Канец VI ст. – пачатак VII ст.** – заснаванне палянамі Кіева, княжанне дынастыі Кія.

**839** – пасольства варагаў-русаў да візантыйскага імператара Феафіла з мэтай заключэння саюза (па звестках Бярцінскіх аналаў).

**860 (866)** – сумесны марскі паход варагаў і дняпроўскіх славян на Канстанцінопаль (Царград).

**862** – “запрашэнне варагаў” па рашэнні наўгародскага веча. Усталяванне ўлады варажскіх князёў-конунгаў (Рурыка, Сінявуса, Трувора) у Ноўгарадзе, Белавозеры, Ізборску.

**862–879** – княжанне Рурыка ў Ноўгарадзе.

**862–864** – княжанне Сінявуса на Белавозеры, Трувора ў Ізборску.

**862–882** – кіраванне ў Кіеве князёў Аскольда і Дзіра.

**879–882** – княжанне Алега ў Ноўгарадзе.

**882** – паход Алега на Кіеў. Аб’яднанне Кіева і Ноўгарада.

**Гістарычныя дзеячы**

**Аскольд і Дзір** – паўлегендарныя кіеўскія князі. Па арабскіх крыніцах – славяне, апошнія прадстаўнікі дынастыі Кія, а па дадзеных “Аповесці мінулых гадоў” – варагі, дружыннікі Рурыка. На карысць скандынаўскага паходжання Аскольда і Дзіра сведчаць іх імёны. Некаторыя даследчыкі лічаць, што Аскольд – не імя, а мянушка скандынаўскага варага, або князька, скажонае ад Iskold – ‘халодны, як лёд’. Дзір – рускае вымаўленне распаўсюджанага скандынаўскага імя Цір, што азначае ‘нябесны’, імя міфічнага бога вайны. У пачатку 862 г. накіраваліся ў Візантыю, па шляху занялі Кіеў. У 882 г. былі звергнуты пераемнікам

Рурыка Алегам і пакараныя як узурпатары. Многія даследчыкі выказваюць сумневы ў тым, што Аскольд і Дзір былі сучаснікамі і адначасова княжылі ў Кіеве. Аповед пра нейкага Ал-Дзіры захаваўся ў арабскіх крыніцах і малюе яго як самага магутнага са славянскіх князёў.

**Браўлін** – наўгародскі князь, вядомы сваім паходам у Крым (першая палова IX ст.), дзе ваяваў з хазарамі, прайшоўшы “на чале раці вялікай рускай” ад Судака да Керчы. Як паведамляе “Жыціе Стэфана Суражскага”, яго дружыны захапілі грэчаскія гарады Паўночнага Прычарнамор’я – Корсунь (Херсанес), Сураж (Судак), Корчаў (Керч).

**Вадзім Храбры (Адважны)** – паўлегендарны наўгародскі князь або старэйшына, які ўзначаліў у пачатку 60-х гг. IX ст. паўстанне супраць варагаў і забіты Рурыкам разам са сваімі “дарадцамі”.

**Гастамысл** – наўгародскі старэйшына, які кіраваў у Ноўгарадзе да “прызвання варагаў”.

**Ібн-Рустэ** (канец IX – пачатак X стст.) – арабскі географ і вандроўнік, аўтар “Кнігі каштоўных скарбаў”, якая змяшчае каштоўныя дадзеныя пра народы Усходняй Еўропы, у тым ліку пра звычаі і лад жыцця славян.

**Ібн-Фадлан** – арабскі вандроўнік і пісьменнік першай паловы X ст. Склаў яркае апісанне свайго падарожжа (921–922) праз Бухару і Харэзм у Волжска-Камскую Булгарыю, у якім змяшчаецца шмат фактычнага матэрыялу аб славянах, русах і іншых народах.

**Ібн-Хордадбех** – арабскі географ (IX – пачатак X стст.), аўтар першага твора апісальнага характару “Кніга шляхоў і дзяржаў”, у якім маюцца дадзеныя аб усходніх славянах.

**Іардан** – гоцкі гісторык VI ст. Яго важнейшая праца “Аб паходжанні і справах готаў” змяшчае каштоўныя звесткі па гісторыі старажытных славян, якія дазваляюць даказаць этнагенетычную сувязь славян VI ст. і венедаў і важную ролю славян у гісторыі Візантыйскай імперыі.

**Кій** – паводле padання “Аповесці мінулых гадоў”, першы князь у палян канца VI – пачатку VII стст., легендарны заснавальнік Кіева і дынастыі кіеўскіх князёў. Вядома, што ён здзейсніў паездку ў Канстанцінопаль і быў з пашанай прыняты імператарам, як мяркуецца, Юстыніянам, заключыў з ім саюз, паводле якога абараняў дунайскія рубяжы Візантыі. На зваротным шляху Кій пабудаваў на беразе Дуная крэпасць Кіявец, але пакінуў яе і вярнуўся ў Кіеў, дзе правіў, па летапіснай легендзе, разам са сваімі братамі – Шчэкам і Харывам – і сястрой Лыбедзь.

**Крыў, Радзім, Вятка** – легендарныя родапачынальнікі племянных аб’яднанняў крывічоў, радзімічаў, вяцічаў.

**Маўрыкій Стратэг** – візантыйскі імператар, які ў канцы VI – пачатку VII стст. напісаў трактат па ваенным мастацтве “Стратэгікон”.

Галоўнае месца ў ім адводзіцца спосабам вядзення вайны са славянамі, небяспечнымі сапернікамі Візантыі. Трактат утрымлівае каштоўныя звесткі аб ваеннай і грамадскай арганізацыі славян.

**Пліній Старэйшы (24–79)** – рымскі вучоны, пісьменнік. У сваёй працы "Натуральная гісторыя" паведамляе аб венедах.

**Пракоп Кесарыйскі (канец V ст. – каля 562)** – найбуйнейшы візантыйскі гісторык. У яго важнай працы "Гісторыя войнаў" утрымліваюцца вельмі каштоўныя звесткі аб старажытных славянах – склавінах і антах.

**Рурык** – напаўлегендарны варажскі князь (?–879), па летапісным паданні – родапачынальнік рускай княжацкай дынастыі Рурыкавічаў. Звесткі аб ім маюць малаверагодны характар. Магчыма, ён быў запрошаны на княжанне адной з партый, якія ў час усобіц змагаліся за ўладу ў Ноўгарадзе. Па звестках летапісу, Рурык першапачаткова правіў у г. Ладага, затым захапіў уладу ў Ноўгарадзе, зламаўшы супраціўленне часткі наўгародцаў на чале з Вадзімам Храбрым. Некаторыя навукоўцы атаясамліваюць Рурыка з правадыром ваеннай дружыны Рэрыкам дацкім, вядомым сваімі набегамі на заходнееўрапейскія краіны (да 860).

**Рурык, Сінявус, Трувор** – па летапісных паданнях, тры браты-конунгі, правадыры варажскіх дружын, нібыта запрошаныя "з-за мора" наўгародскімі славянамі на княжанне (862). Па гэтай версіі, Рурык сеў на княжанне ў Ноўгарадзе, Сінявус – у Белавозеры, Трувор – у Ізборску. Хуткая смерць братоў (864) зрабіла Рурыка паўнаўладным кіраўніком наўгародскай зямлі. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што Сінявуса і Трувора не існавала, а звесткі аб іх – вынік няправільна прачытанага летапісцам замежнага тэксту, які паведамляе, што Рурык прыйшоў да ільменскіх славен са сваім домам (сіня-хус) і вернай дружынай (тру-вор). Летапісная легенда пра "запрашэнне" варагаў легла ў аснову нарманскай тэорыі.

**Рурыкавічы** – дынастыя князёў (кіеўскіх, уладзімірскіх, маскоўскіх) канца IX–XVI стст., нашчадкаў кіеўскага вялікага князя Ігара, які лічыўся, па летапісных звестках, сынам Рурыка. Князі гэтай дынастыі стаялі на чале Кіеўскй Русі (таму ў гістарычнай літаратуры яе часам называлі "Імперыяй Рурыкавічаў").

**Тацыт** – рымскі гісторык (I ст.), у сваёй працы "Германія" ўпершыню падае звесткі аб славянах пад імем венедаў.

**Гістарычныя паняцці**

**Абшчына, мір, верв, задруга** – форма аб'яднання людзей, заснаваная на агульным валоданні зямлёй, на суседскіх, а не на кроўнароднасных сувязях. Верв складала тэрытарыяльную адзінку, якая кіравалася агульным сходам (веча) і выбарнымі старэйшынамі. Мноства

такіх абшчын складалі воласць. Мір – аб’яднанне некалькіх родавых калектываў (з XII ст. – зборная назва сялянскай сельскай абшчыны).

**Аварскі каганат** – прымітыўная дзяржава, племянны саюз авараў, які ўзнік у 60-х гг. VI ст. у Паноніі, на Дунаі, пад уладай хана Баяна. Ажыццяўляў актыўную ваенную экспансію ў суседнія землі. Існаваў за кошт рабавання падуладных народаў і кантролю над гандлёвымі шляхамі. З канца VI ст. вёў спусташальныя напады на Візантыю. У 626 г. авары паспрабавалі захапіць Канстанцінопаль, але былі ўшчэнт разбітыя. Паражэнне з’явілася сігналам для паўстання заваяваных народаў. У 30-х гг. VII ст. ад аварскага панавання вызваліліся славяне. Аднак каганат як палітычнае аб’яднанне працягваў існаваць да канца VIII ст., калі распаўся пад ударамі франкаў.

**Авары, обры** – племянны саюз качавых (галоўным чынам цюркамоўных) плямён, згаданы ў крыніцах з сярэдзіны V ст. У сярэдзіне VI ст. яны ўварваліся ў стэпы Заходняга Прыкаспія, пазней з’явіліся ва Усходняй Еўропе. У этнічных адносінах склад аварскай арды ўключаў мангольскія і фіна-ўгорскія плямёны. Авары пакарылі балгараў і замацаваліся на Дунаі, уступіўшы ў саюзныя адносіны з Візантыяй, дзе ў 558 г. было прынята аварскае пасольства. Па намове Візантыі авары здзяйснялі рабаўніцкія напады на суседнія германскія і славянскія плямёны, збіраючы з іх даніну. Удалыя войны ўзмацнялі племянны саюз, у які ўвайшлі і заваяваныя плямёны. Пад аварскім ярмом апынуўся і анцкі саюз славянскіх плямёнаў у Прыкарпацці (дулебы, харваты, маравы). Паданне аб валадарстве авараў (у славянскіх мовах “обраў”) у часы “Іраклія цара” (візантыйскага імператара, валадарыў у 610–641 гг.) захавалася ў “Аповесці мінулых гадоў”.

**Анімізм** – вера ў існаванне душы і духаў, вера ў адухаўлёнасць з’яў навакольнага асяроддзя.

**Анты** – назва усходнеславянскіх плямёнаў, якая сустракаецца ў візантыйскіх пісьменнікаў Пракопія Кесарыйскага, Маўрыкія, гоцкага гісторыка Іардана і інш. (IV – пачатак VII стст.). Вобласць рассялення – лесастэп ад Карпат да Паўночнага Донца. Анты займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, ведалі апрацоўку жалеза, ганчарнае, ювелірнае рамяство, ткацтва, вялі гандаль з Рымскай імперыяй. Грамадская структура была заснавана на сельскай абшчыне, дзе шырока выкарыстоўвалася праца рабоў. У III–IV стст. у антаў пачаўся працэс складвання дзяржавы, які не атрымаў завяршэння. Крыніцы згадваюць імёны анцкіх князёў (“рэксаў”) – Боз, Ардагаст, Кувер, Пірагост. Анты мелі моцную ваенную арганізацыю і ў IV ст. вялі ўпартую барацьбу з гоцкай дзяржавай Германарыха і Візантыяй, а ў VI ст. – з аварамі, увайшлі ў склад Аварскага каганата. З VII ст. не згадваюцца ў крыніцах.

**“Аповесць мінулых гадоў”** – агульнарускі летапісны звод, складзены ў Кіеве ў 1113 г. манахам Кіева-Пячэрскага манастыра *Нестарам* і вядомы ў складзе Лаўрэнцьеўскага (1377 г.) і Іпацьеўскага (канец 1420-х гг.) летапісаў. Найважнейшай задачай сваёй працы Нестар лічыў высвятленне таго, “откуда есть пошла Русская земля, кто в Киеве первым княжити и как возникла Руская земля”. Пры гэтым асаблівую ўвагу Нестар надаў прапагандзе адзінства княскага дома Рурыкавічаў. Пасля ўзвядзення на кіеўскі стол Уладзіміра Манамаха (1113) летапіс дапоўніў і перапрацаваў ігумен Міхайлаўскага Выдубецкага манастыра *Сільвестр*. Ён давёў выкладанне да 1116 г., падкрэсліўшы значэнне дзейнасці Манамаха і перабольшваючы яго ролю ў падзеях канца XI – пачатку XII стст. Дапаўненні Сільвестра сцвярджалі варажскае паходжанне Русі і звязвалі яе з заходнееўрапейскімі народамі. Магчыма, гэтыя ўстаўкі тлумачыліся еўрапейскімі роднаснымі сувязямі сям’і Манамаха. У 1118 г. летапіс падвергнуўся новай перапрацоўцы, якая абгрунтоўвала сваяцтва дома Манамаха з візантыйскімі імператарамі. Нягледзячы на вядомую тэндэнцыйнасць, у цэлым “Аповесць мінулых гадоў” уяўляе найважнейшую крыніцу для вывучэння славянскага этнагенезу і сацыяльна-палітычнай гісторыі Кіеўскай Русі. Старажытнаруская гісторыя прадстаўлена ў ёй як частка сусветнай і звязана з гісторыяй славянства. На ёй грунтуецца большасць летапісных помнікаў больш позняга часу.

**Артанія, Арсанія** – вобласць Усходняй Еўропы, згаданая арабскімі географамі X ст. Аль-Джэйхані і Ібн-Хаўкаль разам з іншымі славянскімі землямі – Куявіяй (Кіевам) і Славіяй (Ноўгарадам). Адны гісторыкі атаясамліваюць Артанію з Прычарнаморскай Руссю (Тмутаракань); іншыя звязваюць яе з Разанню, якая ўзнікла ў землях мардвы, ці вобласцю вакол беларускага горада Орша. Верагодна, што Артанія, з якой, па паданні, вывозілі чорных собаляў, чорных лісіц, волава (ці свінец) і ртуць, некаторую колькасць рабоў, – месца ў Скандынавіі. Артанія, як і іншыя славянскія аб’яднанні, існавала да ўтварэння Кіеўскай Русі – у канцы VIII – першай палове IX стст.

**Бортніцтва** – здабыча мёду дзікіх пчол (ад слова “борць” – дупло дрэва), якія пасяляюцца ў дуплах дрэў. Бортніцтва было вядома ва ўсходніх славян у старажытнасці і складала значную частку іх гаспадаркі.

**Бужане** – групоўка ўсходнеславянскіх плямёнаў (саюз плямёнаў). У летапісе лакалізаваны па Бугу. З канца X ст. увайшлі ў склад Кіеўскай Русі і больш не згадваліся ў крыніцах. Шэраг даследчыкаў мяркуе, што бужане і валыняне раней называліся дулебамі.

**Варагі** – агульная назва выхадцаў са Скандынавіі (нарвежцаў, шведаў), аб’яднаных у гандлёвыя або ваенныя дружыны на чале з князямі-конунгамі-вікінгамі. Гісторыкі мяркуюць, што назва “варагі” паўстала ў

асяроддзі ўсходняга славянства, куды прыходзілі скандынаўскія атрады наймацца на службу або гандляваць. У Еўропе вядомыя як “нарманы”. Вялікімі флатыліямі яны нападалі на берагі Англіі, Францыі, Італіі, заваёўваючы і рабуючы гарады, стваралі свае дзяржавы (Нармандыя). Нападалі на суседнія землі ільменскіх славен, крывічоў, фінскія плямёны, вымушаючы іх плаціць даніну. У сярэдзіне IX ст. падпарадкаваныя паўночнаўсходнеславянскія і фіна-ўгорскія плямёны паўсталі і прагналі варагаў. Аднак у славян пачалася міжусобная барацьба, у выніку якой адбылося “прызванне” варагаў (Рурыка, Сінявуса і Трувора) на княжанне. Летапіснае апавяданне з’явілася падставай для ўзнікнення “нарманскай тэорыі”, якая тлумачыць узнікненне дзяржавы ва ўсходніх славян дзейнасцю варажскіх князёў. Славян і варагаў звязвалі не толькі вайсковыя, але і мірныя, у тым ліку гандлёвыя адносіны. Праз славянскія землі варагі вялі гандаль з арабамі і Візантыяй (невыпадкова адзін з найважнейшых еўрапейскіх гандлёвых шляхоў быў названы “шлях з варагаў у грэкі”). Як сведчаць дадзеныя археалогіі, яны сяліліся паблізу славянскіх гарадоў і пасёлкаў – “Рурыкава гарадзішча” пад Ноўгарадам, Гнёздава пад Смаленскам, Вугорскае ўрочышча пад Кіевам. Многія варажскія дружыны, несучы ваенную службу, жылі ў славянскім асяроддзі пастаянна і з цягам часу былі асіміляваны.

**Венеды, венеты, венды, вінды** – найстаражытная назва славян, зафіксаваная пісьмовымі крыніцамі. У першыя стагоддзі нашай эры іх згадваюць Тацыт, Пліній Старэйшы. Па іх дадзеных, тэрыторыя рассялення венедаў ахоплівала велізарныя прасторы ад Одэра на захадзе да Дняпра і Акі на ўсходзе і ад Балтыйскага мора на поўначы да Прыкарпацця на поўдні. Венеды займаліся земляробствам, аселай жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам. У пачатку нашай эры ўвайшлі ў сутыкненне з Рымскай імперыяй. За перамогу над імі імператар Валузіян (III ст.) атрымаў тытул “Венедскі”. Іардан (VI ст.) паведамляў, што ў яго час венеды называліся антамі і склавінамі, аднак ён пералічваў венедаў, антаў і склавінаў як асобныя групы плямёнаў. Непасрэдныя нашчадкі венедаў сталі этнічным субстратам для фарміравання ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян.

**Ваявода** – военачальнік, кіраўнік у старажытнай Русі і іншых славянскіх дзяржавах. З X ст. згадваецца ў летапісах у якасці начальніка княжацкай дружыны або народнага апалчэння.

**Ваенная дэмакратыя** – апошняя стадыя разлажэння першабытнага грамадства пры пераходзе яго ў класавую структуру. Характарызуецца моцнай уладай ваенных правадыроў у спалучэнні з рэшткамі першабытнай дэмакратыі і калектывізму ў грамадскай арганізацыі.

**Валыняне** – племянное аб’яднанне ўсходніх славян, якія жылі па абодвух берагах Заходняга Буга і ў вытоках ракі Прыпяць. Верагодна, з’яўлялася адным з аб’яднанняў, якія ўзніклі на тэрыторыі племяннога саюза дулебаў, што былі тут ужо ў VII ст. Увайшлі ў склад Кіеўскай дзяржавы ў канцы X ст. у выніку паходаў Уладзіміра Святаславіча, які падпарадкаваў Чэрвеньскую і Перамышльскую землі, населеныя валынянамі.

**Вялікае перасяленне народаў** – умоўная назва этнічных міграцый (галоўным чынам, качавых плямёнаў) на тэрыторыі Еўропы ў IV–VII стст. Непасрэдным штуршком да іх з’явілася масавае перамяшчэнне гунаў (з 70-х гг. IV ст.) на захад з Прыўралля. У ходзе вялікага перасялення адбываліся пранікненні германскіх, славянскіх, сармацкіх і іншых плямёнаў на тэрыторыю Рымскай імперыі, якія спрыялі яе крушэнню. Канчатковая фаза працэсу (VI–VII стст.) характарызавалася буйнымі перасяленнямі раннеславянскіх плямёнаў (склавінаў і антаў) на тэрыторыю Усходняй Рымскай імперыі (Візантыі) і на Балканы. Пераправіўшыся ў 577 г. праз Дунай, славяне засялілі Фракію, Македонію, частку Грэцыі, Далмацыю, Істрыю – аж да ўзбярэжжа Адрыятычнага мора, праніклі ў даліны Альп і землі сучаснай Аўстрыі. Тэрыторыя Усходняй Рымскай імперыі ад Дуная да Эгейскага мора была занятая славянамі, якія заснавалі тут пазней свае дзяржавы.

**Вяцічы** – саюз усходнеславянскіх плямёнаў у верхнім і сярэднім цячэнні ракі Акі. Паходжанне назвы спрэчнае. Па летапіснай версіі, назва ідзе ад легендарнага родапачынальніка *Вяткі*. На думку некаторых даследчыкаў – ад старажытнай назвы славян “*венды*”. У сярэдзіне X ст. увайшлі ў склад Кіеўскай Русі. З XII ст. – у складзе Чарнігаўскага, Растова-Суздальскага і Разанскага княстваў.

**Гарадзішча, грады** – цэнтры славянскіх паселішчаў. Слова сустракаецца ў летапісах пачынаючы з XII ст. Грады размяшчаліся на высокіх берагах рэк ці ўзвышшаў. Уяўлялі сабой трохвугольныя, круглыя ці прамавугольныя пляцоўкі, звычайна абароненыя натуральнымі рубяжамі. Умацоўваліся равамі, землянымі валамі, часам бярвеністымі сценамі. Забяспечвалі абарону навакольнага насельніцтва ад нападаў, былі цэнтрамі рамёстваў.

**Драўляне** – усходнеславянскае племянное аб’яднанне, займала тэрыторыю Палесся па правым беразе Прыпяці, па цячэнні рэк Цецярук, Уж, Убарць, Ствіга. Гранічылі з бужанамі, валынянамі, дрыгавічамі. Галоўны горад – Іскарасцень. Доўга супраціўляліся ўключэнню ў склад Кіеўскай дзяржавы. Былі абкладзены данінай Алегам (883), але пасля яго смерці паднялі паўстанне (912) і перасталі плаціць даніну. Яе аднавіў князь Ігар, які спрабаваў падпарадкаваць драўлян, быў забіты па загадзе

драўлянскага князя Мала (945). Удава Ігара Вольга жорстка расправілася з драўлянамі, знішчыўшы мясцовую знаць і аддаўшы агню іх гарады. Зямля драўлян увайшла ў кіеўскі ўдзел з цэнтрам у горадзе Оўруч (Вручий). Імя драўлян апошні раз сустракаецца ў летапісе пад 1136 г., калі іх зямля была падорана кіеўскім князем Яраполкам Дзесяціннай царкве.

**Дрыгавічы** – племяннное аб’яднанне ўсходніх славян, размешчанае паміж Прыпяццю і вярхоўямі Заходняй Дзвіны. Мелі сваё княжанне з цэнтрам у горадзе Тураў на Прыпяці. З X ст. у складзе Кіеўскай Русі. Іх тэрыторыя стала пазней асновай Тураўскага княства.

**Дулебы** – найстаражытнае ўсходнеславянскае племя, племянны саюз на тэрыторыі Заходняй Валыні, вядомы як анцкі (дулебы, харваты, маравы). У VII ст. быў падпарадкаваны аварамі. У 907 г. дружына дулебаў удзельнічала ў паходзе кіеўскага князя Алега на Царград. У X ст. аб’яднанне распалася, і дулебы ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі. У “Аповесці мінулых гадоў” згадваюцца як валыняне і бужане.

**Дым** – найстаражытная адзінка падаткавага абкладання (“падымнае”), памеры якой вар’іраваліся. Атаясамлівалася з індывідуальнай сялянскай гаспадаркай (двор, ачаг, дым). Існавала на Русі ў IX–XIV стст.

**Ільменскія славены** – адно з самых буйных славянскіх аб’яднанняў, размешчанае на ўзбярэжжы возера Ільмень і ў басейне рэк Волхаў, Ловаць, Малога. Старажытнае паселішча – гарадзішча Старая Ладага (VII–VIII стст.). Пазней паўсталі Ноўгарад і Старая Руса. Суседнічалі з фіна-ўгорскімі плямёнамі (чудзь, мера, весь) і разам з імі ў пачатку IX ст. утварылі племянны суперсаюз – Славію. Пра ільменскіх славен летапіс згадвае ў сувязі з апавяданнем пра запрашэнне варагаў (862). Тэрыторыя ільменскіх славен стала пазней ядром Наўгародскай рэспублікі.

**Каган, хакан** (“хан ханаў”) – тытул вярхоўнага кіраўніка шматплемяннoй дзяржавы (каганата) у старажытных цюркскіх народаў – авараў, печанегаў, хазар і ўсходніх славян. У час барацьбы за вызваленне палян ад хазар у канцы IX – пачатку X стст. быў прыняты кіеўскімі князямі, што падкрэслівала незалежнасць Русі ад Хазарскага каганата. Арабскія пісьменнікі згадваюць “Рускі каганат” з цэнтрам у Кіеве. Гэты тытул кіраўнікі Русі захоўвалі да XII ст.

**Капішча** – паганскае свяцілішча, культавы будынак ва ўсходніх славян, месца здзяйснення рэлігійных абрадаў. Лічылася месцам знаходжання бажаства. Звычайна размяшчалася пад адкрытым небам, у святым лесе або на гары, часам было акружана валам і ровам. Для прынясення ахвяр (у выглядзе прадуктаў сельскай гаспадаркі або жывёл) звычайна прызначаўся велізарны камень з нанесенымі магічнымі знакамі. Звычайна ў цэнтры стаяў ідал, над якім на слупах размяшчаўся

двухсхільны навес з упрыгожаннямі. Згадваецца ў “Слове пра закон і благадаць” мітрапаліта Іларыёна. Вядомыя па археалагічных раскопках у Кіеве і пад Ноўгарадам.

**Крывічы** – адно з найбуйнейшых аб’яднанняў усходняга славянства, якое займала вобласці ў вярхоўях Дняпра, Заходняй Дзвіны і Волгі. Галоўныя гарады – Полацк, Ізборск, Смаленск. У IX ст. былі ўключаны ў склад Кіеўскай Русі. У XI–XII стст. тэрыторыя крывічоў увайшла ў склад Смаленскага і Полацкага княстваў, паўночна-заходняя частка – у склад Наўгародскай зямлі. Племянную назву звязваюць з імем міфічнага родапачынальніка крывічоў Крыва або з літоўскім найменнем вярхоўнага жраца Крыве-Крывейта.

**Куявія, Куяба** – па звестках арабскіх географаў, адзін з цэнтраў старажытнай Русі, якія папярэднічалі Кіеўскай дзяржаве. Па дадзеных аль-Джэйхані, існаваў у IX ст. Большасць гісторыкаў звязваюць яго з Кіевам.

**Легенда аб прызванні варагаў** – летапіснае паведамленне, змешчанае ў “Аповесці мінулых гадоў” пад 862 г. (датаванне спрэчнае) аб запрашэнні ільменскімі славянамі, крывічамі і фінскімі плямёнамі (чудзь, весь, мера) па рашэнні веча на княжанне ў Ноўгарад варагаў Рурыка, Сінявуса і Трувора. Дакладнасць гэтага паведамлення, якое стала асновай для ўзнікнення “нарманскай тэорыі”, ставіцца навукоўцамі пад сумнеў і разглядаецца як больш позняя аплікацыя (устаўка) у першапачатковы летапісны тэкст. Гэтая звестка была ўнесена, відаць, для процідзеяння імкненню Візантыі навязаць Русі палітычную залежнасць разам з падначаленнем царквы Канстанцінопальскаму патрыярхату ці для абгрунтавання заняцця насуперак лесвічнаму прынцыпу ў 1113 г. кіеўскага стала Уладзімірам Манамахам, якога запрасілі на княжанне кіяўляне.

**Нарманская тэорыя** – адна з версій, якая тлумачыць прычыны і абставіны ўзнікнення дзяржавы ва ўсходніх славян. Заснавана на летапіснай легендзе пра “прызванне варагаў”. Яе прыхільнікі (“нарманісты”) звязваюць узнікненне старажытнарускай дзяржавы з дзейнасцю варажскіх князёў, не заўсёды ўлічваючы іншыя фактары. Была ўпершыню сфармулявана ў XVIII ст. расійскімі гісторыкамі нямецкага паходжання Баерам, Мілерам і Шлёцэрам. Першым супраць яе выступіў М.В. Ламаносаў.

**Паляне** – усходнеславянскі племянны саюз VI–IX стст., які займаў тэрыторыю па сярэднім цячэнні Дняпра ад Прыпяці да Росі. Паходжанне этноніма “паляне” летапісец тлумачыць тым, што яны “ў полі седоху”. Цэнтр аб’яднання – Кіеў. Тэрыторыя палян з’явілася асноўным ядром стварэння старажытнарускай дзяржавы.

**Племя** – сукупнасць некалькіх радавых абшчын, якія маюць агульную тэрыторыю, гаспадарку, звычаі, культы, арганізацыю кіравання,

племянны савет (веча), правадыроў, старэйшын. Усходнеславянскія плямёны, паводле “Аповесці мінулых гадоў”, жылі “кожны са сваім родам і на сваіх месцах, валодаючы кожны родам сваім”.

**Племянныя саюзы** – тэрытарыяльна-ваенныя федэрацыі некалькіх плямёнаў (часам некалькіх дзясяткаў плямёнаў), аб’яднаных агульнымі гаспадарчымі задачамі і неабходнасцю барацьбы са знешняй небяспекай. Ва ўсходніх славян працэс іх утварэння інтэнсіўна працякаў у эпоху рассялення з VI ст. Найбольш раннім са славянскіх племянных саюзаў з’яўляўся Прыкарпацкі (анцкі) на чале з дулебамі або валынянамі, які склаўся ў перыяд іх барацьбы з аварамі. Сляды існавання буйных племянных аб’яднанняў задоўга да ўтварэння дзяржавы захавала “Аповесць мінулых гадоў”, якая называе 15 племянных саюзаў. Гэтыя аб’яднанні носяць як племянныя (дулебы, радзімічы, вяцічы), так і тэрытарыяльныя назвы (палачане, бужане, дрыгавічы, драўляне). Летапісец называе пералічаныя плямёны “княжаннямі”, паколькі на чале племяннога саюза стаяў князь, які кіраваў з дапамогай савета і веча. Саюзы плямёнаў прынята лічыць пераходнай формай ад родаплемяннай грамадскай арганізацыі да дзяржавы.

**“Шлях з варагаў у грэкі і з грэк па Дняпры”** – сістэма рачных шляхоў у старажытнай Русі, якія злучалі Чорнае мора з Балтыйскім. Яго агульная працягласць (ад вусця Нявы да вусця Дняпра) складала прыблізна 2200 км. Пісьмовыя і археалагічныя дадзеныя сведчаць аб вялікім значэнні гэтых гандлёвых шляхоў у гісторыі славян. Менавіта па іх паўсталі найстаражытныя рускія гарады: Ладага, Ноўгарад, Старая Руса, Смаленск, Любеч і інш. На лодках-аднадрэўках рускія купцы везлі ў Візантыю пушніну, палатно, мёд і воск, рабоў. З поўдня, уверх па Дняпры, увозілі віно, вострыя прыправы, садавіну, дарагі посуд і ювелірныя вырабы. У XI–XII стст. у сувязі з драбленнем Русі і крыжовымі паходамі, што ўстанавілі сувязь з Усходам праз Міжземнае мора, гэты шлях страціў сваё значэнне. Яго апісанне маецца ў “Аповесці мінулых гадоў” і ў візантыйскага імператара Канстанціна Багранароднага (сярэдзіна X ст.).

**Радзімічы** – усходнеславянскі племяны саюз, які размяшчаўся ва ўсходняй частцы верхняга Падняпроўя, па рацэ Сож і яе прытоках. З сярэдзіны IX ст. радзімічы плацілі даніну хазарам. У 885 г. князем Алегам былі далучаны да Кіеўскай Русі. Канчаткова страцілі самастойнасць у 984 г., калі іх войска было разбіта на рацэ Пішчане ваяводам князя Уладзіміра Воўчы Хвост. Пазней іх тэрыторыя ўвайшла ў склад Чарнігаўскага і збольшага Смаленскага княстваў.

**Рала** – прылада земляробства, блізкая да прымітыўнага плуга. Рала з жалезным наканечнікам вядома ва ўсходніх славян у I тысячагоддзі н.э.

**Род** – калектыў кроўных сваякоў, якія вядуць паходжанне ад агульнага продка і носяць агульнае радавое імя.

**Русь** – руская зямля, назва народа і дзяржавы ўсходніх славян з цэнтрам у Сярэднім Падняпроўі. Паходжанне гэтага тэрміна гісторыкі-нарманісты звязваюць з летапіснай легендай аб прызванні варажскіх конунгаў з племені русь, якія прыйшлі княжыць у Ноўгарад. Вярцінскія аналы пад 839 г. называюць русь, прадстаўнікі якой гавораць на мове “свеваў” – шведаў. З гэтага вынікае, што назва дзяржавы і народа мае не славянскае, а скандынаўскае паходжанне. Аргументацыя праціўнікаў (антынарманістаў) заснавана на тым, што пра “русаў” і “Русь” паведамляюць арабскія і візантыйскія крыніцы VI–VIII стст. У тэксце летапісу таксама ўказваецца на сувязь “русі” з княжаннем палян. Некаторыя лінгвісты лічаць, што карані “рус” і “рос” паўсталі ў эпоху славянскай моўнай агульнасці, г.зн. значна раней прызвання варагаў.

**Севяране** – саюз усходнеславянскіх плямёнаў, які займаў землі па рэках Дзясна, Сейм, Сула і іх прытоках. Заходнімі суседзямі севяран былі паляне і дрыгавічы, паўночнымі – радзімічы і вяцічы. Усходнія і паўднёвыя межы севяран, якія ляжалі па ўскраіне стэпаў, занятых качэўнікамі, не былі пастаяннымі; часам яны дасягалі вярхоўяў Паўночнага Донца. У VIII – пачатку IX стст. севяране плацілі даніну хазарам. Каля 865 г. увайшлі ў склад Кіеўскай Русі.

**Склавіны** – у пісьменнікаў VI ст. назва адной з груп славянскіх плямёнаў на паўночных межах Візантыі. Па звестках Іардана, засялялі землі на поўначы да ракі Віслы, на ўсходзе да ракі Днястра, на захадзе да сярэдняга цячэння ракі правага прытока Дуная Савы. З пачатку VII ст. (пасля таго як імя антаў, разгромленых аварамі, перастала згадвацца ў крыніцах) склавіны сустракаюцца як зборная назва славян наогул. Яно захавалася ў назве Склавініі, якое ў візантыйскіх крыніцах абазначае вобласць Пелапанеса і Македоніі, густа заселеных славянамі.

**Славія** – назва вобласці Русі ў арабскіх аўтараў X ст. Па паведамленнях Ібн-Хаўкаля, гэта галоўная, “самая вышэйшая з іх, называюць (яе) ас-Славія, і цар іх у горадзе С. ла (Сала)”. Гісторыкі атаясамліваюць Славію з тэрыторыяй ільменскіх славен, а горад Сала – з Ноўгарадам або папярэднім яму пасяленнем.

**Татэмізм** – першабытны культ, звязаны з уяўленнямі аб сваяцтве паміж групамі людзей (звычайна родамі) з татэмамі – відамі жывёл, раслін (радзей з’явамі прыроды і неадушаўлёнымі прадметамі). Кожны род насіў імя свайго татэма, яго нельга было забіваць і ўжываць у ежу.

**Улічы** – адно з племянных аб’яднанняў усходніх славян, якія рассяляліся па ніжнім цячэнні Дняпра, па Бугу і на берагах Чорнага мора. Вялі ўпартую барацьбу з кіеўскімі князямі за сваю самастойнасць. На

працягу трох гадоў іх галоўны горад Перасячэнь быў у аблозе кіеўскага ваяводы Свенельда (каля 940). У сярэдзіне X ст. былі ўключаныя ў склад Кіеўскай дзяржавы. Пад націскам качэўнікаў адышлі на поўнач. Апошняя згадка ў летапісе адносіцца да сярэдзіны X ст.

**Ціверцы** – адно з усходнеславянскіх племянных аб'яднанняў. Займалі тэрыторыю паміж Днястром, Прутам і Дунаем на поўдні да Чарнага мора. У 907 г. і ў 944 г. прымалі ўдзел у паходах на Візантыю. У сярэдзіне X ст. увайшлі ў склад Кіеўскай Русі. Пад націскам печанегаў і полаўцаў у XII ст. адышлі на поўнач, дзе паступова змяшаліся з мясцовым насельніцтвам.

**Фетышызм** – культ неадушаўлёных прадметаў – фетышаў, надзеленых, па прадстаўленні вернікаў, звышнатуральнымі ўласцівасцямі.

**Хазарскі каганат** – дзяржаўнае ўтварэнне, якое ўзнікла ў сярэдзіне VII ст. на чале з каганам. Сталіца – Семендэр, з пачатку VIII ст. – Іціль у вусці Волгі. Уключаў тэрыторыі Паўночнага Каўказа, Прыазоўя, большую частку Крыма, стэпавыя і лесастэпавыя тэрыторыі да Дняпра. З VII ст. каганат варагаваў з Візантыяй, пагражаючы яе валадарству ў Прычарнамор'і. У залежнасці ад хазар знаходзіліся суседнія са стэпам славянскія плямёны (паляне, северане, вяцічы, радзімічы), якія плацілі даніну хазарам "з дыму" грашыма і пушнінай. Вызваленне ад хазарскага прыгнёту "Аповесць мінулых гадоў" звязвае з паходамі князя Святаслава (965 г.).

**Хазары** – цюркамоўны народ, які з'явіўся ва Усходняй Еўропе каля IV ст. пасля нашэсця гунаў і качаваў у раёне Каспія. Сфарміраваліся ў выніку ўзаемадзеяння трох этнічных кампанентаў: мясцовага іранамоўнага насельніцтва, прышлых цюркскіх і фіна-вугорскіх плямён. У сярэдзіне VII ст. хазары ўтварылі дзяржаву (каганат), якая ўяўляла федэрацыю многіх плямёнаў. У Хазарыі адбываўся частковы пераход да аселасці, развівалася сельская гаспадарка і феадальныя адносіны, існавала хатняе рабства. Да VIII ст. хазары былі ідалапаклонцамі, у канцы стагоддзя частка хазар на чале з правячымі родамі прыняла іўдаізм. Пасля разгрому каганату ў X ст. хазары як самастойны этнас зніклі, растварыўшыся сярод іншых качэўнікаў.

# ТЭСТЫ

1. Іардан і Пракопій Кесарыйскі згадвалі ў сваіх творах:
   а) печанегаў, хазар, полаўцаў;
   б) дулебаў, бужан, валынян;
   в) венедаў, антаў, склавінаў;
   г) крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў.

2. Візантыйскі імператар-гісторык, аўтар "Стратэгікона":
   а) Герадот;
   б) Іардан;
   в) Пліній;
   г) Маўрыкій.

3. Патрыярх Фоцій, Канстанцін Багранародны, Леў Дыякан – гэта:
   а) візантыйскія гісторыкі;
   б) рускія летапісцы;
   в) славянскія асветнікі;
   г) аўтары славянскай азбукі.

4. Канстанцін Багранародны з'яўляецца аўтарам:
   а) "Аб кіраванні імперыяй";
   б) "Аповесці мінулых гадоў";
   в) "Берцінскіх аналаў";
   г) "Велесавай кнігі".

5. Манах Кіева-Пячэрскай лаўры Нестар з'яўляеца аўтарам:
   а) "Рускай праўды";
   б) "Аповесці мінулых гадоў";
   в) "Аб законе і благадаці";
   г) "Павучанне дзецям".

6. Па загадзе Уладзіміра Манамаха "Аповесць мінулых гадоў" рэдагаваў:
   а) Анастас Карсунянін;
   б) Мітрапаліт Іларыён;
   в) Манах Сільвестр;
   г) Клімент Смаляціч.

7. Укажыце на лішняе: Крыніцай для "Аповесці мінулых гадоў" з'яўляецца:
   а) Біблія;
   б) Хроніка Георгія Амартола;

в) Дагаворы Русі з Візантыяй;
г) “Велесава кніга”.

8. “Сага аб Эйдмундзе” забойцам Барыса падае:
а) Рурыка;
б) Святаполка Акаяннага;
в) Яраслава Мудрага;
г) Уладзіміра Святога.

9. Славяне адносяцца да моўнай сям’і:
а) каўказскай;
б) урала-самадыйскай;
в) індаеўрапейскай;
г) алтайскай.

10. Паганства – гэта:
а) рэлігія, у якой існуе адзін бог;
б) рэлігійны абрад;
в) рэлігійны ідал;
г) рэлігія, у якой існуе шмат багоў.

11. Бог грому і маланкі ва ўсходніх славян:
а) Ярыла;
б) Стрыбог;
в) Вялес;
г) Пярун.

12. Славянскае племя ў сярэднім цячэнні Дняпра, галоўным горадам якога стаў Кіеў – гэта …?
а) крывічы;
б) паляне;
в) вяцічы;
г) дрыгавічы.

13. Старажытная ворыўная прылада ўсходніх славян называлася:
а) барана;
б) саха;
в) серп;
г) сякера.

14. Галоўным заняткам усходніх славян было:
   а) бортніцтва;
   б) збіральніцтва;
   в) паляванне;
   г) земляробства.

15. Першая вядомая пісьмовая згадка пра “Русь” змешчана ў:
   а) Берцінскіх аналах;
   б) Аповесці мінулых гадоў;
   в) Рускай праўдзе;
   г) Полацкім летапісе.

16. Атрад воінаў, якія аб’ядноўваліся вакол ваеннага правадыра і складалі прывілегіяваную частку грамадства, называецца:
   а) дружына;
   б) дзяржава;
   в) княжанне;
   г) апалчэнне.

17. Паводле “Аповесці мінулых гадоў”, даніну мячамі заплацілі хазарам:
   а) ільменскія славены;
   б) вяцічы;
   в) паляне;
   г) севяране.

18. Натуральны або грашовы збор з заваяваных плямёнаў і народаў:
   а) торг;
   б) паншчына;
   в) чынш;
   г) даніна.

19. Легендарны палянскі правадыр, заснавальнік княскай дынастыі:
   а) Іардан;
   б) Кій;
   в) Рурык;
   г) Сільвестр.

20. Найбуйнейшы ўсходнеславянскі племянны саюз у Падзвінні і Верхнім Падняпроўі:
   а) паляне;
   б) славяне ільменскія;
   в) дулебы;
   г) крывічы.

21. Субстратам для беларусаў, рускіх і ўкраінцаў сталі адпаведна:
    а) балты; фіна-угры; іранцы і цюркі;
    б) германцы; балты; печанегі;
    в) венеды; анты; склавіны;
    г) палачане; крывічы; паляне.

22. Якое з дадзеных плямёнаў не адносіцца да фіна-ўгорскіх:
    а) мурама;
    б) весь;
    в) мера;
    г) літва.

23. Сярод назваў гэтага горада пакажыце лішнюю:
    а) Царград;
    б) Рым;
    в) Канстанцінопаль;
    г) Візантый.

24. Князь ў справах кіравання абапіраўся ў першую чаргу на:
    а) царкву;
    б) ваяводаў;
    в) дружыну;
    г) замежныя наёмныя атрады.

25. Веча – гэта:
    а) спадчыннае зямельнае валоданне;
    б) месца збору даніны;
    в) збор князем даніны;
    г) усеагульны народны сход.

26. Дзяржава Волжская Булгарыя была створана:
    а) цюркскімі плямёнамі;
    б) фіна-ўгорскімі плямёнамі;
    в) іранскімі плямёнамі;
    г) славянскімі плямёнамі.

27. Прыкметай дзяржавы не з’яўляецца:
    а) дзяленне на асобныя плямёны;
    б) адзіная тэрыторыя;
    в) адзіныя законы;
    г) адзіная сістэма кіравання.

28. Гастамысл – гэта:
    а) легендарны наўгародскі старэйшына;
    б) правадыр крывічоў;
    в) заснавальнік дынастыі Рурыкавічаў;
    г) бацька Вадзіма Храбрага.

29. Радзім і Вятка – гэта:
    а) заснавальнікі Полацка;
    б) паганскія валхвы;
    в) правадыры радзімічаў і вяцічаў;
    г) наўгародскія баяры.

30. Лыбедзь была сястрой:
    а) Ляха, Руса, Чэха;
    б) Кія, Шчэка, Харыва;
    в) Рурыка, Сіявуса і Трувора;
    г) Аскольда і Дзіра.

31. Усходнеславянскі племянны саюз у басейне р. Волхаў:
    а) чудзь;
    б) ільменскія славяне;
    в) паляне;
    г) русь.

32. Дзе размяшчаліся драўляне?
    а) Пабужжа;
    б) Падзвінне;
    в) Верхняе Падняпроўе;
    г) Правабярэжжа Прыпяці.

33. Суаднясіце гістарычныя паняцці:

| | |
|---|---|
| А. Паляне | 1) Тураў |
| Б. Драўляне | 2) Полацк |
| В. Ільменскія славяне | 3) Ноўгарад |
| Г. Палачане | 4) Кіеў |

34. Суаднясіце гістарычныя паняцці:

| | |
|---|---|
| А. Паляне | 1) Кій |
| Б. Драўляне | 2) Гастамысл |
| В. Ільменскія славяне | 3) Рагвалод |
| Г. Палачане | 4) Тур |

35. Ці правільныя наступныя выказванні?
А. Ідал – гэта назва аднаго з багоў усходніх славян.
Б. Жрацы ва ўсходніх славян называліся валхвамі.
1) дакладна толькі А;
2) дакладна толькі Б;
3) абодва меркаванні няслушныя;
4) правільныя абодва меркаванні.

36. Ці правільныя наступныя выказванні?
А. Кімерыйцы, скіфы, сарматы – гэта іранамоўныя індаеўрапейскія плямёны Паўночнага Прычарнамор’я.
Б. Фіна-ўгры не ўдзельнічалі ў этнагенезе ўсходніх славян.
1) дакладна толькі А;
2) дакладна толькі Б;
3) абодва меркаванні няслушныя;
4) правільныя абодва меркаванні.

# Модуль 2. Кіеўская Русь

**Лекцыйны курс**

**Кіеўская Русь – найбуйнейшае тэрытарыяльна-дзяржаўнае ўтварэнне Усходняй Еўропы.** ***Сутнасць Кіеўскай Русі як дзяржавы.*** Племянныя федэрацыі, якія ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі, з'яўляліся не толькі этнічнымі, але і палітычнымі структурамі з пэўнай аўтаноміяй. Нягледзячы на тое, што дзяржава будавалася па тэрытарыяльным прынцыпе, яе часткі захавалі ўстойлівыя родаплемянныя межы. Палітычны манапалізм Кіева быў вельмі адносным. Кіеўская дзяржава з моманту ўзнікнення насіла поліэтнічны характар, у яе склад уваходзіла больш за дваццаць народаў, якія знаходзіліся ў розных формах данніцкай залежнасці ад Кіева.

У літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў замацавалася меркаванне, што Кіеўская Русь развівалася аналагічна заходнееўрапейскай мадэлі. Сапраўды, старажытнарускае грамадства ўяўляла сабой частку сучаснай яму Еўропы і дэманстравала тэндэнцыі, характэрныя для станаўлення еўрапейскай цывілізацыі. Кіеўская дзяржава будавалася на аснове заходняга інстытута васалітэту, які надаваў васалу пэўную аўтаномію. Кіраўніком дзяржавы быў *вялікі князь*, які паходзіў з роду Рурыкавічаў. Вышэйшы слой грамадства складалі яго *васалы*, абавязаныя ваеннай службай. Адначасова яны выступалі сюзерэнамі на "сваёй" тэрыторыі: мелі менш знатных васалаў, валодалі правам ад'езду да іншага сюзерэна.

Разам з тым, у адрозненне ад варварскіх дзяржаў Заходняй Еўропы, якія ўваходзілі ў зону ўплыву антычнай цывілізацыі і ў сваім станаўленні атрымалі ў спадчыну шматлікія дзяржаўна-прававыя традыцыі антычнасці, Усходняя Еўропа апынулася на перыферыі антычнай айкумены. Мабыць, гэтым можна тлумачыць параўнальна павольныя тэмпы выспявання дзяржаўных інстытутаў, іх архаічнасць і своеасаблівасць. У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, для якіх быў характэрны сацыяльна-эканамічны сінтэз антычнасці і варварства, у славянскіх краінах пераход да феадалізму здзяйсняўся "бяссінтэзным" шляхам, на аснове трансфармацыі першабытнаабшчынных адносін, а таму запаволена. Больш доўгім быў і працэс адпаведнага структуравання грамадства.

У Кіеўскай Русі панавала калектывісцкая мадэль сацыяльнай структуры. Асноўнай ячэйкай грамадскага ўладкавання была абшчына. Найбольшае значэнне мелі *родавыя карпарацыі знаці* (былі заснаваны на індывідуальнай зямельнай уласнасці, вотчыне) і *тэрытарыяльныя абшчыны свабодных сялян* (заснаваныя на калектыўнай форме ўласнасці). Абшчына на Русі мела як ўсходнія, так і заходнія рысы, абумоўленыя дваістасцю эксплуатацыі тэрыторыі: палі і лугі ў прыватнай уласнасці; лясы, выганы, вада ў абшчынным валоданні. Асаблівай усходняй

прыкметай з’яўлялася кругавая парука, кампанентам заходняга развіцця выступала наяўнасць рабства хатняга (патрыярхальнага) варыянта. Акрамя сельскай абшчыны, у гарадах таксама існавалі абшчыны рамеснікаў: гарбароў, ювеліраў, кавалёў і інш. Царкоўная абшчына аб’ядноўвала ўсіх вернікаў (і знаць, і простых земляробаў і гараджан). Гэтая замкнёная шматфункцыянальная сацыяльная сістэма арганізоўвала ўсе віды дзейнасці чалавека: працоўную, сямейную, культавую. Калектывісцкая (абшчынная) ментальнасць іграла вялікую ролю ва ўсіх сферах. Калі чалавек апынаўся за межамі абшчыны, то губляў сацыяльную абарону і ператвараўся ў *ізгоя*.

Абшчынны лад адбіваўся і на характары ўлады, вызначаючы прынцыпы яе атрымання ў спадчыну. Носьбітам вярхоўнай улады з’яўляўся не канкрэтны князь, а *княскі род*. Князь быў толькі часовым уладальнікам улады, якая перадавалася старэйшаму ў родзе. Дзяржава ў літаральным сэнсе будавалася на прынцыпах грамадскай дамовы насельніцтва зямель і княжацкай улады, які прадугледжваў узаемныя абавязкі. Дэмакратычным, калектыўным органам кіравання выступала *веча*, якое валодала шырокімі паўнамоцтвамі. Яно ведала пытаннямі вайны і міру, брала ўдзел у абмеркаванні заканадаўства, распараджалася княжацкім сталом, зямельнымі і фінансавымі рэсурсамі воласці, змяшчала адміністрацыю. Кіруючыя колы Кіеўскай дзяржавы не валодалі неабходнымі сродкамі для яго падпарадкавання.

Адной з асаблівасцяў сацыяльна-палітычнай арганізацыі Кіеўскай Русі было ўсеагульнае ўзбраенне народа. *Народнае апалчэнне,* падначаленае не князю, а вечу, функцыянавала разам з княскай дружынай. Фактарам яго ваеннай актыўнасці была пастаянная пагроза нападаў качэўнікаў. У той жа час народ, які выступаў як вырашальная ваенная сіла, усведамляў сваё значэнне ў старажытнарускім грамадстве.

Такім чынам, раннефеадальная Кіеўская дзяржава выяўляла як заходнія (развіццё эканомікі па шляху феадалізму, інстытут васалітэту), так і ўсходнія (карпаратыўны характар сацыяльных сувязей) тэндэнцыі развіцця. Іх суадносіны шмат у чым вызначаліся становішчам сярэднявечнай Русі ў геапалітычнай прасторы Усходняй Еўропы. Відазмяняючы свае палітычныя формы, Кіеўская Русь праіснавала аж да 30-х гг. XIII ст. Саслабленая феадальнай барацьбой, сацыяльнымі канфліктамі і рухам падуладных народаў, яна ўпала пад ўдарамі мангольскай Арды.

***Утварэнне Кіеўскай Русі. Князь Алег.*** У другой палове IX ст. ва Усходняй Еўропе склалася старажытная дзяржава ўсходніх славян. Гэты працэс завяршыўся ў 882 г. аб’яднаннем Кіева і Ноўгарада, і гэтую падзею летапіс звязаў з імем Алега. Межы яго ўладанняў на поўдні месцамі даходзілі да Чорнага (Рускага) мора, а на поўначы – да Балтыкі. Гэтую

велізарную дзяржаву (каганат) пазней сталі называць Кіеўскай Руссю, паколькі Кіеў быў сталіцай гэтай дзяржавы і па праве лічыўся “маці гарадоў рускіх”. Мяккі спрыяльны клімат, чарназёмныя глебы, выдатныя пашы садзейнічалі яго ўзвышэнню. Кіеў займаў цэнтральнае становішча сярод усходнеславянскіх зямель, знаходзячыся ўдалечыні ад ваяўнічых варагаў і бліжэй да Візантыі, якая з’яўлялася тады сусветным палітычным і культурным цэнтрам. Размяшчаючыся на памежжы лесу і стэпу, ён быў заслонены ад набегаў качэўнікаў “вялікім борам”. Выгаднае геаграфічнае становішча Кіева заключалася і ў тым, што да яго сыходзіліся шматлікія рачныя шляхі Падняпроўя. Яны злучалі княства палян з чатырма найбуйнейшымі племяннымі саюзамі – крывічоў (па Дняпры), радзімічаў (па Сожы), дрыгавічоў (па Бярэзіне і Прыпяці), севяран (па Дзясне). Праз кіеўскія землі па Дняпры праходзіў і вялікі водны шлях “з варагаў у грэкі”. На працягу IX–XI стст. адбываўся інтэнсіўны працэс пашырэння межаў Кіеўскай Русі, вызначалася суцэльная тэрыторыя дзяржавы, на якую распаўсюджвалася паняцце “Руская зямля”.

Алег адразу ж стаў умацоўваць сваю ўладу ў новай сталіцы. Яшчэ на шляху ў Кіеў ён падпарадкаваў Смаленск і Любеч і пакінуў там сваіх ваяводаў. Пры ім быў узведзены шэраг крэпасцей на стэпавым памежжы, абкладзены данінай ільменскія славены, крывічы і мера, накладзены пастаянныя грашовыя выплаты на Ноўгарад. Менавіта Алег пачаў падпарадкаванне драўлян, севяран, радзімічаў. Драўляне, якія, паводле “Аповесці мінулых гадоў”, з’яўляліся даўнімі ворагамі Кіева, “крыўдзілі палян”. Пад 883 г. летапіс паведамляе пра тое, як Алег, “примучив древлян”, усклаў на іх даніну. У наступным годзе перамог севяран, усклаў на іх ”даніну лёгкую” і вызваліў ад падпарадкавання хазарам. Затым Алег накіраваў паслоў да радзімічаў, падпарадкаваным хазарам, з прапановай: “Не давайце хазарам, але плаціце мне”, на што радзімічы пагадзіліся. Няцяжка заўважыць, што палітыка Алега была даволі гнуткай. У дачыненні да непрымірымых ворагаў ён ўжываў ваенны ціск. З іншымі ўсталяванне ўлады Алег ажыццяўляў пад сцягам вызвалення іх ад валадарства хазар.

У 80-х гг. IX ст. Алег вёў з хазарамі вайну, у якой, згодна з паведамленнем усходніх крыніц, яго саюзнікамі былі печанегі, хазары ж выступалі ў саюзе з качэўнікамі-мадзьярамі (уграмі). “Аповесць мінулых гадоў” паведамляе пра вайну Алега з ціверцамі і улічамі, якія, верагодна, падтрымлівалі хазар. Яшчэ ў 30-х гг. угры, якія ўладкаваліся паміж Дняпром і Днястром, неаднаразова трывожылі Кіеў і іншыя славянскія вобласці. Верагодна, руска-хазарская вайна скончылася перамогай кіеўскага князя. Да канца праўлення Алега яму падпарадкаваліся белыя харваты, улічы і ціверцы.

Старажытнаруская дзяржава ўзнікла і развівалася як этнічна неаднароднае аб'яднанне, у якім этнічныя і дзяржаўныя межы не супадалі. Неславянскія этнасы, якія ўвайшлі ў яго склад (летапісныя чудзь, мера, весь, мурама), сталі састаўнымі часткамі Кіеўскай Русі, насельніцтва асімілявана, землі былі каланізаваны славянамі, і на іх паўсталі гарады Разань, Мурам, Суздаль і інш. Кіеўская дзяржава будавалася зусім не на прынцыпах роўнасці плямёнаў. Пануючае становішча ў ёй займала княства палян, што ставіла кіеўскага князя значна вышэй за мясцовых князёў, якія былі ў яго "пад рукой". Пацвярджэнне гэтаму ўтрымліваецца ў дагаворы Алега з Візантыяй, заключаным ад імя "вялікага князя" кіеўскага і "вялікіх", "светлых" князёў, "пад Алегам існых".

Дзяржава, створаная Алегам, была своеасаблівым палітычным утварэннем. Яна з'ўлялася федэрацыяй племянных княстваў і непасрэдна падпарадкаваных кіеўскаму вялікаму князю тэрыторый. Кіеўскаму князю ("кагану") падпарадкоўваліся і мясцовыя князі, і племянная знаць. Ад іх імя дзейнічаў вялікі князь у знешнепалітычных акцыях. На першых этапах мясцовыя княжанні захоўвалі поўную аўтаномію. Верагодна, залежнасць ад Кіева фіксавалася ў дагаворах. Формай залежнасці племянных аб'яднанняў ад Кіева было права вялікіх князёў збіраць даніну ў падуладных землях. Яна ўяўляла сабой падатак у выглядзе грошай або натуральных прадуктаў і збіралася кіеўскімі ваеннымі дружынамі, якія аб'язджалі падуладныя тэрыторыі. Такі аб'езд называўся "палюддзем". Адзінкай абкладання быў "дым" (сялянскі двор). Арганізацыя палюддзя з'ўлялася ледзь не найважнейшай задачай першых кіеўскіх князёў. Акрамя таго, мясцовыя князі былі абавязаныя выстаўляць племянныя апалчэнні для ўдзелу ў вялікіх ваенных паходах. Так, "Аповесць мінулых гадоў" пад 907 г. паведамляе, што, выпраўляючыся ў паход на грэкаў, Алег "узяў жа з сабою мноства варагаў, і славян, і чудзі, і крывічоў, і меру, і драўлян, і радзімічаў, і палян, і северан, і вяцічаў, і харватаў, і дулебаў, і ціверцаў".

Умацоўваючы сваю ўладу, кіеўскія кіраўнікі паступова ліквідавалі мясцовыя княжанні. Новую расстаноўку сіл у дзяржаве адлюстравала дамова з Візантыяй 944 г. У ёй замест "вялікіх" і "светлых" князёў (як гэта было ў дагаворы 912 г.), згадваюцца проста "князі", падручныя Ігару. Можна меркаваць, што тытул "вялікі" ў сярэдзіне X ст. заставаўся толькі за кіеўскім князем, у той час як мясцовыя князі яго пазбавіліся. Разам з тым вялікім князям прыходзілася пастаянна змагацца з мясцовым сепаратызмам, паколькі племянная знаць і князі імкнуліся вярнуць сабе незалежнасць. Неаднаразова ўздымаліся на паўстанне драўляне – найбольш зацятыя праціўнікі Кіева.

Аб'ектыўна "Руская праўда" не была першым рускім законам. Найменне яе ("Найстаражытная") носіць умоўны характар. Шэраг прававых нормаў, уключаных у яе, узнік значна раней, у IX–X стст., а можа быць і ў VIII ст. Да яе існаваў "Закон Рускі", які згадваецца ў дагаворах Русі з Візантыяй X ст. Не маглі не аказаць уплыў на заканадаўства Яраслава "ўставы" і "ўрокі" Вольгі, якія ўзніклі пасля паўстання ў драўлянскай зямлі ў 945 г. і трактавалі формы панавання князёў у Кіеўскай Русі (суд, спагнанне павіннасцей і інш.). Сістэма вір (штрафаў), якая зафіксавана ў Статуце Яраслава, узыходзіць да ўставы Уладзіміра аб вірах, аб якім паведамляе летапіс пад 996 г.

Далейшае "окняжение" абшчынных зямель, абкладанне данінай і падпарадкаванне насельніцтва княжацкаму суду выклікала абвастрэнне грамадскіх адносін і адкрытыя канфлікты. Сацыяльная барацьба звычайна актывізавалася ў галодныя, неўраджайныя гады. Так адбылося ў 1024 г. у Суздальскай зямлі. Паводле летапісу, у гэтым годзе "был мятеж великий и голод по всей той стране". Мяцеж заключаўся ў тым, што "восстали волхвы" і "избивали старшую чадь". На падаўленне паўстання спешна

прыбыў Яраслаў з дружынай. Верагодна, падавіўшы яго, Яраслаў, разважаючы аб тым, як прадухіліць "разбоі" ў далейшым, распрацаваў дадатак да сваёй "Праўды" – "покон вирный", г.зн. закон аб зборы штрафаў (вір), дзе рэгламентаваліся правы вірнікаў і абмяжоўвалася іх свавольства.

У 1068 г. адбылося паўстанне ў Кіеве. Падставай з'явілася паражэнне рускіх князёў ад полаўцаў на рацэ Альце, калі кіеўскі князь Ізяслаў Яраславіч збег з поля бою. Абураныя кіяўляне ўварваліся ў палац, захапілі і падзялілі княжацкую казну, разграмілі двары знаці. Ізяслаў вымушаны быў пакінуць Кіеў, а на кіеўскі стол, па рашэнні веча, быў пасаджаны полацкі князь Усяслаў Брачыславіч. Праз сем месяцаў Ізяслаў, які хаваўся ў польскага караля Баляслава II, вярнуўся і з яго дапамогай аднавіў сваю ўладу.

У 60–70-х гг. XI ст. хваляванні адбываліся і ў іншых рускіх землях. Усе яны былі інспіраваны валхвамі, якія агітавалі за старую веру і выкрывалі злоўжыванні прадстаўнікоў маёмасных класаў. У 1071 г. у час неўраджаю ў Растоўскай зямлі "явились два волхва из Ярославля. И пришли на Белоозеро, и было с ними людей 300". Узбунтаваныя сяляне пачалі граміць свірны і засекі заможных людзей, якія хавалі харчовыя запасы. Мяцеж быў падаўлены дзякуючы асабістай храбрасці ваяводы Яна Вышаціча, які якраз у гэты час збіраў даніну ў Растоўскай зямлі. Актыўнасць валхвоў праявілася ў зямлі Чудскай і ў Ноўгарадзе, у якім "разделились люди надвое: князь Глеб и дружина его пошли и стали около епископа, а люди все пошли к волхву. И началась смута великая между ними". Бунтавалі смерды вакол самога Кіева, адмаўляліся плаціць даніну жыхары Смаленскай зямлі. Народ паўсюдна падтрымліваў валхвоў і ішоў за імі, забіваючы хрысціянскіх святароў і прадстаўнікоў феадальнага саслоўя, знішчаючы іх маёмасць, руйнуючы межавыя знакі і стаўбы як сімвал несправядлівага новага ладу. Спробы вяртання да паганства былі актам роспачы перад стыхійнымі бедствамі і свавольствам улады.

Хутчэй за ўсё, менавіта ў гэты перыяд была складзена *"Праўда Яраславічаў"*, якая захавалася ў складзе Прастраннай рэдакцыі "Рускай праўды". Заканадаўства братоў-Яраславічаў (Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад) узнікла ў выніку вострых сутыкненняў грамадскіх інтарэсаў і павінна было прадухіліць іх у будучыні. "Праўда Яраславічаў" была, верагодна, створана ў 1072 г. у час Вышгародскага з'езда. Новы закон абараняў жыццё княскіх адміністратараў, баяраў, ахоўваў недатыкальнасць іх маёмасці. Суровыя пакаранні ўсталёўваліся за разбой, падпал, калецтва, крадзяжы, парушэнне межавых знакаў. Пад аховай закона знаходзіліся і ніжэйшыя адміністрацыйныя пасады вотчын, якія ў асноўным паходзілі з халопаў: *старасты сельскія* (якія стаялі на чале сельскага насельніцтва вотчын) і *"ратайныя"* (загадвалі вотчыннай раллёй). Заканадаўства

Яраславічаў дыферэнцыравана ставілася да ацэнкі жыцця не толькі прадстаўнікоў пануючага класа, але і залежнага насельніцтва.

Штуршком да далейшай распрацоўкі прававых нормаў паслужыла народнае паўстанне, якое ўспыхнула ў Кіеве ў 1113 г. пасля смерці князя Святаполка Ізяславіча. Прычынай паўстання з'явілася фінансавая дзейнасць памерлага "срэбралюбнага" князя. Святаполк выкарыстоўваў любыя сродкі для папаўнення казны. Ён вынаходзіў новыя падаткі, адбіраў скарбы ў манастыроў, увёў манаполію на соль, займаўся ліхвярствам, яўрэі-ліхвяры актыўна ўзбагачаліся за кошт высокіх працэнтаў за пазыкі – *рэзі (резы),* якія прыводзілі да масавага закабалення радовічаў. Паўстанне бушавала ў Кіеве 4 дні. Былі разгромленыя двары буйных баяраў і ліхвяроў, якія карысталіся пры Святаполку значнымі льготамі. У разгар паўстання па рашэнні веча на княжанне быў запрошаны ўнук Яраслава Мудрага Уладзімір Манамах.

На чале моцнай дружыны Манамах увайшоў у Кіеў. Адным з яго мерапрыемстваў, накіраваных на ліквідацыю хваляванняў, было выданне спецыяльнага статута. Да нас ён дайшоў у складзе падрабязнай рэдакцыі "Рускай праўды". Адказам на патрабаванні разгневаных кіяўлян стаў "Устав Володимир Всеволодич", які палягчаў становішча гарадскіх нізоў, у тым ліку закупаў, якія трапілі ў даўгавую кабалу і знаходзіліся ў часовай залежнасці ад багатых ліхвяроў і баяр. Значна былі зніжаны працэнты за ўзятыя пазыкі, а тэрмін іх выплаты абмяжоўваўся трыма гадамі. Статут Уладзіміра Манамаха абгрунтавана называюць *законам аб закупах*. Дзеянні Манамаха дасягнулі мэты, на некаторы час быў усталяваны сацыяльны спакой.

Такім чынам, на працягу XI – пачатку XII стст. у Кіеўскай Русі ў сацыяльна-эканамічным жыцці развіваліся і замацоўваліся феадальныя адносіны, у выніку сацыяльнай дыферэнцыяцыі ўскладнялася сацыяльная структура насельніцтва, што непазбежна прыводзіла да шматлікіх сацыяльных канфліктаў. Дзяржаўна-прававая дзейнасць кіеўскіх князёў была рэакцыяй на абвастрэнне сацыяльных адносін паміж прадстаўнікамі пануючага феадальнага класа і падпарадкаванага залежнага сялянскага насельніцтва і гараджан. Яна была накіравана на забеспячэнне палітычнай стабільнасці ў дзяржаве, асабістай недатыкальнасці для прадстаўнікоў феадальнага саслоўя, аховы зямельнай уласнасці і маёмасці феадалаў.

**Паказальнік асноўных гістарычных падзей**

**882–912** – княжанне Алега ў Кіеве.

**907** – паход Алега на Канстанцінопаль. Першы дагавор Русі з Візантыяй.

**912** – выгадны дагавор Русі з Візантыяй аб дружалюбных адносінах, нормах ўзаемнага гандлю і мараплаўстве.

**912–945** – княжанне Ігара ў Кіеве.

**915** – прыход печанегаў на Русь, іх першае згадванне ў “Аповесці мінулых гадоў”.

**941** – першы паход князя Ігара на Царград, які скончыўся правалам.

**944** – другі паход князя Ігара на Царград.

**945** – дагавор Русі з Візантыяй (Русь губляла права бяспошліннага гандлю і абавязвалася аказваць дапамогу ў ахове памежных з ёй уладанняў Візантыі).

**945** – паўстанне драўлян, забойства кіеўскага князя Ігара.

**945–963** – кіраванне княгіні Вольгі ў Кіеве (пасля забойства драўлянамі яе мужа князя Ігара).

**947** – падатковая рэформа княгіні Вольгі.

**955** – пасольства княгіні Вольгі ў Канстанцінопаль, прыняцце ёю хрысціянства (пад імем Алена).

**945 (963) – 972** – княжанне Святаслава Ігаравіча ў Кіеве.

**965** – разгром Святаславам Хазарскага каганата (на Ніжняй Волзе). Устанаўленне кантролю над Волжскім гандлёвым шляхам.

**968–971** – паходы князя Святаслава ў Дунайскую Балгарыю. Войны з Візантыяй і печанегамі.

**968** – разгром печанегаў пад Кіевам.

**971** – дагавор Русі з Візантыяй.

**972** – гібель князя Святаслава ў баі з печанегамі каля Дняпроўскіх парогаў.

**972–980** – княжанне ў Кіеве Яраполка Святаславіча.

**980–1015** – княжанне Уладзіміра Святаславіча ў Кіеве.

**980** – рэформа паганства Уладзімірам, стварэнне адзінага пантэона язычніцкіх багоў у Кіеве.

**981** – пераможны паход рускага войска на Чэрвеньскія гарады.

**983** – пераможны паход Уладзіміра на яцвягаў, спроба чалавечага ахвярапрынашэння ў Кіеве.

**985** – паход князя Уладзіміра на волжскіх булгар.

**988** – хрышчэнне Русі Уладзімірам Святаславічам.

**1015–1019** – міжусобныя войны сыноў Уладзіміра Святаславіча за велікакняскі стол.

**1015** – паўстанне супраць варагаў у Ноўгарадзе. Складанне зборніка законаў “Праўда Яраслава” – старажытнай часткі “Рускай праўды”.

**1017–1018, 1019–1054** – княжанне Яраслава Мудрага ў Кіеве.

**1019** – бітва на Альце паміж Яраславам Мудрым і Святаполкам Акаянным.

**1021** – бітва на судаміры паміж Яраславам Мудрым і Брачыславам Ізяславічам.

**1024** – паўстанне ў Растова-Суздальскай зямлі, падаўленае князем Яраславам Мудрым; бітва пры Ліствене паміж Яраславам Мудрым і яго братам Мсціславам Тмутараканскім.

**1026** – падзел Русі паміж Яраславам Мудрым і Мсціславам па Дняпры.

**1036** – перамога князя Яраслава Мудрага над печанегамі, якая забяспечыла Русі мір на чвэрць стагоддзя (да прыходу ў стэп полаўцаў).

**1043** – апошні паход войскаў Русі (на чале з сынам Яраслава Мудрага Уладзімірам Яраславічам Наўгародскім) на Канстанцінопаль, які скончыўся няўдачай.

**1054–1068, 1069–1073, 1077–1078** – вялікае княжанне ў Кіеве Ізяслава Яраславіча.

**1060** – паход князёў Яраславічаў на торкаў.

**1068** – першы буйны набег полаўцаў на Русь. Паражэнне князёў Яраславічаў на рацэ Альце. Паўстанне гараджан у Кіеве. Уцёкі Ізяслава ў Польшчу. Абвяшчэнне кіеўскім князем Усяслава Брачыславіча Полацкага.

**1071** – паўстанні ў Ноўгарадзе і Растова-Суздальскай зямлі.

**1072** – Вышгародскі з’езд князёў. Складанне “Праўды Яраславічаў” – другой часткі “Рускай праўды”.

**1073–1076** – вялікае княжанне ў Кіеве Святаслава Яраславіча.

**1078–1093** – вялікае княжанне ў Кіеве Усевалада Яраславіча.

**1093–1113** – вялікае княжанне ў Кіеве Святаполка Ізяславіча.

**1097** – Любецкі з’езд князёў.

**1103** – Далобскі з’езд князёў для падрыхтоўкі паходу на полаўцаў. Паход князёў Святаполка і Уладзіміра Манамаха на полаўцаў.

**1111** – паход рускіх князёў на полаўцаў.

**1113** – паўстанне ў Кіеве супраць ліхвяроў, запрашэнне на княжанне ў Кіеве Уладзіміра Манамаха. Выданне “Статута Уладзіміра Манамаха”, які абмяжоўваў ліхвярства.

**1113–1125** – вялікае княжанне ў Кіеве Уладзіміра Манамаха.

**1116** – перамога князя Уладзіміра Манамаха над полаўцамі.

**1125–1132** – вялікае княжанне ў Кіеве Мсціслава Уладзіміравіча.

**Гістарычныя дзеячы**

**Алег** – вараг, ваявода Рурыка, вялікі кіеўскі князь (882–912). Пасля смерці Рурыка з 879 г. пачаў княжыць у Ноўгарадзе. У 882 г. распачаў паход на Кіеў, захапіў яго і зрабіў сталіцай Русі. У 883–885 гг. падпарадкаваў драўлян, северан, радзімічаў. Паспяхова ваяваў з хазарамі. У 907 г. здзейсніў паход на Візантыю, у 912 г. заключыў з ёй выключна выгадны для Русі дагавор. Летапісец, грунтуючыся на вусным паданні, называе яго “Вещим”.

**Алег Святаславіч** (Гарыславіч) – князь Уладзіміра-Валынскі (1073–1076), Тмутараканскі (1083–1094), Чарнігаўскі (1094–1096), Ноўгарад-Северскі (1097–1115). Унук Яраслава Мудрага. У 1073 г. атрымаў ад бацькі Растова-Суздальскую зямлю, затым княжыў на Валыні. Пасля смерці бацькі (1076) знаходзіўся ў Кіеве, дзе на троне сядзеў яго дзядзька Усевалад Яраславіч. У 1078 г. збег у Тмутаракань і з дапамогай полаўцаў захапіў Чарнігаў. У бітве з аб’яднаным войскам Ізяслава і Усевалада Яраславічаў пацярпеў паразу і зноў збег у Тмутаракань. У 1094 г. навёў палавецкія арды на Русь, авалодаў Чарнігавам і ўступіў у працяглую барацьбу за Кіеў са Святаполкам Ізяславічам і Уладзімірам Манамахам. Саюз Алега з полаўцамі выклікаў асуджэнне летапісца і даў падставу аўтару “Слова пра паход Ігаравы” назваць яго “Гарыславічам”.

**Баляслаў І Храбры** – польскі князь (992–1025, кароль у 1025) з дынастыі Пястаў. У пачатку свайго кіравання падтрымліваў сяброўскія адносіны з кіеўскім князем Уладзімірам Святаславічам, што дазволіла яму абараняць заходнія межы і стварыць моцную дзяржаву. Аднак пазней ён умяшаўся ў міжусобную барацьбу на Русі. У 1018 г. Баляслаў здзейсніў паход на Кіеў, падтрымліваючы Святаполка супраць Яраслава Мудрага.

**Баляслаў ІІ Смелы** – польскі князь (1058–1079, з 1077 кароль) з дынастыі Пястаў. Умешваўся ва ўнутраную барацьбу ў Кіеўскай Русі. Здзейсніў два паходы на Кіеў (1069, 1077) на падставе аказання ваеннай дапамогі свайму зяцю, кіеўскаму князю Ізяславу, у вяртанні кіеўскага стала. У 1069 г. заняў горад, але быў выгнаны кіяўлянамі.

**Барыс ІІ** – балгарскі цар (969–972). У перыяд яго праўлення Балгарыя падвергнулася ваеннаму націску Візантыі і Русі. Вялікі кіеўскі князь Святаслаў у 969 г. заняў сталіцу Балгарыі (Вялікі Прэслаў), аднак захаваў прастол за Барысам і, заключыўшы з ім саюз, вёў вайну з Візантыяй (969–971). Пасля заключэння руска-візантыйскага мірнага дагавора ў 971 г. візантыйскія войскі разграмілі Балгарыю і далучылі да імперыі. Барыс быў пазбаўлены трона, абвешчаны магістрам і адпраўлены ў Канстанцінопаль.

**Барыс** (хрысціянскае імя Раман) (да 988–1015) – князь растоўскі, сын князя Уладзіміра ад візантыйскай прынцэсы Ганны, старэйшы брат Глеба. Даведаўшыся аб захопе велікакняскага стала князем Святаполкам, яго зводным братам, адмовіўся ваяваць з ім. Быў забіты прыхільнікамі Святаполка. Кананізаваны Рускай праваслаўнай царквой.

**Васіль ІІ Балгарабойца** – візантыйскі імператар (976–1025). Вёў цяжкую барацьбу з землеўладальнікамі Заходняй Балгарыі. Для падаўлення бунту (987–989) заключыў ваенны саюз з кіеўскім князем Уладзімірам. Па ўмовах дагавора сястра імператара прынцэса Ганна была

выдадзена замуж за Уладзіміра, а сам князь прыняў хрысціянства і хрысціў Русь па візантыйскім узоры.

**Вольга** – кіеўская княгіня (945–969), жонка князя Ігара, маці князя Святаслава. Жорстка падавіла паўстанне драўлян (945). Правіла ў малых гадах сына і падчас яго паходаў. Ажыццявіла падатковую рэформу. Здзейсніла ў 955 г. падарожжа ў Царград, дзе першай з княскага роду прыняла хрысціянства, выхоўвала сыноў Святаслава.

**Глеб** – князь мурамскі (994 або 996–1015), сын князя Уладзіміра і візантыйскай прынцэсы Ганны, малодшы брат Барыса. Забіты па загадзе Святаполка. Разам з Барысам кананізаваны Рускай праваслаўнай царквою. Князі Барыс і Глеб сталі першымі святымі на Русі.

**Дабрыня** – выхавальнік і ваявода князя Уладзіміра Святаславіча, родны брат маці князя – Малушы. Падтрымліваў Уладзіміра ў барацьбе за кіеўскі стол, удзельнічаў у паходах на Полацк і Кіеў (980), быў княжацкім намеснікам у Ноўгарадзе, дзе гвалтоўна ўкараняў хрысціянства.

**Іаан Цымісхій** – візантыйскі імператар (969–976). Вёў напружаную вайну з Кіеўскай Руссю, падчас якой змог выцесніць з Балканскага паўвострава кіеўскага князя Святаслава і далучыць да імперыі Прыдунайскую Балгарыю (971).

**Ігар Стары** – кіеўскі князь (912–945). Па дадзеных "Аповесці мінулых гадоў" – сын Рурыка, у маленства якога дзяржавай правіў Алег. Па іншых звестках – родапачынальнік дынастыі кіеўскіх князёў, не звязаны з Рурыкам. У 915 г. ваяваў з печанегамі. У 941 і 944 гг. хадзіў паходамі на Візантыю і заключыў з ёй дамову аб міры і гандлі. У 945 г. быў забіты драўлянамі, якія супраціўляліся сваавольству Ігара пры зборы даніны.

**Ізяслаў** – полацкі князь (988–1001), старэйшы сын вялікага кіеўскага князя Уладзіміра і полацкай князёўны Рагнеды Рагвалодаўны. Быў пасланы Уладзімірам на княжанне ў Полацкую зямлю. Яго рэзідэнцыяй стаў пабудаваны для яго г. Ізяслаўль (Заслаўе). Стаў родапачынальнікам полацкай княжацкай дынастыі Ізяславічаў (Рагвалодавічаў), прадстаўнікі якой знаходзіліся ў апазіцыі кіеўскім князям. Паклаў пачатак палітычнай самастойнасці Полацкага княства. Пры ім у Полацку распаўсюджваецца хрысціянства, была заснавана Полацкая епархія (991–992).

**Ізяслаў Яраславіч** – вялікі князь кіеўскі (1054–1068, 1069–1073, 1077–1078). У 1068 г. прайграў бітву на рацэ Альта з полаўцамі, пасля чаго быў выгнаны кіяўлянамі і ўцёк да свайго цесця польскага караля Баляслава II. З яго дапамогай аднавіў сваю ўладу ў Кіеве. У 1068 г. у выніку паўстання, а ў 1073 г. братамі Святаславам і Усеваладам быў адхілены з пасады. Удзельнічаў у складанні "Праўды Яраславічаў".

**Іларыён** – першы кіеўскі мітрапаліт з рускага духавенства (з 1051), раней – прэсвітар пры царкве ў княжым сяле Берастове пад Кіевам. Яго

зацвярджэнне мітрапалітам было звязана са спробай вызваліцца ад апекі Візантыі ў царкоўных справах. Пасля смерці князя Яраслава Мудрага (1054) зняты з пасады кіраўніка Рускай праваслаўнай царквы. Вядомы як пісьменнік, аўтар “Слова пра закон і благадаць” – царкоўна-палітычнага трактата, які праслаўляў Кіеўскую Русь і яе князёў – Уладзіміра Святога і Яраслава Мудрага. Быў актыўным прыхільнікам незалежнасці Рускай царквы ад Канстанцінопаля.

**Мал** – драўлянскі князь. У 945 г. узначаліў народнае паўстанне супраць кіеўскага князя Ігара, выкліканае празмернымі паборамі. Пасля забойства Ігара сватаўся да яго ўдавы, княгіні Вольгі. Па некаторых звестках, загінуў пры разгроме драўлян і ўзяцці драўлянскай сталіцы Іскарасцень войскам Вольгі, у “Аповесці мінулых гадоў” як бацька Малушы і Дабрыні згадваецца Малк Любячанін, відавочна ўзяты ў палон князь Мал.

**Малуша** – дачка драўлянскага князя Мала, пасля 945 г. рабыня і ключніца княгіні Вольгі, наложніца князя Святаслава і маці Уладзіміра, якога нярэдка дакаралі плебейскім паходжаннем.

**Мсціслаў Уладзіміравіч** – вялікі князь кіеўскі (1125–1132), сын Уладзіміра Манамаха. З 1088 г. княжыў у Ноўгарадзе, Растове, Смаленску. Працягваў палітыку бацькі, удзельнічаў у княжацкіх з’ездах, паспяхова абараняў рускія землі ад полаўцаў, спыняў міжусобіцы.

**Рагвалод** – першы гістарычна вядомы полацкі князь (980). У 980 г. пасля ўзяцця Полацка Уладзімірам быў забіты разам з жонкай і двума сынамі. Яго дачка Рагнеда стала жонкай-наложніцай Уладзіміра.

**Рагнеда** – полацкая князёўна, дачка князя Рагвалода (?–1000). З’яўляючыся нявестай кіеўскага князя Яраполка, адмовіла сватам Уладзіміра Святаславіча. Пасля захопу Полацка ў 980 г. Уладзімір гвалтоўна зрабіў яе сваёй жонкай, Рагнеда атрымала славянскае імя Гарыслава. Спрабавала арганізаваць змову супраць яго, помсцячы за смерць бацькі і братоў. Маці Ізяслава Уладзіміравіча, пачынальніка полацкай галіны Рурыкавічаў, і Яраслава Мудрага. Паводле padання, пасля хрышчэння Уладзіміра і ліквідацыі яго гарэма адмовілася скарыстацца яго дазволам другі раз выйсці замуж, прыняла пастрыг пад імем Анастасіі.

**Свенельд** – вараг, ваявода князя Ігара, карыстаўся правам збору даніны з драўлян. Удзельнічаў у пакарэнні улічаў, у войнах з Візантыяй (941, 944). Служыў таксама Святаславу Ігаравічу, удзельнічаў у паходах на Візантыю і ў Закаўказзе. Быў найбліжэйшым дарадцам Яраполка Святаславіча. Памёр пасля 977 г.

**Святаполк Ізяславіч** – князь полацкі (1069–1071), наўгародскі (1078–1088), тураўскі (1088–1093), вялікі князь кіеўскі (1093–1113). Адрозніваўся жорсткасцю і карысталюбствам. У час яго праўлення

працягваліся міжусобіцы, абвастрыліся сацыяльныя канфлікты, выкліканыя ўзмацненнем ліхвярства і разарэннем гандлёва-рамеснага насельніцтва. Палітыка Святаполка з'явілася прычынай народнага паўстання ў Кіеве (1113).

**Святаполк Яраполчыч** (Акаянны) – князь тураўскі (з 988), кіеўскі (1015–1019). Сын Яраполка, усыноўлены Уладзімірам Святаславічам, пасля яго смерці заняў кіеўскі стол. Імкнучыся ўтрымаць яго, пачаў міжусобную вайну, у якой забіў трох з пяці сваіх братоў: Барыса растоўскага, Глеба Мурамскага, Святаслава Драўлянскага – і завалодаў іх надзеламі. У саюзе з печанегамі ваяваў з Яраславам Мудрым, у 1017 г. быў выгнаны з Кіева. У 1018 г. з дапамогай польскага караля Баляслава I зноў захапіў уладу, але ў 1019 г. быў разбіты Яраславам Мудрым на рацэ Альта і канчаткова пазбавіўся вялікага княжання.

**Святаслаў Ігаравіч** – вялікі князь кіеўскі (каля 945–972), сын князя Ігара і Вольгі. Вядомы як таленавіты палкаводзец. З 964 г. здзяйсняў паходы на Аку, у Паволжа, на Паўночны Каўказ і Балканы. Падпарадкаваў вяцічаў, вызваліўшы іх ад валадарства хазар, у 965 г. разграміў Хазарскі каганат, у 967 г. ваяваў з Дунайскай Балгарыяй. У 969–971 гг. у саюзе з ёй вёў вайну супраць Візантыі і ў 971 г. заключыў з ёй мірны дагавор. У 972 г. на дняпроўскіх парогах быў забіты печанегамі.

**Святаслаў Яраславіч** – князь чарнігаўскі (з 1054), вялікі князь кіеўскі (1073–1076). Сын Яраслава Мудрага. Сумесна з братамі ўдзельнічаў у складанні "Праўды Яраславічаў". У ходзе дынастычнай барацьбы разам з братам Усеваладам выгнаў брата Ізяслава Яраславіча з Кіева. Паспяхова абараняў паўднёвыя рубяжы Русі ад полаўцаў.

**Тугаркан** – палавецкі хан, які аб'яднаў прыдняпроўскія орды. У канцы XI ст. ажыццяўляў набегі і рабаваў паўднёвыя ўскраіны старажытнарускай дзяржавы, даходзячы да Кіева. Выдаў сваю дачку замуж за кіеўскага князя Святаполка Ізяславіча.

**Уладзімір Святаславіч** (Святы, Чырвонае сонейка, хрысціянскае імя Васіль) – князь наўгародскі з 969, вялікі князь кіеўскі (980–1015). Малодшы сын князя Святаслава і ключніцы княгіні Вольгі Малушы. Падпарадкаваў вяцічаў, радзімічаў, яцвягаў. Паспяхова ваяваў з печанегамі, Волжскай Булгарыяй, Польшчай, Візантыяй. Пры ім былі пабудаваны абарончыя рубяжы па рэках Дзяса, Асётр, Трубеж і Сула, якія агароджвалі Русь ад качэўнікаў. У 988 г. прыняў хрысціянства і ўвёў яго ў дзяржаве, умацаваўшы ўнутранае і міжнароднае становішча Кіеўскай Русі. Час яго праўлення стаў перыядам росквіту Кіеўскай Русі, апеты ў былінах і літаратурных творах. Кананізаваны Рускай праваслаўнай царквой як роўнаапостальны святы.

**Уладзімір Манамах** – князь смаленскі (з 1067), чарнігаўскі (з 1078), пераяслаўскі (з 1093), вялікі кіеўскі князь (1113–1125). Сын Усевалада Яраславіча і візантыйскай прынцэсы Марыі з дынастыі Манамаха. Змагаўся з міжусобіцамі князёў і ўмацаваў адзінства рускіх зямель. Паспяхова ваяваў з полаўцамі, арганізоўваючы супраць іх сумесныя княжацкія паходы (1103, 1107, 1111, 1113). У 1113 г., пасля паўстання ў Кіеве, выдаў “Устаў”, які абмяжоўваў ліхвярства і палегчыў становішча закупаў. Аўтар “Павучэння” сваім сынам, у якім абагульніў уласны жыццёвы вопыт, заклікаў князёў “прекратить распри”, выконваць прынцып заняцця княскай пасады ў спадчыну па старшынстве ў родзе і прытрымлівацца нормаў хрысціянскай маралі.

**Усяслаў Брачыславіч** (Усяслаў Чарадзей) – князь полацкі (1044–1101). У 1066 г. захопам Ноўгарада пачаў міжусобную вайну з братамі Яраславічамі. У 1067 г. пасля бітвы на рацэ Нямга быў узяты Яраславічамі ў палон і пасаджаны ў Кіеве ў поруб. У 1068 г. падчас паўстання ў Кіеве быў абвешчаны вялікім князем, але праз 7 месяцаў пад пагрозай ваеннай моцы Ізяслава Яраславіча ўцёк з Кіева і быў выгнаны з Полацка. Карыстаўся сімпатыямі народа, увайшоў у былінны эпас як Усяслаў Чарадзей. Полацкае княства пры ім дасягнула найбольшага росквіту.

**Усевалад Яраславіч** – князь пераяслаўскі (з 1054), чарнігаўскі (1076), вялікі князь кіеўскі (1078–1093). Сын Яраслава Мудрага. Першым шлюбам быў жанаты з дачкой візантыйскага імператара Канстанціна IX Манамаха. Разам з братамі Ізяславам і Святаславам вёў барацьбу з полаўцамі, удзельнічаў у складанні “Праўды Яраславічаў”.

**Шарукан** – палавецкі хан, кіраўнік племяннога аб’яднання Шаруканідаў. Здзяйсняў рабаўніцкія набегі на рускія землі. Пацярпеў паразы ад кіеўскіх князёў Святаслава Яраславіча (1068) і Уладзіміра Манамаха (1106 і 1111).

**Ян Вышаціч** – кіеўскі тысяцкі, прадстаўнік знаці Кіева, сын Вышаты, ваяводы князя Яраслава Мудрага, які ўдзельнічаў у паходзе рускіх дружын на Візантыю ў 1043 г. Пасаду кіеўскага тысяцкага, мабыць, атрымаў у спадчыну ад бацькі. Пры князю Ізяславе Яраславічу быў першым сярод кіейскіх баяраў. У 70-х гг. ездзіў у Мурам, дзе жорстка падавіў паўстанне смердаў. У 1093 і 1106 гг. удзельнічаў у паходах на полаўцаў. Яго апавяданні аб гэтых падзеях былі выкарыстаны ў кіеўскім летапісанні. Памёр у 1106 г.

**Яраполк Святаславіч** – кіеўскі князь (972–980), старэйшы сын князя Святаслава Ігаравіча. Адным з першых у Кіеве прыняў хрысціянства. У 977 г. у час міжусобнай сваркі зрабіў паход на свайго брата драўлянскага князя Алега, які ў час бітвы загінуў. У 980 г. быў пераможаны Уладзімірам і забіты.

**Яраслаў Мудры** – вялікі князь кіеўскі (1019–1054), сын Уладзіміра Святаславіча. Удзельнічаў у барацьбе за велікакняскі стол пасля смерці бацькі. Выгнаў з Кіева Святаполка Акаяннага. Здзейсніў шэраг паспяховых паходаў на печанегаў, пашыраў заходнія межы Русі. У гады яго княжання Кіеўская Русь дасягнула росквіту: будаваліся храмы і гарады, пашыраліся міжнародныя сувязі (у тым ліку і дынастычныя) з многімі еўрапейскімі краінамі. З імем Яраслава звязана складанне першага агульнарускага заканадаўства – "Рускай праўды".

**Гістарычныя паняцці**

**Агнішчанін** (ад "вогнішча" – ачаг) – "княжы муж", баярын, кіраўнік княжацкай вотчыны. Баяры-агнішчане ўваходзілі ў склад "старэйшай" дружыны князя, валодалі зямлёй і карысталіся прывілеямі. Агнішчане, магчыма, ажыццяўлялі нагляд за палацамі князёў у гарадах. Агнішчанамі называлі і княжацкіх дружыннікаў, якія выконвалі адміністрацыйныя функцыі. Гэтыя асобы знаходзіліся пад асаблівай аховай закона. Забойства агішчаніна каралася штрафам у 80 грыўней. У Наўгародскай зямлі імі называлі сярэдніх і дробных землеўладальнікаў, уласнікаў падсекі ("огнища").

**Альта** – назва ракі, якая ўпадае ў левы прыток Дняпра Трубеж, урочышча на паўднёвым усходзе ад Кіева. У гэтай мясцовасці падчас дынастычнай барацьбы па загадзе Святаполка ў 1015 г. быў забіты Барыс. У 1019 г. Яраслаў на Альце разбіў аб'яднаныя войскі Святаполка і печанегаў. У 1068 г. тут адбылася бітва паміж войскамі князёў Яраславічаў (Ізяслава, Святаслава, Усевалада) і полаўцамі, у якой браты былі разбітыя і ўцяклі. Гэтыя падзеі выклікалі народнае паўстанне ў Кіеве.

**Баяры** – у старажытнай Русі прывілеяваная частка грамадства, землеўладальнікі, "княжы мужы" і васалы князя. Баярства фарміравалася з нашчадкаў родаплемяннай знаці і вышэйшага слоя княжацкай дружыны. Мелі сваіх васалаў, карысталіся правам феадальнага імунітэту. Складалі савет пры князю – Баярскую думу.

**Васал** – слуга, феадал, які атрымаў ад сеньёра (больш буйнога феадала) зямельнае валоданне (феод, вотчыну) за нясенне службы, у асноўным ваеннай, і залежыў ад феадала.

**Васалітэт** (васальна-ленная сістэма) – сістэма адносін падпарадкавання феадалаў-васалаў феадалам-сеньёрам. Пачынае фарміравацца ў старажытнай Русі ў канцы XI – пачатку XII стст.

**Веча** – народны сход у старажытнай Русі. Найбольш актыўна дзейнічала ў другой палове XI–XII ст. У яго склад уваходзілі баяры, царкоўныя іерархі, купцы, гараджане ці жыхары сельскай мясцовасці. Веча вырашала пытанні вайны і міру, заканадаўства, запрашэння князёў,

складаючы з імі "ряд" і выганяючы іх, калі ўмовы імі не выконваліся. Веча сыходзіць сваімі каранямі ў племянны лад і эпоху ваеннай дэмакратыі, з'яўлялася асноўным органам удзелу народа ў кіраванні дзяржавай.

**Вечныя людзі, вечныя баяры** (вечнікі) – удзельнікі вечавых сходаў.

**Візантыя** – Усходняя Рымская імперыя, Візантыйская імперыя (IV–XV стст.). Утварылася пры распадзе Рымскай імперыі ў яе ўсходняй частцы (Балканскі паўвостраў, Малая Азія, паўднёва-ўсходняе Міжземнамор'е). Сталіца – Канстанцінопаль (Царград). Найбольшага тэрытарыяльнага пашырэння дасягнула пры імператары Юстыніяне І, ператварыўшыся ў магутную міжземнаморскую дзяржаву. Вяла актыўны гандаль са Скандынавіяй і Кіеўскай Руссю. Неаднаразова падвяргалася нападам кіеўскіх князёў (у 860, 907, 944, 970 гг.), якія адстойвалі ваенныя і гандлёвыя інтарэсы Русі ў Прычарнамор'і. У 988 г. пры ўдзеле Візантыі Русь прыняла хрысціянства.

**Віра** – грашовы штраф за забойства ў Кіеўскай Русі. Уведзена ў 996 г. князем Уладзімірам Святаславічам. Спагнанне вір павінна было замяніць звычай кроўнай помсты.

**Вірнік** – прадстаўнік княжацкай або баярскай адміністрацыі, "княжы муж", які займаўся зборам судовых штрафаў (вір).

**Волжская Булгарыя** (Волжска-Камская Булгарыя) – першае дзяржаўнае ўтварэнне народаў Сярэдняга Паволжа і Прыкам'я, сфарміравалася ў Х ст. у барацьбе з хазарамі. Пасля разгрому Хазарскага каганата кіеўскім князем Святаславам (965) канчаткова вызвалілася ад улады хазар. Сталіца – горад Булгар. Знаходзілася на важных гандлёвых шляхах, якія злучаюць Усходнюю Еўропу з Усходам, і актыўна гандлявала з Арабскім халіфатам, Візантыяй, Руссю. У 1066 г. быў заключаны руска-булгарскі гандлёвы дагавор. Кіеўскія князі неаднаразова рабілі паходы на Волжскую Булгарыю (977, 985, 994, 997). З XI ст. яе асноўным супернікам стала Уладзіміра-Суздальская Русь, што выклікала ваенныя канфлікты і пацягнула перанясенне сталіцы ў горад Біляр. У 1241 г. была падпарадкавана манголам і ўвайшла ў склад Залатой Арды.

**Булгары** – цюркскія плямёны. Аб'ядноўваліся ў саюз, які ў VII ст. раздзяліўся на некалькі груп. Частка вандравала ў Прыазоўі і на Паўночным Каўказе. Другая частка прайшла на Балканы, дзе злілася з мясцовым славянскім насельніцтвам. Трэцяя асела ў Сярэднім Паволжы, падпарадкавала шэраг фіна-ўгорскіх плямёнаў і ўзначаліла поліэтнічнае дзяржаўнае ўтварэнне – Волжска-Камскую Булгарыю.

**Воласць** – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў старажытнай Русі. Часам супадала з межамі зямлі ці княства, часам складала толькі іх частку. Падпарадкоўвалася гораду як адміністрацыйнаму і палітычнаму

цэнтру. Тэрмін таксама ўжываецца ў значэнні паўсамастойнага надзелу, які кіраваўся князямі-васаламі кіеўскага князя.

**Валасцель** – службовая асоба на Русі ў XI–XVI стст., якая кіравала воласцю ад імя вялікага або ўдзельнага князя і займалася адміністрацыйнымі і судовымі справамі. Не атрымліваючы заробку ад улады, "карміўся" за кошт цяглага насельніцтва воласці, браў "кармленне" ў выглядзе натуральных прадуктаў і разнастайных пошлін. Дапаможным персаналам пры ім былі *цівуны, даводчыкі, праведчыкі*. Яго ўлада ў імунітэтных уладаннях абмяжоўвалася жалаванымі граматамі.

**Валхвы, вяшчуны, чарадзеі** – жрацы, служыцелі паганскага культу ва ўсходніх славян. Належалі да вярхушкі грамадства. Валхвам прыпісваўся ўплыў на сілы прыроды, лячэнне хвароб, прадказанне будучыні. Упершыню згадваюцца ў летапісе пад 912 г. у сувязі з прадказаннем смерці князю Алегу. Пасля прыняцця хрысціянства кіравалі антыхрысціянскай апазіцыяй і падвяргаліся ганенням з боку дзяржавы і царквы. У XI ст. неаднаразова ўзначальвалі народныя паўстанні (у Суздальскай зямлі, Кіеве, Белавозеры).

**Вотчына** – від феадальнай спадчыннай зямельнай уласнасці. У старажытнай Русі ўзніклі ў канцы X–XI стст. шляхам княскага падаравання, захопу абшчынных сялянскіх зямель ці вылучэння з абшчыны ўладанняў багатых сялян. Вядомы княскія, баярскія, манастырскія вотчыны. Уладальнік вотчыны мог перадаваць яе па спадчыне, прадаваць, закладваць. Тэрмін паходзіць ад слова "отчина", г.зн. бацькаўская ўласнасць.

**Грыўна** – грашовая адзінка ў Кіеўскай Русі. У XI ст. складала прыблізна 49,25 г срэбра.

**Грыдзь, грыдзін, грыдзень** – малодшы княскі дружыннік, целаахоўнік князя. Грыдзі складалі асноўныя кадры княжацкіх дружын, удзельнічалі ў кіраванні княжацкай гаспадаркай, жылі пры княжым двары ў спецыяльным памяшканні – грыдніцы.

**Даніна** – натуральны або грашовы падатак. У старажытнай Русі з'яўляўся формай залежнасці пераможаных або добраахвотна падпарадкаваных кіеўскаму князю плямёнаў. Збор даніны ажыццяўляўся ў форме палюддзя. Права збору атрымлівалі княжацкія ваяводы, знатныя дружыннікі ў якасці платы за службу. Такім чынам права на даніну рэалізоўвала васальныя адносіны ў старажытнай Русі. Рэгламентацыя і ўпарадкаванне збору даніны былі ўпершыню ажыццёўлены княгіняй Вольгай у 947 г. падчас яе паходаў у Драўлянскую і Наўгародскую землі. Нормы збору даніны былі зафіксаваныя ва "Уставе" княгіні Вольгі.

**Дзесяціна** – дзясятая частка ўсіх даходаў даніны (штрафаў), якая выдаткоўвалася князем на будаўніцтва і ўтрыманне хрысціянскай царквы.

Была заснавана Уладзімірам адначасова з увядзеннем хрысціянства. Бралася з насельніцтва ў памеры дзясятай часткі ўраджаю ці іншых даходаў.

**Дружына** – узброены атрад пры князю, яго бліжэйшае акружэнне, прывілегіяваны слой грамадства. Дружына з'яўлялася асновай, ядром ваенных сіл старажытнай Русі і ў той жа час удзельнічала ў палітычным кіраванні, уваходзячы ў савет пры князю – думу. Дружыннікі таксама ажыццяўлялі кіраванне асабістай гаспадаркай князя. Дружына дзялілася на "*старэйшую*" ("княжьи мужи", "нарочитые мужи") і "*малодшую"* ("гриди", "отроки", "детские"). Сацыяльнае становішча "старэйшых" і "молодших" дружыннікаў было розным.

**Задніца** – спадчына ці запавет (завещание) паводле старажытнарускіх крыніц.

**Закуп** – катэгорыя феадальна-залежнага насельніцтва: асобы, якія ўзялі купу і абавязваліся адпрацаваць яе ў гаспадарцы феадала-крэдытора сваім інвентаром. "Руская праўда" адрознівае "ралейных" закупаў (якія працавалі на раллі) і даглядчыкаў жывёлы. Пры спробе ўцёкаў закупператвараўся ў халопа. Прававое становішча закупа вызначана "Уставом о закупах", выдадзеным Уладзімірам Манамахам у 1113 г.

**З'езд князёў** – орган палітычнага кіравання ў Кіеўскай Русі, нарада, у якой удзельнічалі вялікі кіеўскі і ўдзельныя князі. З'езд вырашаў пытанні агульнадзяржаўнага характару: абароны рускай зямлі ад знешніх ворагаў, рэгламентаваў адносіны паміж князямі, абмяркоўваў унутранае ўладкаванне Русі. Найбольш значныя агульнарускія з'езды – Любецкі (1097) і Далобскі (1103).

**Ізгоі** – асобы, якія страцілі сувязь з абшчынай у выніку выгнання ці добраахвотнага выхаду: сяляне, якія разарыліся і пакінулі абшчыну; вольнаадпушчаныя ці пасля ўнясення выкупу халопы ("пущенники" і "прощенники"); князі, выгнаныя са сваіх надзелаў і пазбаўленыя спадчыны; купцы, па віне якіх была страчана агульная маёмасць; дзеці хрысціянскіх святароў, якія не засвоілі пісьменнасць. Вядомыя гарадскія і сельскія ізгоі.

**Імунітэт** – права землеўладальніка ажыццяўляць у сваіх уладаннях некаторыя функцыі цэнтральнай улады (суд, збор падаткаў і г.д.). Забараняў доступ княжацкай адміністрацыі ва ўладанні баяраў і манастыроў. Даваўся вялікім князем кіеўскім буйным свецкім і духоўным вотчыннікам і афармляўся адмысловымі граматамі.

**Кіеўская Русь** – раннефеадальная дзяржава, якая ўзнікла на землях усходніх славян у IX ст. (ва ўсходніх, візантыйскіх крыніцах і Бярцінскіх аналах – каганат). Умоўнай датай утварэння лічыцца 882 г., калі наўгародскі князь Алег аб'яднаў Ноўгарад і Кіеў – два цэнтры старажытнарускай дзяржаўнасці. Дасягнула росквіту ў канцы X–XI стст.

пры князях Уладзіміру Святаславічу і Яраславе Мудрым. У другой палове XI ст. княжацкія міжусобіцы і набегі полаўцаў прывялі да аслаблення дзяржавы. У другой чвэрці XII ст. Кіеўская Русь уступіла ў завяршальную фазу распаду на асобныя княствы і землі.

**Куна** – грашовая адзінка старажытнай Русі, у XI ст. складала прыблізна 1,97 г срэбра.

**Купа** – пазыка, якая прадстаўлялася землеўладальнікам селяніну-смерду ў выглядзе грашовай сумы, збожжа і іншых каштоўнасцей пад працэнты.

**Ловішча** – месца пушнога палявання або рыбнай лоўлі, дзе бралася частка даніны пушнінай або рыбай.

**Любецкі з’езд** – з’езд рускіх князёў у 1097 г. у горадзе Любечы на Дняпры, у якім бралі ўдзел 6 князёў (Святаполк Ізяславіч кіеўскі, Алег і Давыд Святаславічы, Уладзімір Манамах, Давыд Ігаравіч валынскі, Васілька Расціслававіч). З’езд быў выкліканы неабходнасцю арганізацыі сумеснай барацьбы з полаўцамі ва ўмовах распачатага ўдзельнага драблення Русі. Князі заключылі паміж сабой мір і пастанавілі ў далейшым не дапускаць міжусобных сварак. Найважнейшая пастанова з’езда была выяўлена ў формуле: “каждый да держит свою вотчину”, што афіцыйна прызнавала існаванне незалежных адзін ад аднаго княстваў, якія з’яўляліся спадчыннымі ўладаннямі. Аднак рашэнне з’езда не спыніла княжацкія сваркі, развязала новую міжусобную вайну.

**Мітрапаліт** – адзін з вышэйшых царкоўных санаў, падпарадкаваны непасрэдна патрыярху. Кіеўская мітраполія, заснаваная ў 988 г., была часткай Канстанцінопальскага патрыярхату. Першым кіеўскім мітрапалітам быў Анастас Карсунянін. У старажытнай Русі мітрапаліцкі трон займалі звычайна грэкі, двойчы – рускія: Іларыён (1051) і Клімент (1147).

**Нагата** – дробная грашовая адзінка ў старажытнай Русі. У XI ст. складала прыблізна 2,46 г срэбра.

**Намаканон** – зборнік нормаў царкоўнага права праваслаўнай царквы, які ўтрымліваў правілы ўнутранага распарадку, побыту, сямейнага жыцця. У яго ўключаліся пастановы Усяленскіх сабораў, законы візантыйскіх імператараў па царкоўных пытаннях і інш. З IX ст. Намаканон стаў перакладацца на славянскія мовы. На Русі быў перапрацаваны і дапоўнены з улікам мясцовых умоў і атрымаў назву Кормчай кнігі.

**Печанегі** (пачынакіты) – саюз цюркскіх і іншых качавых жывёлагадоўчых плямёнаў у VIII–X стст. у заволжскіх, у IX ст. – у паўднёварускіх стэпах. Здзяйснялі рабаўніцкія набегі на Русь. У 1036 г. былі разгромлены князем Яраславам Мудрым, пасля чаго племянны саюз распаўся.

**Павоз** – самастойная дастаўка сялянамі даніны на пагост, уведзеная княгіняй Вольгай замест палюддзя.

**Пагост** – у першапачатковым значэнні пагостам называліся сельскія абшчыны на перыферыі Кіеўскай Русі, а таксама цэнтры гэтых суполак, дзе вялася "гостьба" (гандаль). Паводле падатковай рэформы княгіні Вольгі, пагост – месца збору даніны. Паступова гэта назва ў Кіеўскай дзяржаве распаўсюдзілася на адміністрацыйныя адзінкі, якія складаліся са шматлікіх вёсак, а таксама іх цэнтры. На чале пагостаў былі пастаўлены спецыяльныя службовыя асобы, адказныя за рэгулярнае паступленне даніны. З распаўсюджваннем на Русі хрысціянства на пагостах звычайна будавалі цэрквы, каля якіх знаходзіліся могілкі. Памеры пагостаў былі розныя: ад некалькіх дзясяткаў да соцень вёсак.

**Пад'язны (подъездной княж)** – княскі ці баярскі адміністратар, які аб'язджаў землі і ажыццяўляў збор падаткаў.

**Палюддзе** – форма збору нефіксаванай даніны, якая ажыццяўлялася ў час аб'езду падуладных зямель князем або яго ваяводамі, пад'язнымі з дружынай.

**Пасаднік** – намеснік князя ў землях Кіеўскай Русі ў X–XI стст., у Ноўгарадзе – кіраўнік мясцовай адміністрацыі, старэйшына.

**Полаўцы** (кіпчакі, куманы) – цюркская народнасць, качэўнікі (у X ст. – на тэрыторыі Казахстана). У XI ст., прасоўваючыся ў стэпы Паўночнага Прычарнамор'я, выціснулі адтуль печанегаў. З 1055 г. здзяйснялі спусташальныя набегі на Русь. У 1103–1116 гг. напады спыніліся ў выніку сумесных паходаў рускіх князёў, але аднавіліся ў другой палове XII ст. У XIII ст. полаўцы былі разгромлены і заваяваны мангола-татарамі.

**Прошчанікі** – катэгорыя залежнага насельніцтва ў старажытнай Русі, згадваецца ў помніках царкоўнага права. На думку большасці даследчыкаў, гэта былыя халопы, якія атрымалі волю з умовай працаваць на царкоўных землях, а таксама людзі, якія паступілі ў залежнасць ад царквы пасля "прощения" (вылечвання) іх хвароб.

**Пушчанікі** – катэгорыя залежнага насельніцтва ў старажытнай Русі, згадваецца ва ўставе наўгародскага князя Усевалада Мсціславіча замест "прошчанікі". У пазнейшых крыніцах гэты тэрмін ужываецца ў значэнні адпушчаных на волю.

**Радовічы** – асобы, якія наймаліся на службу да землеўладальніка па "ряду" (дамове). Працавалі на феадала, маглі займаць дробныя адміністрацыйныя пасады ў баярскіх або княжацкіх вотчынах.

**Ратнікі, ратныя людзі, воі** – народнае апалчэнне ў старажытнай Русі, называліся так у адрозненне ад дружыннікаў – пастаяннага войска

князя і баяраў. Ратнікі набіраліся на час вядзення войнаў і паходаў з гарадскога насельніцтва і сялян.

**Рэзан** – дробная грашовая адзінка ў старажытнай Русі. У XI ст. складала прыблізна 0,98 г срэбра.

**“Руская праўда”** – звод законаў старажытнарускага грамадства, найважнейшая крыніца па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Кіеўскай Русі і рускіх княстваў перыяду раздробленасці. Складалася на працягу XI–XII стст. Вядомая болей чым у 100 спісах (копіях). Па сваім змесце дзеліцца на 3 рэдакцыі: “кароткую”, “прастранную” і “скарочаную”. “Кароткая праўда” складаецца з “Праўды Яраслава”, “Праўды (“Устава“) Яраславічаў”, “Пакона (закона) вірнага”, “Урока мостнікам”. “Прастранная праўда” дзеліцца на “Суд Яраслава Уладзіміравіча”, “Праўда Руская” і “Устаў Уладзіміра Усеваладавіча”. “Скарочаная праўда” не ўтрымлівае новых падзелаў і ўяўляе варыянт “прастраннай”. “Руская праўда” рэгулявала прававыя адносіны ў старажытнай Русі, ахоўваючы жыццё і маёмасць розных слаёў старажытнарускага грамадства.

**Ряд** – дагавор, дамова, пагадненне, якое мае юрыдычную сілу. У старажытнай Русі рэгуляваў адносіны паміж князямі, а таксама паміж рознымі катэгорыямі насельніцтва.

**Савет** – дарадчы орган пры вялікім кіеўскім князю (рада, дума). У яго склад уваходзілі “думцы”: “княжы мужы”, баяры, вышэйшае духавенства (у мірны час), а ў час вайны – кіраўнікі саюзнікаў. У вядзенні савета знаходзіліся пытанні заканадаўства, адносін з царквой, знешняй палітыкі.

**Сеньёр** – 1. Буйны зямельны ўласнік, уладальнік сеньярыі (вотчыны). Як феадальны ўласнік, сеньёр меў у падпарадкаванні сялян, а таксама гараджан, якія жылі на тэрыторыі вотчыны; 2. У сістэме васалітэту – гаспадар групы васалаў. Вярхоўны сеньёр тэрыторыі (кароль, князь) называўся *сюзерэнам*. Адрозніваліся свецкія і духоўныя сеньёры.

**Смерды** – сяляне-абшчыннікі ў старажытнай Русі. Першапачаткова свабодныя, па меры развіцця феадальнага васалітэту і захопу абшчынных зямель траплялі ў эканамічную залежнасць ад князёў і баяраў.

**Становішча**, стан – адміністрацыйны цэнтр, месца знаходжання службовых асоб і збірання княскіх збораў.

**Старая чадзь** – родавыя старэйшыны, племянная знаць, якія ўліліся ў сацыяльную структуру Кіеўскай Русі і склалі частку кіруючага класа. Мела прыкметную ролю ў кіраванні на месцах.

**Стараста** – у старажытнай Русі прадстаўнік ніжэйшай княжацкай або баярскай адміністрацыі, звычайна з халопаў. У “Рускай праўдзе” згадваюцца *сельскія* і *ратайныя* старасты. Сельскі стараста, верагодна, кіраваў сельскім

насельніцтвам вотчыны і быў выканаўцам распараджэнняў вышэйшай адміністрацыі. Ратайны наглядаў за вотчыннай раллёй.

**Тмутаракань** – старажытны рускі горад X–XII стст. на Таманскім паўвостраве. Меў вялікую ролю ў гандлёвых сувязях Русі з Усходам. Да X ст. знаходзіўся пад уладай хазар. Пасля разгрому Хазарскага каганата (з канца X ст.) увайшоў у склад Кіеўскай дзяржавы як сталіца Тмутараканскага княства. У ходзе феадальнай дынастычнай барацьбы XI ст. быў апорай сепаратысцкі настроеных князёў. У пачатку XII ст. у сувязі з узмацненнем націску Візантыі і полаўцаў не меў доступу да іншых зямель Русі і спыніў існаванне.

**Тысяцкі** – ваявода, які ўзначальваў старажытнарускае гарадское апалчэнне (“тысячу”). Прызначаўся князем з ліку старэйшых дружыннікаў, часам па ўзгадненні з гарадскім вечам.

**Урок** – уведзены княгіняй Вольгай памер даніны; пастанова, якая вызначае нормы даніны, штрафаў, пошлін і іншых адлічэнняў на карысць князя.

**Цівун** – княскі ці баярскі слуга, які кіраваў рознымі галінамі гаспадаркі, дробная адміністрацыйная пасада ў вотчыне. Вядомы цівуны: *агнішчны* (ведаў домам, “вогнішчам”, дваром); *канюшы* (ведаў стайнямі і табунамі); *сельскі* (кіраваў сёламі); *ратайны* – палявымі працамі і г.д. Большасць цівуноў былі несвабоднымі людзьмі, калі вольны стан не агаворваўся ўмовамі дагавора (“ряда”).

## ТЭСТЫ

1. Каму, згодна з “Аповесцю мінулых гадоў”, была сказана фраза: “Зямля наша вялікая і багатая, а парадку ў ёй няма. Прыходзьце княжыць і валодаць намі”?
   а) весі;
   б) чудзі;
   в) крывічам;
   г) варагам.

2. Старэйшы з трох легендарных братоў, запрошаны на княжанне ў Ноўгарад, згодна з “Аповесцю мінулых гадоў”:
   а) Аскольд;
   б) Рурык;
   в) Трувор;
   г) Кій.

3. Аскольд і Дзір, паводле летапісу, у 862 г. з дазволу Рурыка пайшлі паходам на:
   а) Аварскі каганат;
   б) Хазарскі каганат;
   в) Волжскую Булгарыю;
   г) Візантыю.

4. Кім былі сказаныя словы: “Не князі вы і ня княскага роду, але я княскага роду. А гэта сын Рурыка”?
   а) Аскольдам;
   б) Ігарам;
   в) Алегам;
   г) Дзірам.

5. Старажытнаруская дзяржава Кіеўская Русь утварылася ў:
   а) 882 г.;
   б) 862 г.;
   в) 879 г.;
   г) 866 г.

6. Заснавальнікам старажытнарускай дзяржавы летапісы завуць:
   а) Алега;
   б) Рурыка;
   в) Ігара;
   г) Святаслава.

7. Святаслаў быў найбольш вядомы як:
   а) выбітны дыпламат;
   б) таленавіты ваеначальнік;
   в) заканадаўца;
   г) горадабудаўнік.

8. Кіеўскі князь, у народным паданні Чырвонае Сонейка:
   а) Святаслаў;
   б) Уладзімір;
   в) Ізяслаў;
   г) Алег.

9. Прадстаўнікамі якога племяннога саюза было сказана: “Калі панадзіўся воўк да авечак, то вынесе ўвесь статак, пакуль не заб’юць яго; так і гэты: калі не заб’ём яго, то ўсіх нас загубіць”:
   а) крывічоў;
   б) палян;
   в) радзімічаў;
   г) драўлян.

10. Да часу праўлення якога князя (або княгіні) адносіцца эпізод з “Аповесці мінулых гадоў”: “Імператар жа сустрэў іх у ладдзях з агнём і стаў трубамі пускаць агонь на ладдзі рускіх”:
   а) Алега;
   б) Святаслава;
   в) Ігара;
   г) Вольгі.

11. Хто быў сынам легендарнага варажскага князя Рурыка?
   а) Алег;
   б) Яраслаў;
   в) Святаслаў;
   г) Ігар.

12. Усталяванне ўрокаў і пагостаў звязана з дзейнасцю:
   а) Ігара;
   б) Вольгі;
   в) Святаслава;
   г) Алега.

13. Назавіце імя, прапушчанае ў дадзеным радку з “Аповесці мінулых гадоў”: “І загадаў _____ сваім воінам зрабіць колы і паставіць на колы караблі”:
    а) Святаслаў;
    б) Алег;
    в) Ігар;
    г) Яраполк.

14. Пра каго сказана ў летапісе: “Ён жа не паслухаўся маці, працягваючы жыць па паганскіх звычаях, не ведаючы, што хто маці не паслухаецца – у бяду трапіць”:
    а) пра Святаслава;
    б) пра Ігара;
    в) пра Алега;
    г) пра Яраполка.

15. Які князь прымацаваў свой шчыт да брамы Царграда?
    а) Алег;
    б) Рурык;
    в) Ігар;
    г) Святаслаў.

16. Які горад збіраўся зрабіць сваёй сталіцай князь Святаслаў?
    а) Ноўгарад;
    б) Пераяславец;
    в) Іскорасцень;
    г) Кіеў.

17. “Урокі” – гэта:
    а) устаноўленыя памеры даніны;
    б) месца збору даніны;
    в) доля даніны князя;
    г) доля даніны, якая належыць дружыне.

18. Хто з рускага княскага роду першым прыняў хрысціянства?
    а) Уладзімір;
    б) Вольга;
    в) Святаслаў;
    г) Ігар.

19. Качавыя плямёны, для абароны ад якіх князь Уладзімір паставіў чатыры лініі абарончых рубяжоў:

а) Полаўцы;
б) Печанегі;
в) Булгары;
г) Варагі.

20. Падчас першай рэлігійнай рэформы князь Уладзімір абвясціў галоўным богам:

а) Вялеса;
б) Сварога;
в) Ярылу;
г) Перуна.

21. Перад тым як стаць кіеўскім князем, Уладзімір Святаславіч княжыў:

а) у Драўлянскай зямлі;
б) у Полацку;
в) у зямлі вяцічаў;
г) у Ноўгарадзе.

22. Ахрысціўшыся, Уладзімір ажаніўся з:

а) Прадславай;
б) Вольгай;
в) Ганнай;
г) Рагнедай.

23. Княгіня Вольга здзейсніла:

а) разграміла Хазарскі каганат;
б) правяла падаткавую рэформу;
в) хрысціла Русь;
г) далучыла Кіеў да Ноўгарада.

24. Паводле “Рускай праўды”, ряд – гэта:

а) сельскі жыхар;
б) дагавор;
в) пазыка;
г) зямельнае валоданне.

25. Імя князя, які стаў адным з двух першых рускіх святых:

Развіццё феадальнай уласнасці і яе новых форм выклікала далейшае ***ўмацаванне залежнасці і эксплуатацыі сельскага насельніцтва.*** Сялянства выразна дзялілася на *дзве катэгорыі*: 1) *чорныя сяляне*, якія не належалі асобным феадалам, жылі абшчынамі ў сёлах; 2) *уладальніцкія сяляне*, феадальна залежнае сельскае насельніцтва, якое жыло на феадальных надзелах у сістэме феадальнай вотчыны. Чорныя сяляне плацілі феадальнай дзяржаве *зямельную рэнту*, падвяргаючыся падаткаваму абкладанню. У больш складаным становішчы знаходзіліся ўладальніцкія сяляне, ступень залежнасці і эксплуатацыі якіх ад феадала была рознай. *Старажыльцы* – асноўнае феадальна залежнае сельскае насельніцтва, якое спрадвеку жыло на зямлі феадала і выконвала павіннасці. *Сярэбранікі* – катэгорыя залежнага насельніцтва, якое за пазыку срэбрам выплачвала працэнты грашыма ці адпрацоўкай павіннасцей. *Палоўнікі* – феадальна залежнае насельніцтва з малазямельных сялян-абшчыннікаў, халопаў-адпушчаннікаў і збяднелых гараджан, якія атрымалі ад феадала зямельны надзел за палову сабранага ўраджаю. *Навапрыходцы* – прышлыя на зямлю феадала сяляне, якія атрымлівалі надзелы, на некалькі гадоў вызваляліся ад падаткаў і паступова траплялі ў феадальную залежнасць. *Ізорнікі, агароднікі, качэтнікі* – феадальна залежныя сяляне ў Пскоўскай зямлі, плацілі феадалу аброк чвэрць ураджаю і выконвалі пэўныя павіннасці. *Сіраты* – хатнія халопы свецкіх феадалаў у XII–XIII стст., найбольш запрыгоненае сялянскае насельніцтва ў XIV–XV стст. Формай эксплуатацыі сялян была *адпрацовачная (паншчына)* ці *харчовая (аброк)* рэнта, памеры якіх вызначаліся феадалам у залежнасці ад мясцовых умоў. Асноўная маса ўласніцкіх сялян захоўвала права свабоднага пераходу ад аднаго феадала да другога.

***Функцыі гарадоў у перыяд феадальнай раздробленасці.*** Ажыўленне сельскай гаспадаркі садзейнічала аднаўленню і росту *гарадоў* як цэнтраў феадальнай улады і культуры, рамяства і гандлю. Асноўная маса гарадскіх рамеснікаў працавала на заказ, сумяшчаючы рамесніцтва з земляробствам. З'яўляліся майстры, якія працавалі на рынак, але іх было няшмат. Побач з феадальнай знаццю пануючае становішча ў гарадах займала *купецтва*, вярхушку якога складалі *госці* – купцы, якія ажыццяўлялі замежны гандаль. Яны мелі і свае вотчыны, набліжаючыся да феадальнай знаці.

***Сістэма рускай феадальнай іерархіі*** ўключала ў сябе чатыры ступені. На верхняй узвышаўся *вялікі князь* – вярхоўны правіцель рускіх зямель. Другую прыступку займалі яго васалы – *удзельныя князі*, якія мелі правы суверэнных уладальнікаў у межах сваіх удзелаў. На трэцяй ступені

знаходзіліся васалы ўдзельных князёў, буйнейшыя феадалы-землеўладальнікі – *баяры і служылыя князі,* якія страцілі правы ўдзельных. Ніжэйшую ступень феадальнай іерархіі займалі *слугі пад дворскім (дваране і дзеці баярскія)* – кіравалі княскай гаспадаркай, складалі княскую і баярскую феадальную адміністрацыю, атрымлівалі ад свайго сюзерэна надзелы зямлі за службу. Пастулова да гэтай катэгорыі сталі набліжацца і атрымліваць феадальны статус *канюшыя, стольнікі, чашнікі, лоўчыя, сакольнічыя, дзякі,* першапачаткова слугі княскага двара, якія складалі аснову адміністратыўна-бюракратычнага штату дзяржавы.

**Узвышэнне Маскоўскага княства.** ***Прычыны ўзвышэння Масквы.*** Татара-мангольскае нашэсце і залатаардынскае ярмо прывялі да таго, што цэнтр рускага эканамічнага і палітычнага жыцця перамясціўся на паўночны ўсход былой Кіеўскай дзяржавы. Тут, ва Уладзіміра-Суздальскай Русі, узніклі буйныя палітычныя цэнтры, сярод якіх вядучае месца заняла Масква, якая ўзначаліла барацьбу за звяржэнне залатаардынскага прыгнёту і аб'яднанне рускіх зямель. Маскоўскае княства ў параўнанні з іншымі рускімі землямі займала больш выгаднае геаграфічнае становішча. Яно знаходзілася на скрыжаванні рачных і сухапутных шляхоў, якія можна было выкарыстоўваць як для гандлю, так і для ваенных мэтаў. На найбольш небяспечных накірунках, адкуль магла паўстаць агрэсія, Масква была прыкрыта іншымі рускімі землямі, што прыцягвала сюды жыхароў, дазваляла маскоўскім князям збіраць і назапашваць сілы.

Значную ролю ў лёсе Маскоўскага княства адыграла і актыўная палітыка маскоўскіх князёў. Будучы малодшымі князямі, уладальнікі Масквы не маглі спадзявацца заняць велікакняскі стол па старшынстве. Іх становішча залежала ад іх уласных дзеянняў, ад становішча і сілы іх княства, яны паступова сваё княства ператвараюць у самае моцнае. Першым самастойным маскоўскім удзельным князем, родапачынальнікам маскоўскай княжацкай дынастыі стаў у 1276 г. малодшы сын Аляксандра Неўскага *Данііл* (1276–1303). Атрымаўшы невялікі і небагаты надзел, ён значна пашырыў яго. Першараднае значэнне для гандлю маскоўскага княства меў кантроль за ўсім цягам ракі Масквы. Вырашаючы гэтую задачу, Данііл Аляксандравіч у 1301 г. адабраў у разанскага князя Каломну, размешчаную ў вусці Масквы-ракі. У 1302 г. Даніілу Маскоўскаму быў адпісаны Пераяслаўскі ўдзел, які быў канчаткова далучаны да Масквы яго сынам *Юрыем Даніілавічам* (1303–1325). У 1303 г. да Масквы быў далучаны Мажайск, які ўваходзіў да гэтага ў склад Смаленскага княства. Пры Юрыю Даніілавічу Маскоўскае княства стала адным з наймацнейшых у Паўночна-Усходняй Русі. Юрый уступіў у барацьбу за вялікае княжанне ўладзімірскае. Ключавое значэнне ў гэтых

падзеях меў перанос у 1326 г. у Маскву кафедры Кіеўскага мітрапаліта, якая ў 1299 г. была перанесена з Кіева ва Уладзімір.

***Перадумовы аб'яднання рускіх зямель.*** Да XIV ст. складваюцца перадумовы аб'яднання рускіх зямель. Працэс утварэння цэнтралізаваных (нацыянальных) дзяржаў у Еўропе ў гэтую эпоху быў звязаны з разбурэннем натуральнай гаспадаркі, умацаваннем эканамічных сувязяў паміж рознымі рэгіёнамі і з'яўленнем буржуазных адносін. Эканамічны ўздым быў прыкметны і на Русі ў XIV–XV стст., ён адыграў немалую ролю ў фарміраванні цэнтралізаванай дзяржавы, аднак у цэлым гэта фарміраванне адбывалася, у адрозненне ад Еўропы, на чыста феадальнай аснове. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгралі інтарэсы баяраў, вотчыны якіх перарасталі межы княстваў. Нарэшце, важную, калі не вырашальную ролю ў аб'яднальным працэсе адыграла барацьба супраць знешняй, у першую чаргу ардынскай, небяспекі.

***Барацьба за вялікае княжанне ўладзімірскае. Саперніцтва паміж Маскоўскім і Цвярскім княствамі.*** Спробы прымірэння і канчатковага вырашэння тэрытарыяльна-дынастычных спрэчак не мелі доўгатэрміновых наступстваў. Напрыклад, *Дзмітраўскі з'езд князёў* у 1300–1301 гг., на які прыехалі бліжэйшыя родзічы Аляксандра Неўскага (яго сыны – уладзімірскі князь Андрэй Аляксандравіч і маскоўскі князь Данііл Аляксандравіч, унук – пераяслаўскі князь Іван Дзмітрыевіч і пляменнік – цвярскі князь Міхаіл Яраславіч), нягледзячы на агульны дружалюбны тон, не прадухіліў наступнае вострае саперніцтва паміж цвярскімі і маскоўскімі князямі за ярлык на вялікае княжанне.

Галоўнымі сапернікамі маскоўскіх князёў у барацьбе за вялікае княжанне ўладзімірскае былі цвярскія князі, якія, як прадстаўнікі больш старэйшай галіны, мелі больш правоў на велікакняскі стол. У 1304 г. ярлык на вялікае княжанне атрымаў цвярскі князь *Міхаіл Яраславіч* (1304–1319). Гэты князь імкнуўся да поўнаўладнага праўлення ва ўсёй Русі, некалькі разоў спрабаваў сілай падпарадкаваць сабе Ноўгарад.

Аднак узмацненне якога-небудзь аднаго рускага княства было нявыгадна Залатой Ардзе. У 1317 г. у Арду быў выкліка괎ы маскоўскі князь Юрый, які парадніўся з ханам Узбекам: сястра хана Канчака (у хрышчэнні Агафія) стала жонкай Юрыя, што ўмацавала яго становішча. Князь Юрый дамогся таксама і ярлыка на вялікае княжанне. Для падтрымкі маскоўскага князя з ім было накіравана ардынскае войска. Імкнучыся пазбегнуць адкрытага сутыкнення з Ардой, Міхаіл Цвярскі адмовіўся ад вялікага княжання на карысць маскоўскага князя. Аднак спусташэнні, якім падвяргаліся цвярскія землі з боку маскоўскага і ардынскага войскаў, прывялі да ваенных сутыкненняў паміж маскоўска-ардынскімі атрадамі і цвярскімі дружынамі. Падчас *Бярценеўскай бітвы* маскоўскія войскі былі

разбітыя; брат князя Юрыя і яго жонка трапілі ў палон да цверычан. Загадкавая смерць маскоўскай княгіні Канчакі ў цвярскім палоне спарадзіла чуткі аб яе атручванні. Не жадаючы абвастраць адносіны з ханам Узбекам, Міхаіл Цвярскі заключыў з татарамі мір. У 1318 г. цвярскі і маскоўскі князі былі выкліканы ў стаўку Залатой Арды. Міхаіл Яраславіч быў абвінавачаны ў нявыплаце даніны, атручванні ханскай сястры, непаслушэнстве ханскаму паслу і пакараны смерцю. Князь Юрый зноў атрымаў ярлык на вялікае княжанне.

***Паўстанне ў Цвяры 1327 г. Узмацненне Маскоўскага княства пры Іване Каліце і яго пераемніках.*** У 1325 г. у ханскай стаўцы Юрый Данілавіч быў забіты старэйшым сынам Міхаіла Цвярскога – *Дзмітрыем,* які быў пакараны татарамі за гэты ўчынак смерцю, але ярлык на вялікае княжанне быў аддадзены цвярскім князям. Палітыка перадачы ярлыка князям з саперніцкіх родаў дазваляла ардынскім ханам перашкаджаць аб’яднанню намаганняў рускіх князёў, давала нагоду для частай прысылкі на Русь ардынскіх атрадаў, каб трымаць пад кантролем сітуацыю ў рускіх землях. Разам з вялікім князем *Аляксандрам Міхайлавічам,* цвярскім князем, хан Узбек паслаў свайго пляменніка *Чалхана* (на Русі яго называлі Щелканом) у якасці зборшчыка даніны. Ён павінен быў таксама ажыццяўляць пастаянны кантроль за вялікім князем. У 1327 г. свавольства і гвалт, якімі суправаджаўся збор даніны атрадам Чалхана, выклікалі паўстанне ў Цвяры. Татарскі атрад быў знішчаны цверычамі.

Гэтым скарыстаўся маскоўскі князь *Іван Даніілавіч,* які атрымаў характэрную мянушку *Каліта* (1325–1340). Ён узначаліў карную экспедыцыю, арганізаваную ардынцамі. У выніку гэтай меры Цвярская зямля падвергнулася знішчальнаму пагрому, які надоўга вывеў яе з палітычнай барацьбы. Князь Аляксандр Міхайлавіч збег спачатку ў Пскоў, а пазней у Літву. Малодшыя сыны Міхаіла Цвярскога *Канстанцін* і *Васіль* не маглі змагацца з моцным і хітрым маскоўскім князем. З 1328 г. ярлык на вялікае княжанне зноў апынуўся ў руках маскоўскага князя. Акрамя гэтага, Іван Каліта атрымаў права збору ардынскага *выхаду* (даніны), сістэма басмацтва была канчаткова адменена. Права збору даніны давала маскоўскаму князю значныя перавагі. Збор даніны вялікім князем рабіў рэгулярнымі сувязі паміж рускімі княствамі. Саюз рускіх княстваў, які ўзнік першапачаткова як паднявольны і фінансавы, з часам пашырыў сваё палітычнае значэнне і паслужыў асновай для аб’яднання розных зямель. Пры Іване Каліце працягвалася тэрытарыяльнае пашырэнне Маскоўскага княства. У гэты час яно адбывалася шляхам куплі князем зямель у розных частках краіны. Іван Каліта набыў у Ардзе ярлыкі і на цэлыя ўдзельныя княствы – Угліч, Галіч, Растоў, Мурам. На працягу ўсяго свайго княжання ён падтрымліваў самыя цесныя кантакты з ардынскімі ханамі: спраўна

плаціў выхад, пасылаў хану, яго жонкам і вяльможам падарункі, сам часта ездзіў у Арду.

Гэтая палітыка дазволіла забяспечыць Маскоўскаму княству працяглую мірную перадышку. Амаль 40 гадоў яно не падвяргалася нападам. Маскоўскія князі не толькі змаглі ўмацаваць свае княства, але і назапасіць значныя ваенныя сілы. Гэтая перадышка мела і вялікае маральна-псіхалагічнае значэнне. Пакаленні рускіх людзей, якія выраслі за гэты час, не ведалі страху перад ардынцамі, які часта паралізоўваў волю іх бацькоў. Менавіта гэтыя пакаленні ўступілі ў хуткім часе ва ўзброеную барацьбу з Ардой.

Мудрая палітыка Івана Каліты стварыла яму такі аўтарытэт у Ардзе, што яго сыны *Сімяон Горды* (1340–1353) і *Іван Красны* (1353–1359) не мелі канкурэнтаў пры атрыманні ярлыка на вялікае княжанне. Ужо Сімяон Горды, акрамя збору даніны, валодаў пэўнымі судовымі правамі ў дачыненні да рускіх князёў.

Апошні сын Каліты Іван Красны памёр, калі яго пераемніку – сыну Дзмітрыю – споўнілася 9 гадоў. Маленствам маскоўскага князя скарыстаўся Суздальска-Ніжагародскі князь *Дзмітрый Канстанцінавіч* (1359–1363). Аднак, акрамя маскоўскіх князёў, у замацаванні вялікага княжання за маскоўскай дынастыяй была зацікаўлена яшчэ адна сіла – маскоўскае баярства. Баярскі ўрад, які існаваў пры малалетнім князю, на чале з *мітрапалітам Алексіем* шляхам дыпламатычных перамоў у Ардзе і ваеннага націску на Суздальска-Ніжагародскага князя дамогся ад яго адмовы ад вялікага княжання на карысць князя *Дзмітрыя Іванавіча* (1363–1389). Князь Дзмітрый Іванавіч і баярскі ўрад паспяхова ўмацоўвалі магутнасць Маскоўскага княства. Сведчаннем ўзрослага эканамічнага і палітычнага значэння Масквы стала будаўніцтва ў 1367 г. белакаменнай крэпасці – Крамля.

***Барацьба за велікакняжацкі ярлык паміж Масквой і Цвер'ю ў 60–70-я гг. XIV ст. Дзмітрый Данскі.*** У канцы 60-х гг. XIV ст. пачынаецца новы этап маскоўска-цвярской барацьбы. Сапернікам маскоўскага князя выступіў сын Аляксандра Міхайлавіча Цвярскога *Міхаіл*. Аднак Цвярское княства ўжо не магло самастойна супрацьстаяць Маскве. Таму Міхаіл Аляксандравіч прыцягнуў у якасці саюзнікаў Літву і Арду, што прывяло да страты цвярскім князем аўтарытэту сярод рускіх князёў. Тры паходы на Маскву літоўскага князя *Альгерда* 1368, 1370 і 1372 гг. скончыліся безвынікова, так як літоўцы не змаглі ўзяць каменных маскоўскіх сцен.

У 1371 г. Міхаіл Аляксандравіч атрымаў у Ардзе ярлык на вялікае княжанне. Аднак ні маскоўскі князь Дзмітрый, ні жыхары рускіх гарадоў не прызналі яго вялікім князем. У 1375 г. маскоўскі князь Дзмітрый

Іванавіч арганізаваў паход на Цвер. Гэты паход ўжо не быў толькі маскоўскім: у ім прымалі ўдзел атрады суздальскага, старадубскага, яраслаўскага, растоўскага і іншых князёў. Гэта азначала прызнанне імі верхавенства маскоўскага князя ў Паўночна-Усходняй Русі. Жыхары Цвяры таксама не падтрымалі свайго князя, запатрабаваўшы ад яго заключэння міру. Згодна з дамовай 1375 г. паміж Дзмітрыем Іванавічам Маскоўскім і Міхаілам Аляксандравічам Цвярскім, цвярскі князь прызнаваў сябе «братом молодшим» маскоўскага князя, адмаўляўся ад прэтэнзіяў на вялікае княжанне, ад самастойных зносін з Літвой і Ардой. З гэтага часу тытул вялікага князя Уладзімірскага становіцца здабыткам маскоўскай дынастыі. Сведчаннем узрослай ролі Масквы стала перамога рускіх войскаў на чале з князем Дзмітрыем Іванавічам над татарамі на берагах р. Дон на *Куліковым полі ў 1380 г.* Маскоўскі князь атрымаў ганаровую мянушку – *Данскі.* Масква была прызнана як тэрытарыяльны і нацыянальны цэнтр Рускай дзяржавы. З гэтага часу ў яго фарміраванні прасочваюцца два працэсы: цэнтралізацыя і канцэнтрацыя ўлады ў руках вялікага князя ўнутры Маскоўскага княства і далучэнне да Масквы новых зямель, якая прыняла ў хуткім часе характар і значэнне дзяржаўнага аб'яднання.

**Паказальнік асноўных гістарычных падзей**

**1132** – смерць князя кіеўскага Мсціслава Уладзіміравіча. Гэты момант лічыцца пачаткам перыяду раздробленасці і феадальных войнаў. У Кіеве пачынае княжыць Яраполк, сын Уладзіміра Манамаха (1132–1139).

**1136** – выгнанне Усевалада Мсціславіча з Ноўгарада па рашэнні веча. Пачатак эпохі незалежнасці Ноўгарада.

**1147** – першае летапіснае ўпамінанне аб Маскве, заснаванай суздальскім князем Юрыем Даўгарукім, сынам Уладзіміра Манамаха.

**1147** – раскол паміж кіеўскай мітраполіяй і епархіямі Ноўгарада, Смаленска, Полацка і Суздаля з-за таго, што па жаданні Ізяслава Мсціславіча сабор рускіх епіскапаў сам, без блаславення патрыярха Канстанцінопальскага паставіў мітрапалітам Клімента Смаляціча.

**1153–1187** – княжанне Яраслава Асмамысла ў Галічы.

**1157–1174** – княжанне Андрэя Багалюбскага ва Уладзіміры.

**1169** – захоп Кіева Андрэем Багалюбскім "на шчыт". Кіеў узяты і разрабаваны войскам Андрэя Багалюбскага, які ставіць на кіеўскі пасад свайго малодшага брата Глеба і такім чынам адбірае ў кіеўскай княжацкай улады вярхоўную палітычную ролю, сімвалічна выражаемую тытулам вялікага князя. Гэты тытул Андрэй прысвойвае сабе і пераносіць на Уладзімірскае княства.

**1170** – аблога аб’яднанымі рускімі войскамі Ноўгарада, перамога наўгародцаў з дапамогай цудадзейнай іконы Святой Багародзіцы.

**1174** – забойства баярамі Андрэя Багалюбскага ў яго палацы ў Багалюбаве. Першая згадка ў летапісе тэрміна “дваране”.

**1176–1212** – княжанне Усевалада Вялікае Гняздо ў Суздалі.

**1176** – Ліпіцкая бітва. Усевалад Вялікае Гняздо ўшчэнт разбіў войска Мсціслава Расціславіча, які з вялікімі стратамі збег у Растоў.

**1185** – няўдалы паход князя Ігара на полаўцаў, які паслужыў падставай для напісання “Слова пра паход Ігараў”.

**1199** – Раман Мсціславіч (князь Валынскі з 1170) аб’ядноўвае Валынь і Галічыну пад сваёй уладай.

**1206** – усемангольскі курултай ля вытокаў ракі Анон, на якім Цемучын быў абвешчаны Чынгісханам і аб’яўлена аб стварэнні Вялікай Мангольскай дзяржавы.

**1212** – смерць Усевалада Юр’евіча Вялікае Гняздо, які назваў сваім пераемнікам другога сына, Юрыя. Старэйшы ж, Канстанцін, адмаўляецца прызнаць бацькава рашэнне і ідзе вайной на Юрыя.

**1216** – Ліпіцкая бітва паміж Уладзіміра-Суздальскай арміяй Яраслава і Юрыя Усеваладавічаў і наўгародска-пскоўска-смаленска-растоўскім войскам Мсціслава Удалога, Канстанціна Усеваладавіча і інш. Скончылася паразай Яраслава і Юрыя, прывяла да ўзмацнення палітычнай ролі Ноўгарада.

**1219** – смерць Канстанціна Усеваладавіча, спадкаемцам якога стаў Юрый Усеваладавіч.

**1223** – бітва на Калцы. Аб’яднаныя руска-палавецкія войскі былі разгромлены мангола-татарамі.

**1229** – Смаленская гандлёвая праўда, дамова Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і Гоцкім берагам, замацавала права бесперашкоднага і бяспошліннага гандлю па Заходняй Дзвіне.

**1237** – пачатак нашэсця мангола-татараў на Паўночна-Усходнюю Русь.

**1237** – аб’яднанне Лівонскага і Тэўтонскага ордэнаў.

**1238** – бітва на рацэ Сіць, разгром мангола-татарамі войскаў Юрыя Усеваладавіча, які быў забіты.

**1238** – пачатак вялікага княжання Яраслава Усеваладавіча (1238–1246).

**1240** – Неўская бітва, шведы разгромлены рускім войскам пад кіраўніцтвам Аляксандра Яраславіча (Неўскага). Неўзабаве пасля гэтага яго выганяюць з Ноўгарада па рашэнні веча.

**1240** – узяцце і разбурэнне мангола-татарамі Кіева.

**1242** – “Лядовае пабоішча” – перамога Аляксандра Неўскага над нямецкімі рыцарамі Тэўтонскага ордэна на Чудскім возеры.

**1249** – Уладзімірскі велікакняскі стол займае Андрэй Яраславіч (1249–1252).

**1250–1252** – барацьба братоў Аляксандра Яраславіча Неўскага і Андрэя Яраславіча за велікакняскі стол.

**1252** – велікакняскі пасад займае Аляксандр Неўскі (1252–1263).

**1257–1259** – праведзены перапіс рускага насельніцтва (за выключэннем царкоўнаслужыцеляў) манголамі для вызначэння памеру даніны («выхаду») Залатой Ардзе, які суправаджаўся неаднаразовымі паўстаннямі славян супраць мангольскіх уладаў.

**1257** – паўстанне ў Ноўгарадзе супраць перапісу, навязанага манголамі і праведзенага пры падтрымцы Аляксандра Неўскага.

**1262** – мангола-татарскія зборшчыкі падаткаў («данщики») былі выгнаны з Растова, Уладзіміра, Суздаля і Яраслаўля.

**1263** – велікакняжацкі пасад ва Уладзіміры займае Яраслаў Яраславіч Цвярскі (1263–1272).

**1268** – Ракаворская бітва аб'яднаных войскаў наўгародцаў, пскавічоў, пераяслаўцаў і суздальцаў з дацка-нямецкімі рыцарамі ў Эстоніі.

**1272** – велікакняскі пасад ва Уладзіміры займае Васіль Яраславіч Кастрамскі (1272–1276).

**1276** – Данііл, сын Аляксандра Неўскага, атрымаў Маскву ва ўдзельнае валоданне (1276–1303).

**1276–1294** – барацьба сыноў Аляксандра Неўскага – Дзмітрыя і Андрэя – за велікакняскі стол ва Уладзіміры.

**1293** – "Дюденева рать" – спусташэнне Суздаля, Уладзіміра, Пераяслаўля, Юр'ева мангольскім атрадам Дзюдзені, які быў прысланы па просьбе Андрэя Аляксандравіча для барацьбы з братам Дзмітрыем.

**1294** – смерць Дзмітрыя Аляксандравіча, яго брат Андрэй канчаткова займае вялікае княжанне (1294–1304).

**1299** – Кіеўская мітраполія была перанесена ва Уладзімір мітрапалітам Максімам.

**1303** – Юрый Даніілавіч, сын Данііла Аляксандравіча, становіцца князем Маскоўскім (1303–1325).

**1304** – велікакняскі стол ва Уладзіміры займае Міхаіл Яраславіч Цвярскі (1304–1318).

**1317** – шлюб Юрыя Маскоўскага з сястрой хана Залатой Арды Узбека – Канчакай (Агаф'яй); Юрый атрымлівае ярлык на вялікае княжанне ўладзімірскае.

**1318** – Бярценеўская бітва, вялікі князь Міхаіл Цвярскі разбівае войска Юрыя Данілавіча і бярэ ў палон яго жонку.

**1319** – Міхаіл Цвярскі, абвінавачаны Юрыем у атручванні сястры вялікага хана, едзе на суд у Арду, дзе яго забіваюць.

**1322** – хан Залатой Арды дае ярлык на вялікае княжанне Дзмітрыю Міхайлавічу Цвярскому (Грозныя Вочы).

**1325** – Юрый Данілавіч быў забіты ў Залатой Ардзе Дзмітрыем Цвярскім, якога самога за гэта караюць смерцю. Вялікім князем становіцца брат Дзмітрыя – Аляксандр Цвярскі, Іван Данілавіч (Каліта) становіцца князем Маскоўскім.

**1326** – Мітрапаліт кіеўскі Пётр перанес мітрапаліцкую рэзідэнцыю ў Маскву.

**1327** – паўстанне ў Цвяры, «Шчалканава раць».

**1328** – падаўленне паўстання ў Цвяры Іванам Калітой, атрыманне ім велікакняскага ярлыка (1328–1340).

**1341** – княскі стол у Маскве займае Сімяон Горды, сын Івана Каліты, ён жа вялікі князь Уладзімірскі (з 1341 па 1353).

**1353** – смерць Сімяона Гордага ад чумы, увакняжанне Івана Іванавіча Краснага (1353–1359).

**1359** – смерць Івана Краснага, заняцце ўладзімірскага велікакняжацкага стала Дзмітрыем Суздальскім. Мітрапаліт Алексій часова кіруе Маскоўскім княствам.

**1363** – пры падтрымцы маскоўскіх баяраў мітрапаліт Алексій дамогся ад Залатой Арды тытула вялікага князя для Дзмітрыя, сына Івана Краснага. Пачатак вялікага княжання Дзмітрыя Іванавіча (1363–1389).

**1375** – паход Дзмітрыя Данскога супраць Цвяры. Цвер адмовілася ад прэтэнзій на вялікае княжанне. Міхаіл Цвярскі вымушаны прасіць міру ў Дзмітрыя і прызнаць над сабой старшынство князя Маскоўскага.

**1378** – бітва на Вожы паміж рускай раццю і залатаардынскім войскам Бегіча.

**1380** – Кулікоўская бітва – перамога аб'яднанага рускага войска пад камандаваннем маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча над ханам Мамаем. Дзмітрый атрымлівае мянушку Данскі.

**1382** – нашэсце хана Тахтамыша на Маскву.

**Гістарычныя дзеячы**

**Алексій** – мітрапаліт кіеўскі ў 1354–1378 гг., у часы малалецтва Дзмітрыя Данскога часова кіраваў Маскоўскім княствам, дамогся для яго ў 1363 г. пры падтрымцы маскоўскіх баяраў ад Залатой Арды тытула вялікага князя.

**Аляксандр Міхайлавіч** – князь цвярскі, у 1325–1327 гг. вялікі князь уладзіміра-суздальскі.

**Аляксандр Яраславіч Неўскі** – князь наўгародскі, уладзіміра-суздальскі (1252–1263), перамог шведскіх рыцараў у бітве на Няве (1240) і нямецкіх рыцараў на Чудскім возеры (1242), у адносінах з мангола-татарамі праводзіў палітыку супрацоўніцтва.

**Андрэй Аляксандравіч** – вялікі князь уладзіміра-суздальскі (1281–1283, 1294–1304), сын Аляксандра Неўскага, змагаўся за ўладу са сваім братам Дзмітрыем.

**Андрэй Багалюбскі** – сын Юрыя Даўгарукага, князь уладзіміра-суздальскі (1157–1174), у 1169 г. захапіў Кіеў, перанёс сталіцу ва Уладзімір.

**Андрэй Яраславіч** – трэці сын вялікага князя Яраслава Усеваладавіча, вялікі князь уладзімірскі (1248–1252).

**Батый** – залатаардынскі хан, сын Джучы, унук Чынгісхана. У 1237–1240 гг. заваяваў Паўночна-Усходнюю і Паўднёвую Русь.

**Бегіч** – залатаардынскі цемнік, які ў 1378 г. кіраваў войскамі Мамая ў прайгранай ім бітве на Вожы супраць маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча.

**Берке, Менгу-Цемір, Туда-Менгу, Тула-Буга, Тохта, Узбек, Цінібек, Джанібек, Бердыбек, Тахтамыш** – нашчадкі Чынгісхана, залатаардынскія ханы.

**Васіль Яраславіч** – князь кастрамскі, вялікі князь уладзіміра-Суздальскі (1272–1276).

**Данііл Раманавіч** – галіцка-валынскі князь у 1205–1264 гг., змагаўся з Залатой Ардой, абапіраючыся на падтрымку Рымскага папы.

**Дзмітрый Аляксандравіч** – вялікі князь уладзіміра-суздальскі (1276–1281, 1283–1294), сын Аляксандра Неўскага, змагаўся за ўладу са сваім братам Андрэем.

**Дзмітрый Іванавіч Данскі** – вялікі князь маскоўскі і ўладзіміра-суздальскі (1363–1389), атрымаў перамогу ў Кулікоўскай бітве.

**Дзмітрый Міхайлавіч** (Грозныя Вочы) – князь цвярскі, у 1322–1325 гг. вялікі князь уладзіміра-суздальскі.

**Дзмітрый Суздальскі** – вялікі князь уладзіміра-суздальскі ў 1359–1363 гг. – у часы малалецтва Дзмітрыя Данскога.

**Дзюдень** – брат хана Тахты, у 1293 г. "Дюденева рать" ажыццявіла спусташальнае нашэсце на Паўночна-Усходнюю Русь па запрашэнні сына Аляксандра Неўскага – Андрэя ў яго барацьбе супраць брата Дзмітрыя.

**Іван Каліта** – князь маскоўскі (1325–1340) і вялікі князь уладзіміра-суздальскі (1328–1340).

**Іван Красны** – князь маскоўскі і вялікі князь уладзімірскі (1353–1359).

**Канстанцін Усеваладавіч** – сын Усевалада Вялікае Гняздо, князь уладзіміра-суздальскі (1216–1219), пазбаўлены бацькам – Усеваладам Вялікае Гняздо – тытула вялікага князя (атрымаў яго пасля перамогі ў Ліпіцкай бітве 1216 г. над сваім братам Юрыем).

**Канчака (Агаф’я)** – жонка Юрыя Данілавіча, сястра хана Узбека, атручана ў 1318 г. у цвярскім палоне пасля перамогі Міхаіла Цвярскога над Юрыем Данілавічам і Каўгадыем.

**Каўгадый** – военачальнік залатаардынскага хана Узбека, дапамагаў Юрыю Данілавічу ў барацьбе з Міхаілам Цвярскім, удзельнічаў у Бярценеўскай бітве 1318 г. Нечакана памёр у 1319 г.

**Максім** – кіеўскі мітрапаліт, у 1299 г. перанёс сталіцу Кіеўскай мітраполіі ва Уладзімір.

**Мамай** – беклярбек і цемнік Залатой Арды, у 1361–1380 гг. узурпатар ханскай улады ў Залатой Ардзе. Прайграў Кулікоўскую бітву.

**Міхаіл Аляксандравіч** – цвярскі князь, у 1375 г. пасля паходу Дзмітрыя Данскога вымушаны прасіць міру і прызнаць над сабой старшынство князя Маскоўскага, адмовіўся ад прэтэнзій на вялікае княжанне.

**Міхаіл Яраславіч Харабрыт** – вялікі князь уладзімірскі (1248) і маскоўскі (1246–1248), адбудаваў Маскву пасля мангола-татарскага спусташэння.

**Міхаіл Яраславіч** – цвярскі князь, у 1304–1318 гг. вялікі князь уладзіміра-суздальскі.

**Пётр** – кіеўскі мітрапаліт у 1308–1326, перанёс у 1326 г. мітрапаліцкую рэзідэнцыю ў Маскву, меў вялікі ўплыў на Івана Каліту.

**Раман Мсціслававіч** – галіцкі і валынскі князь, у 1199 г. аб’яднаў Галіцкую і Валынскую землі.

**Сартак** – старэйшы сын Батыя, праўнук Чынгісхана, па некаторых звестках, прыняў хрысціянства. У 1252 г. накіраваў супраць Андрэя Яраславіча, які заключыў саюз з Даніілам Галіцкім, “Неврюеву рать”. Падтрымліваў Аляксандра Неўскага. Хан Залатой Арды ў 1255–1256 гг.

**Святаслаў Усеваладавіч** – вялікі князь уладзімірскі (1246–1248), сын Усевалада Вялікае Гняздо.

**Сергій Раданежскі** (1314–1392) – святы прападобны Рускай праваслаўнай царквы, заснавальнік Троіца-Сергіевай лаўры, запэўніў Дзмітрыя Іванавіча ў неабходнасці змагання з мангола-татарамі, благаславіў яго на Кулікоўскую бітву.

**Субэдэй** – палкаводзец, саратнік Чынгісхана, адзін з кіраўнікоў Заходняга паходу Батыя ў 1236–1242 гг.

**Сямён Горды** – сын Івана Каліты, князь маскоўскі і вялікі князь уладзімірскі з 1340 па 1353 гг., памёр ад чумы.

**Тахтамыш** – залатаардынскі хан у 1380–1395 гг., забіў Мамая, у 1382 г. захапіў і спаліў Маскву.

**Угэдэй** – сын Чынгісхана, “Хан ханаў” Мангольскай імперыі ў 1229–1241 гг.

**Усевалад Вялікае Гняздо** – сын Юрыя Даўгарукага, князь уладзіміра-суздальскі (1176–1212).

**Цемучын (Чынгісхан)** – заснавальнік мангольскай дзяржавы, у 1206 г. быў абраны Чынгісханам (“вялікім ханам”), выдаў “Вялікую Ясу” – звод законаў.

**Шчалкан (Чол-хан)** – мангольскі баскак, які прыбыў на Русь у 1326 г., свавольствы манголаў прывялі да паўстання ў Цвяры ў 1327 г., у час якога быў забіты.

**Юрый Данілавіч** – князь маскоўскі (1303–1325), сын Данііла Аляксандравіча.

**Юрый Даўгарукі** – сын Уладзіміра Манамаха, князь уладзіміра-суздальскі (1113–1157).

**Юрый Усеваладавіч** – сын Усевалада Вялікае Гняздо, князь уладзіміра-суздальскі (1212–1216; 1219–1238).

**Яраслаў Асмамысл** – князь галіцкі (1152–1187), пры якім у другой палове XII ст. пачалося ўзвышэнне Галіцкага княства.

**Яраслаў Усеваладавіч** – сын Усевалада Вялікае Гняздо, князь уладзіміра-суздальскі (1238–1246).

**Яраслаў Яраславіч** – князь цвярскі, вялікі князь уладзіміра-суздальскі (1263–1272).

**Гістарычныя паняцці**

**Беклярбек** – кіраўнік вобласці, унутранага улуса, адна з двух галоўных адміністратыўных пасад у Залатой Ардзе. У яго функцыі ўваходзіла кіраўніцтва арміяй, знешнімі справамі, суд. Беклярбекамі былі Нагай пры хане Менгу-Ціміру і Мамай пры хане Бердыбеку.

**Бэсэрмэны** – ардынскія зборшчыкі падаткаў на рускіх землях у другой палове XIII ст., як правіла, з ліку мусульманскіх купцоў.

**Вялікая Яса** (манг. – закон вялікай улады) – звод законаў, у 1206 г. выдадзены Чынгісханам на ўсемангольскім курултаі, пастаянна пацвярджаўся яго пераемнікамі.

**Залатая Арда** (улус Джучы) – сярэднявечная дзяржава ў Еўразіі, якая ўзнікла ў выніку мангола-татарскіх заваяванняў, знаходзілася ў складзе Мангольскай імперыі, з 1266 г. пры хане Менгу-Цімуру атрымала поўную незалежнасць, захоўваючы фармальную залежнасць ад імперскага цэнтра. Сталіца – г. Сарай на р. Ахтуба (прыток Волгі). З 1312 г. дзяржаўнай рэлігіяй стаў іслам. Да сярэдзіны XV ст. распалася на некалькі самастойных ханстваў.

**“Запросы”, “поминки”** – падарункі залатаардынскім ханам і іх акружэнню ад рускіх князёў.

**Ізорнікі, агароднікі, качэтнікі** – феадальна залежныя сяляне ў Пскоўскай зямлі, плацілі феадалу аброк чвэрць ураджаю і выконвалі пэўныя павіннасці.

**Копійныя кнігі** – зборнікі спіскаў (копіяў) з грамат на манастырскія зямельныя ўладанні.

**Кулікоўская бітва** – перамога аб'яднаных рускіх войскаў пад кіраўніцтвам маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча 8 верасня 1380 г. мангола-татарскіх войскаў пад кіраўніцтвам Мамая.

**Курултай, хурал** – у мангольскіх народаў орган народнага прадстаўніцтва, усенародны з'езд знаці для вырашэння важнейшых дзяржаўных пытанняў.

**Лядовае пабоішча** – разгром атрада нямецкіх рыцараў войскам наўгародскага князя Аляксандра Неўскага ў 1242 г.

**Наён (бек)** – прадстаўнік родаплемяннай знаці ў мангола-татараў.

**"Няўруева рать"** – карны паход залатаардынскіх войск у 1252 г. пад камандаваннем мангольскага военачальніка Няўруя, накіраваны Сартаком, суправіцелем свайго бацькі Батыя, супраць вялікага князя ўладзімірскага Андрэя Яраславіча ў падтрымку Аляксандра Неўскага.

**Неўская бітва** – перамога наўгародскага князя Аляксандра Яраславіча над шведскімі войскамі на р. Нява ў 1240 г.

**Новапрыходцы** – прышлыя на зямлю феадала сяляне, якія атрымлівалі надзелы, на некалькі гадоў вызваляліся ад падаткаў, пазней траплялі ў феадальную залежнасць.

**Пайцза** – вярыцельная ахоўная грамата ў выглядзе металічнай ці драўлянай пласціны з надпісам аб наданні ханам асаблівых паўнамоцтваў, сімвал дэлегавання ханскай улады. Пры дапамозе шнура ці ланцуга насілася на шыі ці пасе.

**Палоўнікі** – феадальна-залежнае насельніцтва з малазямельных сялян-абшчыннікаў, халопаў-адпушчаннікаў і збяднеўшых гараджан, атрымлівалі ад феадала зямельны надзел за палову сабранага ўраджаю.

**Паўстанне ў Цвяры** – антыардынскае выступленне ў 1327–1328 гг., падаўленае Іванам Калітой.

**Сіраты** – хатнія халопы свецкіх феадалаў у XII–XIII стст., найбольш запрыгоненае сялянскае насельніцтва ў XIV–XV стст.

**Старажыльцы** – асноўнае сельскае насельніцтва, якое спрадвеку жыло на зямлі феадала і выконвала на яго карысць павіннасці.

**Сярэбранікі** – катэгорыя залежнага насельніцтва, якое за пазыку срэбрам выплачвала працэнты грашыма ці адпрацоўкай павіннасцей.

**Тамга** – родавы, фамільны знак, у часы Залатой Арды атрымаў значэнне 'дакумент з ханскай пячаткай', 'грашовы падатак'.

**Тарханныя граматы** – дакумент, які вызваляў землі і іх уладальнікаў ад княскіх павіннасцей, даваў землеўладальнікам імунітэтныя правы.

**Тысяцкі** – кіраўнік народнага апалчэння ў гарадах Русі, у Ноўгарадзе меў значныя адміністратыўна-прадстаўнічыя функцыі.

**Улус** (манг. – племя, народ, войска, дзяржава) – дзяржава ці краіна, удзел ці вобласць імперыі Чынгісхана – улусы сыноў Чынгісхана Чагатая (Чагатайскі улус) і Джучы (Залатая Арда).

**“Федорчукова рать”** – аб’яднанае ардынска-маскоўскае войска, дадзенае Івану Каліце залатаардынскім ханам Узбекам для падаўлення Цвярскога паўстання 1327 г. Назва ідзе ад імя татарскага ваеначальніка – хрысціяніна Федарчука.

**Цемнік** – мангола-татарскі ваеначальнік, пад камандаваннем якога знаходзілася 10 тысяч воінаў.

**“Шчалканава раць”** – мангольскі атрад пад кіраўніцтвам баскака Шчалкана, які прыбыў на Русь у 1326 г., свавольствы манголаў прывялі да паўстання ў Цвяры ў 1327 г.

**Ямская служба** (“гоньба”) – гістарычная пачтовая служба, якая займалася ў асноўным перавозкай казённай карэспандэнцыі, была ўведзена на Русі ў часы мангола-татарскага панавання.

**Ярлык** – грамата мангольскіх ханаў, якая давала права на княскае ўладанне.

## ТЭСТЫ

1. Да адмоўных наступстваў раздробленасці рускіх зямель адносяцца:
   а) складанне новых культурных цэнтраў;
   б) развіццё новых гандлёвых шляхоў;
   в) развіццё гарадоў;
   г) паслабленне абароназдольнасці.

2. Хто з пералічаных князёў не ўдзельнічаў у бітве на Калцы?
   а) Данііл Раманавіч (князь уладзіміра-валынскі);
   б) Мсціслаў Мсціславіч Удалой (князь галіцкі);
   в) Юрый Усеваладавіч (князь уладзімірскі);
   г) Мсціслаў Раманавіч Кіеўскі.

3. Найвышэйшай службовай асобай у Ноўгарадзе быў:
   а) епіскап;
   б) тысяцкі;
   в) князь;
   г) пасаднік.

4. Сярод пералічаных князёў галіцка-валынскім князем з’яўляўся:
   а) Усевалад Вялікае Гняздо;
   б) Раман Мсціславіч;
   в) Андрэй Багалюбскі;
   г) Усевалад Мсціславіч.

5. “Указать путь” – для наўгародцаў гэта азначала:
   а) выяваць;
   б) дазволіць князю перадаць княжанне па спадчыне;
   в) запрасіць князя;
   г) выгнаць князя.

6. Першае летапіснае ўпамінанне аб Маскве адносіцца да кіравання:
   а) Юрыя Даўгарукага;
   б) Андрэя Багалюбскага;
   в) Уладзіміра Манамаха;
   г) Усевалада Вялікае Гняздо.

7. Еўпацій Калаўрат – гэта:
   а) мангольскі военачальнік;
   б) маскоўскі ваявода;

в) уладзімірскі ваявода;
г) разанскі баярын.

8. Які з дадзеных гарадоў не быў узяты манголамі падчас Батыевага нашэсця?
а) Каломна;
б) Ноўгарад;
в) Уладзімір;
г) Разань.

9. Падчас мангольскага нашэсця ўладзіміра-суздальскім князем быў:
а) Юрый Усеваладавіч;
б) Усевалад Вялікае Гняздо;
в) Аляксандр Неўскі;
г) Яраслаў Усеваладавіч.

10. Якое княства першым падверглася нападу манголаў?
а) Уладзіміра-Суздальскае;
б) Смаленскае;
в) Наўгародская зямля;
г) Разанскае.

11. Першая летапісная згадка пра Маскву адносіцца да:
а) 1174 г.;
б) 1127 г.;
в) 1147 г.;
г) 1114 г.

12. Бітва на Калцы адбылася ў:
а) 1223 г.;
б) 1237 г.;
в) 1169 г.;
г) 1380 г.

13. Што з пералічанага не адносіцца да бітвы на Калцы:
а) сапернікамі рускага войска былі манголы;
б) полаўцы былі саюзнікамі рускіх князёў;
в) не ўсе рускія князі пагадзіліся ўдзельнічаць у бітве;
г) бітва завяршылася перамогай рускага войска.

14. Што з пералічанага не з’яўляецца прычынай паразы Русі ад манголаў?
    а) выкарыстанне манголамі ваеннага вопыту заваяваных краін;
    б) недахоп адвагі ў рускіх воінаў;
    в) добрая падрыхтаванасць мангольскай арміі;
    г) палітычная раздробленасць Русі.

15. Кулікоўская бітва адбылася ў:
    а) 1240 г.;
    б) 1068 г.;
    в) 1327 г.;
    г) 1380 г.

16. Мамай:
    а) заснавальнік Мангольскай імперыі;
    б) заснавальнік Залатой Арды;
    в) выйграў бітву на Калцы;
    г) прайграў Кулікоўскую бітву.

17. У 1327 г. у Цвяры адбылося паўстанне супраць:
    а) Маскоўскага княства;
    б) Вялікага княства Літоўскага;
    в) Цвярскога князя;
    г) Свавольства баскакаў.

18. Хатнія халопы свецкіх феадалаў у XII–XIII стст., найбольш запрыгоненае сялянскае насельніцтва ў XIV–XV стст.:
    а) сіраты;
    б) радовічы;
    в) палоўнікі;
    г) чэлядзь.

19. Асноўнае сельскае насельніцтва ў XIV–XV стст., якое спрадвеку жыло на зямлі феадала і выконвала на яго карысць павіннасці:
    а) старажыльцы;
    б) закупы;
    в) чэлядзь;
    г) агнішчане.

20. Катэгорыя залежнага насельніцтва ў XIV–XV стст., якое за пазыку срэбрам выплачвала працэнты грашыма ці адпрацоўкай павіннасцей:
    а) сярэбранікі;
    б) чашнікі;

в) чыншавікі;
г) капейшчыкі.

21. Тарханная грамата – гэта:
а) дакумент аб вызваленні ад княскіх павіннасцей і наданні імунітэту;
б) дакумент на права правозу тавараў;
в) падатак, які збіраўся на карысць хана;
г) дакумент аб вызваленні сялян.

22. Татарскі военачальнік – хрысціянін, кіраўнік аб’яднанага ардынска-маскоўскага войска для падаўлення Цвярскога паўстання 1327 г.:
а) Наён;
б) Тахтамыш;
в) Федарчук;
г) Цімур.

23. Дзяржава, краіна, удзел ці вобласць імперыі Чынгісхана:
а) улус;
б) уезд;
в) ваяводства;
г) тумен.

24. Кіраўнік народнага апалчэння з Ноўгарадзе:
а) агнішчанін;
б) тысяцкі;
в) вірнік;
г) пасаднік.

25. Военачальнік мангола-татараў, пад камандаваннем якога знаходзілася 10 тысяч воінаў.
а) цемнік;
б) беклярбек;
в) сатрап;
г) баскак.

26. Мангольскі атрад, які прыбыў на Русь у 1326 г., яго свавольствы прывялі да паўстання ў Цвяры ў 1327 г.:
а) Шчалканава рацъ;
б) Федарчукова рацъ;
в) Няўруева рацъ;
г) Мамаева рацъ.

27. Гістарычная паштовая служба на Русі, якая займалася ў асноўным перавозкай казённай карэспандэнцыі, уведзена ў часы мангола-татарскага панавання:
   а) шчалканава рацъ;
   б) ямская служба;
   в) палявая пошта;
   г) тэлеграф.

28. Звод законаў, у 1206 г. выдадзены Чынгісханам на ўсемангольскім курултаі, пастаянна пацвярджаўся яго пераемнікамі:
   а) хурал;
   б) ярлык;
   в) яса;
   г) баскак.

29. Грамата мангольскіх ханаў, якая давала права на княскае ўладанне:
   а) ярлык;
   б) яса;
   в) басма;
   г) ямская служба.

30. Пачаткам перыяду раздробленасці і феадальных войнаў лічыцца:
   а) 1054 г.;
   б) 1093 г.;
   в) 1113 г.;
   г) 1132 г.

31. Пачатак эпохі незалежнасці Ноўгарада лічыцца з:
   а) 1136 г.;
   б) 1216 г.;
   в) 1240 г.;
   г) 1242 г.

32. Раман Мсціславіч аб’яднаў Валынь і Галіцыю пад сваёй уладай у:
   а) 1199 г.;
   б) 1237 г.;
   в) 1240 г.;
   г) 1378 г.

33. У 1153–1187 гг. у Галічы княжыў:
   а) Яраслаў Асмамысл;
   б) Юрый Даўгарукі;

в) Андрэй Багалюбскі;
г) Мсціслаў Раманавіч.

34. Княжанне Андрэя Багалюбскага ва Уладзіміры адносіцца да:
а) 1125–1132 гг.;
б) 1132–1157 гг.;
в) 1157–1174 гг.;
г) 1176–1212 гг.

35. Князь, які ў 1169 г. захапіў “на шчыт” і разрабаваў Кіеў, перанёс найвышэйшую княскую ўладу з Кіева ва Уладзімір:
а) Уладзімір Манамах;
б) Андрэй Багалюбскі;
в) Усевалад Вялікае Гняздо;
г) Аляксандр Неўскі.

36. Горад, уратаваны ў 1170 г. з дапамогай цудадзейнай іконы Святой Багародзіцы ад аблогі аб’яднаных рускіх войскаў:
а) Ноўгарад;
б) Пскоў;
в) Масква;
г) Полацк.

37. Забойства баярамі Андрэя Багалюбскага ў яго палацы ў Багалюбаве адбылося ў:
а) 1174 г.;
б) 1199 г.;
в) 1223 г.;
г) 1238 г.

38. Вялікім князем уладзіміра-суздальскім у 1176–1212 гг. быў:
а) Усевалад Вялікае Гняздо;
б) Андрэй Багалюбскі;
в) Юрыў Усеваладавіч;
г) Іван Каліта.

39. “Слова пра паход Ігараў” апавядае пра:
а) барацьбу з печанегамі ў 915 г.;
б) паход на драўлян у 945 г.;
в) паход на полаўцаў у 1185 г.;
г) бітву на Чудскім возеры ў 1242 г.

40. Ліпіцкая бітва 1216 г. паміж арміяй Яраслава і Юрыя Усеваладавічаў і войскам Мсціслава Удалога і Канстанціна Усеваладавіча скончылася:
а) паразай Яраслава і Юрыя;
б) паразай Мсціслава і Канстанціна;
в) заключэннем перамір'я;
г) братаннем і ваенным саюзам.

41. Пасля смерці ў 1219 г. Канстанціна Усеваладавіча князем уладзіміра-суздальскім стаў:
а) Юрый Усеваладавіч;
б) Яраслаў Усеваладавіч;
в) Аляксандр Яраславіч;
г) Яраслаў Яраславіч.

42. Смаленская гандлёвая праўда 1229 г. – гэта дамова Полацка, Віцебска і Смаленска аб свабодным гандлі па Заходняй Дзвіне з:
а) Рыгай і Гоцкім берагам;
б) Польшчай;
в) Лівонскім ордэнам;
г) Тэўтонскім ордэнам.

43. Лівонскі ордэн зліўся з Тэўтонскім ордэнам у:
а) 1201 г.;
б) 1223 г.;
в) 1237 г.;
г) 1242 г.

44. Нашэсце мангола-татараў на Паўночна-Усходнюю Русь пачалося ў:
а) 1223 г.;
б) 1237 г.;
в) 1257 г.;
г) 1380 г.

45. Вялікі князь Юрый Усеваладавіч быў забіты мангола-татарамі:
а) 1223 г. – бітва на Калцы;
б) 1238 г. – бітва на рацэ Сіць;
в) 1240 г. – Неўская бітва;
г) 1378 г. – бітва на Вожы.

46. Неўская бітва адбылася ў:
а) 1240 г.;
б) 1242 г.;

в) 1263 г.;
г) 1301 г.

47. У 1240 г. мангола-татары захапілі і разбурылі:
а) Кіеў;
б) Маскву;
в) Разань;
г) Ноўгарад.

48. “Лядовае пабоішча” – гэта:
а) бітва на р. Сіць у 1238 г.;
б) бітва Аляксандра Яраславіча са шведамі на Няве ў 1240 г.;
в) бітва Аляксандра Неўскага з крыжакамі на Чудскім возеры ў 1242 г.;
г) бітва на Вожы ў 1378 г.

49. У 1250–1252 гг. Аляксандр Неўскі змагаўся за велікакняскі стол:
а) з бацькам Яраслававам Усеваладавічам;
б) з братам Андрэем Яраславічам;
в) з сынам Андрэем;
г) з сынам Дзмітрыем.

50. Велікакняскі ўладзіміра-суздальскі стол Аляксандр Неўскі займаў у:
а) 1238–1263 гг.;
б) 1252–1263 гг.;
в) 1257–1259 гг.;
г) 1276–1294 гг.

51. Князь Маскоўскі ў 1303–1325 гг.:
а) Аляксандр Неўскі;
б) Данііл Аляксандравіч;
в) Юрый Данілавіч;
г) Іван Каліта.

52. Вялікі князь уладзіміра-суздальскі ў 1304–1318 гг.:
а) Міхаіл Яраславіч Цвярскі;
б) Іван Каліта;
в) Іван Красны;
г) Дзмітрый Грозныя Вочы.

53. Кіеўская мітраполія была перанесена ва Уладзімір мітрапалітам Максімам у:

а) 1299 г.;
б) 1303 г.;
в) 1327 г.;
г) 1341 г.

54. Укажыце непатрэбнае:
У выніку паходу Дзмітрыя Данскога 1375 г. супраць Цвяры:

а) Міхаіл Цвярскі прасіў міру;
б) Цвер адмовілася ад прэтэнзій на вялікае княжанне;
в) Дзмітрый стаў князем Маскоўскім;
г) Цвер прызнала старшынство Масквы.

55. Ці правільныя наступныя меркаванні?
А. Раздробленасць старажытнарускай дзяржавы азначала знікненне ўсіх палітычных і культурных сувязяў паміж рускімі землямі.
Б. Руская царква ў перыяд раздробленасці распалася на незалежныя епархіі.

1) абодва меркаванні няслушныя;
2) правільныя абодва меркаванні;
3) дакладна толькі А;
4) дакладна толькі Б.

56. Ці правільныя наступныя меркаванні?
А. Усевалад Вялікае Гняздо быў сынам Андрэя Багалюбскага.
Б. Усевалад Вялікае Гняздо атрымаў сваю мянушку за тое, што ён захапіў і далучыў да свайго княства шмат новых зямель.

1) дакладна толькі А;
2) абодва меркаванні няслушныя;
3) дакладна толькі Б;
4) правільныя абодва меркаванні.

57. Суаднясіце паняцці і азначэнні:

| | |
|---|---|
| А. Яса | 1) звод мангольскіх законаў |
| Б. Тамга | 2) ахоўная грамата ад хана |
| В. Пайцза | 3) усемангольскі сход знаці |
| Г. Курултай | 4) дакумент з ханскай пячаткай |

58. Суаднясіце гістарычныя паняцці:

| | |
|---|---|
| А. Барацьба за ўладу паміж сынамі Аляксандра Неўскага | 1) “Федарчукова рацьˮ |
| | 2) “Мамаева рацьˮ |
| Б. Паўстанне ў Цвяры | 3) ˮДзюдзенева рацьˮ |
| В. Падаўленне паўстання ў Цвяры | 4) ˮШчалканава рацьˮ |
| Г. Кулікоўская бітва | |

59. Суаднясіце гістарычныя паняцці з дзеячамі:

| | |
|---|---|
| А. Бярценеўская бітва 1318 г. | 1) Мітрапаліт Пётр |
| Б. Перанос мітрапаліцкай рэзідэнцыі ў Маскву ў 1326 г. | 2) Сімяон Горды |
| | 3) Бегіч |
| В. Чума ў Маскве ў 1353 г. | 4) Міхаіл Цвярскі |
| Г. Бітва на Вожы ў 1378 г. | |

60. Суаднясіце бацькоў і сыноў:

| | |
|---|---|
| А. Аляксандр Неўскі | 1) Дзмітрый Данскі |
| Б. Юрый Данілавіч | 2) Іван Каліта |
| В. Міхаіл Цвярскі | 3) Даніїл Маскоўскі |
| Г. Іван Красны | 4) Дзмітрый Грозныя Вочы |